**Зьміцер Вішнёў**

# Трап для суськіка,

альбо

Нэкрафілічнае дасьледаваньне аднаго віду грызуноў

*Раман без парахода і самалёта*

Λ

Менск

2002

ДРУГІ ФРОНТ МАСТАЦТВАЎ

СЭРЫЯ SCHMERZWERK

*Куратар Ільля Сін*
*Выдавец Ігар Логвінаў*

.

Вішнёў З.
Трап для сусьліка, альбо нэкрафілічнае дасьледаваньне аднаго віду грызуноў. Мн: Логвінаў, 2002. 152 с.

ISBN 985-6701-01-5.
УДК 882.6-31 ББК 84 (4 Беи)6

© ЗЬМІЦЕР ВІШНЁЎ, 2002
©Выдавец Логвінаў І. П., 2002

## ЛЕСЬВІЦА Ў НІКУДЫ

Параход адплыў, самалёт паляцеў, а трап застаўся. Прыступкі яго сумуюць па падэшвах і галетах. Аднак трап, які пабудаваў Вішнёў, не пустуе. Ен населены сябрамі аўтара і... суськікамі — маленькімі лядашчымі зьвяркамі. Зьвяркі мітусяцца і агрызаюцца, точаць, точаць свае зубкі аб нашыя вочы і думкі.

Так, яшчэ трэба паведаміць, што трап скалочаны з аўтарскіх асацыяцыяў, зьвязаных зь яго біяграфіяй.

Вішнёў — майстра лоўлі асацыяцыяў. Ен узабраўся вярхом на асу і, як ас, лётаючы па сваім расфарбаваным пакоі, сачком палюе на асацыяцыі, пасьля кладзе іх згодна бляску, колеру і нават паху на свой працоўны стол. Затым доўга смажыць іх на паперы і вылівае ў выглядзе прыступак да свайго трапа.

Трап, троп, топ, топ. Ідзеш па ім. Невядома, уздымаешся ці апускаешся альбо, можа, закручваешся, як стужка Мёбіюса. Але гэта няважна. Увогуле, ня трэба сачыць, куды ідзе сюжэтная лінія, — яе і няма, кожную прыступку можна чытаць асобна ці пераскочыць, як на сапраўднай лесьвіцы.

Зьнешне раман Вішнёва нагадвае аўтапісьмо сюррэалісгаў — хутка-хутка пісаць-занатоўваць тое, што ў дадзены імклівы момант прамільгнула ў галаве. Аднак для свайго рамана Вішнёў старанна фільтраваў гэтыя "мільгаценьні", прымушаў сваю "пісьмастваральнасьць" рэагаваць толькі на дуплетныя ўзаемадачыненьні: "Я (індывід Вішнёў) і Хтосьці". Пад гэтым Хтосьці можа.хавацца ці сябра (як пададзены адкрыта па прозвішчы, так і пад асацыятыўным псэўданімам), ці суськік (той, хто ў гэтага аўтарскага "Я" калісьці выклікаў адмоўныя пачуцьці).

Падступаючы да "Трапа для суськікаў", важна прынянь для сябе адзін з постмадэрнісцкіх прынцыпаў, што важна не ўспрыманьне сэнсавай глыбіні словаў, а сам працэс чытаньня.

Адчуйце радасьць ад гульні вобразаў і эмоцыяў, а калі гэтага ня ўдасца, то можна сказаць, што адмоўны вынік таксама вынік.

І яшчэ. Раман Вішнёва — гэта своеасаблівы плямісты адбітак гісторыі, а, менавіта, той яе частісі, дзе фігуруе літаратурная багема Беларусі канца другога. тысячагодзьдзя.

*Серж МІНСКЕВІЧ*

# ТРАП ДЛЯ СУСЬЛІКА,

АЛЬБО

НЭКРАФІЛІЧНАЕ ДАСЬЛЕДАВАНЬНЕ АДНАГО ВІДУ ГРЫЗУНОЎ

## СЭЗОН АДСТРЭЛУ

Хістаючыся ў цягніку мэтрапалітэну, я зразумеў, што пачаўся сэзон адстрэлу сусьлікаў. Да гэтае думкі я ішоў паступова. Так, я штодня замест тралейбуса дабіраюся да мэтро пехатой — гэта недзе два прыпынкі — да Інстытуту культуры. Іду ўздоўж шапікаў, дрэваў і перасякаю мост.

У бытавой недагледжанасьці Менску мноства плюсаў. Так, асобныя кавалкі гораду можна выстаўляць у галерэях накшталт гатовых мастацкіх аб'ектаў. Ад нястачы грошай мы шмат у чым выйграем у заходніх гарадоў, што ганарацца сваім полыскам. Бо штучнасьць сярод нашых архітэктурных краявідаў часта адсутнічае. На ясаль, гэта. разумеюці) нямногія. І таму, магчыма, з паляпшэньнем эканамічнай сытуацыі ў краіне мы згубім старажытны пыл. Гэта — як расколіны абразоў, безь якіх можа зьнікнуць повязь часоў. Паўсюль — гадзіньнікі без вусоў.

Мост, які падыходзіць да станцыі мэтро "інсты тут культуры", мне нагадвае мыліцы майго дзеда. Іржа, здаецца, праела яго зьсярэдзіны, хаця рамантуюць яго амаль штогод. Ідучы па мосьце й адчуваючы ботамі асфальт ды мэталёвыя люкі, я часта думаю, што адбудзецца, калі адсюль мяне скінуць уніз? Да прыкладу, той дзядзька з выліцамі баксёра, што ідзе насустрач. Або я скіну гэтага самага дзядзьку. Ці будзе крык? А можа, вецер і цягнікі, што грукочуць унізе, проста расьціснуць цела сваімі масьлістымі рукамі. І па чорных рэйках смалой ґіабяжыць кроў? Ня ведаю. Але адно стопрацэнтова — карціна Эдварда Мунка "Крык" упісваецца ў гэты краявід цудоўна. Вось яна, патаемная галерэя!

Часам мне самому хочацца скочыць уніз у адзін з груза вы Х вагонаў, што ня маюць даху. Каб грукнуцца туды — на падлогу — і адчуць пах вугалю або жвіру. Праўда, у гэтым выпадку самае галоўнае — не зачапіцца за драты, якіх над мостам багата. Бо тады павісну, як Ісус. А гэтага мне надта ня хочацца.

Я жыву на Брылеўскай, а дасягнуўшы мосту, што ўтыркаецца сваімі зубамі ў мэтро, я трапляю на Маскоўскую. Краявіды з мосту нагадваюць 20-я гады. Чорныя коміны рэжуць неба на роўныя ванілінавыя сыркі. Тут жа на пляцформах людзі чакаюць электрычак і трымаюць у руках торбы-боханы. Нейкая дзяўчына пазірае на мяне ў пэрыскоп сваіх акуляраў. Узьнікае жаданьне ўзяць анучу і працерці шкло гэтага відарысу. І тады ён загучыць наноў або зьнікне цалкам — так выкладчык прыбірае з дошкі свае папярэднія словы. Мае боты з чорных тут робяцца шэрымі ці чорнымі ў плямках.

Калі я ляжу ў балеі сярод трубных канатаў і пазіраю на адзінокую лямпачку, я прыгадваю мора. Салёныя цёплыя хвалі кладуцца на мой лоб далонямі маці. Я сьмяюся ды падстаўляю нагу пад струменьчык вады з крана. Каменьчыкі адпаліраваныя да сонечных зайчыкаў. Я прыгадваю маеты — яны падобныя да маіх валасатых ног, якія я выцягваю з вады і стаўлю на паверхню балеі палямі. Мост каля Інстытуту культуры падобны на маю чытуновую балею — гэткі ж масіўны. Ня ведаю чаму, але я ўяўляю, як пад гэтым мостам праходзяць не цягнікі, а ледаколы. Сінімі шнарамі яны перасякаюць рэйкі й зьнікаюць сярод гарадзкіх крыгаў. А я стаю й махаю рукой! Каб вы здохлі, марскія дэбілы!

## СШЫТАК ПРА ЗУБНЫ КАМЕНЬ І СОННУЮ АРТЭРЫЮ

Партфель зьнік нечакана. Ноччу. Тады мае вочы нагадвалі лёд. Я быў занадта абдзяўбаны. З вушэй і наздрынаў ішоў дым. Я перапаўзаў ад святлафора да святлафора і немым голасам абвяшчаў прыпынкі: "Пры-пы-нак Кккколаса! Наступны прыпынак сасновы-ы-ы-ы-ы-ы-ы!.." Так-так. Тады мае паведамленьні прымалі толькі лямпачкі ліхтарыкаў і фары аўтамабіляў. Нехта спрабаваў да мяне дазваніцца праз тэлефон мабільны. Але на. той момант у маіх зубах быў кабель. На падыходзе да карабельнай гавані на мяне звалілася дрэва. Мае бровы ператварыліся ў плаўнікі рыбы. Тады й зьнік партфель з раманам пра Францыю. Хтосьці біў мяне па галаве. рацыяй. І я крычаў!.. крычаў!.. пра беларускую нацыю!..

## ПРЫСТУПКА ПРА ФАШЫЗМ І КАЙФ МАРЫХУАНЫ У НЕЧЫМ ГЭТА ПОЎНАЕ ЛАЙНО АЛЕ ТЫМ НЯ МЕНШ Я ЗАДАВОЛЕНЫ

Я заўсёды казаў: на паперы нельга пісаць пляўкамі — можна толькі крывёй, бо яна ачышчае фальшывае мастацтва ад розных вычварэнцаў. Многа ў нас разьвялося пісьменьнікаў. Яны накшталт бутэрбродных займеньнікаў. Я не чытаю ўсялякіх там Сабакаў і Бэгемотаў. Адно — Дубаўца. Бо апошні, прынамсі, нагадвае сваёй творчасьцю віленскае дрэва. Значыць, наш! Вільня – гэта вецер Беларусь Гэта — карані. Гэта — гісторыя. Спадчына... Ша!

Зробім нацыянальную шашу ад Вільні да Менску! Я, наагул, беларускі нацыяналіст. Я за беларускую імпэрыю! Ад мора да мора. Я за нацызм у межах сям'і суськікаў! Ха!

Такім чынам. Абвяшчаю дзеяь сусьветнага вар'яцтва!

Паважаныя грамадзяне! Таксама зьвяртаюся і да мудакоў! Я — Зьмій Віш — заклікаю ўсіх выпіць трошкі квасу і паразмаўляць пра стан душы. Бо безь яго аніякі душ не патрэбны. Атрымаецца суцэльны ананізм. І будзе сумна. І будзе адзінока.

У сучаснае мастацтва я прыйшоў зьнянацку. Недзе пасьля дваццаці гадоў, калі скрозь маё жыцьцё прайшлі караваны самагонкі. Я любіў водныя гонкі. Адбылося гэта ў Менску, на тэрыторыі газэты "Культура". Тады я пазнаёміўся з гэтак званым! менскімі канцэптуалістамі Ільлём Сінам, Юрасём Барысевічам і Сержам Мінсісевічам. Знаёмства скончылася пляшкай. Як зараз памятаю, у нашых келішках было шмат заразы. Шкада, не было на запіўку нарзану, тады мы нарэзаліся б як фазаны.

Канцэптуалістаў у нас хапае. Трэба болей капіталістаў! Бо гэтых замала. Ну, Сіна я яшчэ прымаю як фальклярыста нэкрафіліі, а што датычыцца астатніх... Выбачайце. Гэта проста нейкія філёлягі-лярынголягі. Ні мэнтолу табе, ні кляфэліну. Сумна, сябры. Гэта проста сьмярдзючая рыба! Фу-у-у!

Прыбярыце атручаную рыбу! Я не люблю паху вэнджаных ног! Дайце хутчэй гонг!

## ВАШЫВЫ ШВАЧКАВЫ СШЫТАК
## ПРА ПЛЯГІЯТ СА-ВАДОРА ДАЛІ
## АДНЫМ СЛОВАМ СНІД

Калі мора паглыне маю выспу, я буду жангляраваць вачыма. Я нацягну на парасон сінюю пячонку. Пенкус заплюшчыць дзірывачніцы бачуркамі. На нырках загучаць песьні й камяні. Ха-ха. На нарах ляжыць мая фаршыраваная нага.

Упершыню я даведаўся пра смак жанчыны, калі мне было тры гады. Я глядзеў на яе, як на экзатычнага паўліна. Яе аголеныя ногі мне хацелася пасыпаць нясочкам зь любімай пясочніцы. Сонца пацалункі. Праз палонкі пазіралі жоўтыя валаскі. Я нагадваў вандроўніка Вэласкеса. Я паядаў дзяўчыну, як смачны кекс. Пырскалі сакавітыя разынкі. Дзьве горкі — два маленькія Эльбрусы ¯ я ўзыходжу на іх пры дапамозе альпіністкага набору... усялякія спэцыяльныя малаточкі й зубілы. Мэталёвыя зубы для скалістай народы. Чую, як недзе гучаць гудкі парохода. Вось яно, дзяцінства... Ша! Далі на мыла!!!

Неяк я заявіў, што жанчына — гэта іншаплянэтны аб'ект. Ша! Я памыліўся. Жанчына — гэта пародыя на мужчыну. Хаця зрэдку яна мае сапраўдныя рысы мастацкага твору. Я, безумоўна, не прэтэндую на ролю вешчуна. У нечым я магу й памыляцца. Адно стопрацэнтова —

не дазваляйце жанчыне сядаць на шыю, бо гэта мояса скончыцца матрыярхатам. Ша! Я папярэдзіў. Бо ў мяне шыя адвальваецца.

## МОЙ РОТ БЫЎ ЗАШПІЛЕНЫ ТАМУ СЯРОД КЕКСАЎ НЕ БЫЛО СКУНСАЎ

У свае шаснаццаць гадоў я патрапіў у дзікія беларускія мясьціны. Гарбату тады ня піў бязь ціны. Гэта быў поўны ўлёт. Хаця й знаходзяцца разумнікі, што кажуць, маўляў, Вішнёў прыехаў у Менск з цудоўнага культурнага цэнтру Беларусі. Ы-ы-ы-ыы... С-с-с-с-сс-с!!! Слуцак — поўная глушэча! Мабыць, уся каштоўнасьць гэтага гора-ду складаецца з цукра-рафінаднага заводу ды мясакамбінату. Ну й, безумоўна, каштоўнасьць тым мясьцінам надаюijb мае сябры — паэты й мастакі... Гэткіх там пяць. Але па тамтэйшых вуліцах лётаюць камбайны! Патрапіў я ў тыя дзіўныя мясьціны дзякуючы свайму бацьку. Дзякуй табе, музэйны экспанат! Мой дарагі экс-прэзыдэнт.

Але пагаворым пра жанчын. Бо гэта запечаная мара. Гэта прызнаньне, запханае ў бутэлысу, якую кінулі ў акіян. Буду зноў жаваць курыныя яйкі! Ха-ха. Смак жанчыны ў правінцыі бывае розны. Вось ён і забіваў сякерай мае сацыялістычныя мары. А між іншым, я вельмі ганаруся сваёй першай публікацыяй. Пад назвай "Пра камсамольскія справы" яна была зьмешчаная ў раённай газэце "Шлях Ільліча". Ша! Забіў бы гэтага мудака ўласнымі рукамі! Гэтую сволач і зьмяю! Але людзей чапаць ня буду! Нельга! Праўда, жанчыны любяць жывёлінак! Яны іх трымаюць у напысьніках і мыюць дарагім сьмярдзючым шампунем. Ха-ха.

Ну, проста немагчыма. Хачу распавесьці пра жанчыну, а сьпяваю пра экзотыку. Пра муміфіцыйную готыку. Мы ведалі. Ведалі Ягоную зьедлівасьць літаратара! Не сваёй крывёй хацеў пісаць!

Гэта ж суцэльны плягіят!

Не, не хачу ўзгадваць правінцыю! Хіба што некаторых сябрукоў узгадаю! Ша! Зь некаторымі зь іх труцілі мастацтва. Рэзаліся ў нейкія правінцыйныя шашкі! Гэта проста анашыстая кашка! Вось, як я пакутаваў тады.

**ШЫЯ ЎЗОРУ 1812 ГОДУ**
**ПОЎНЫ ЎЛЁТ**
**ЧМУТЛО**
**Я БЯРУ ШАБЛЮ І АДСЯКАЮ ДАЛОНЬ ЗДРАДНІКА**
**ХРАК!**

Мой гарбатнік сьвідраваў сваім рыльцам пра стору сусьветнай кухні. Праз рот выплывадi паэтычныя акунёвыя карціны. Я прыгадваў псэўдабумбамлітаўскі пэрыяд. Бамбукавыя бажкі віселі на маёй шыі. Ха-ха. Тады час ад часу мяне натхня ла Шахеразада. У 1996 годзе я штоноч сыііў экстраардынарныя рэчы. Я тады вылічваў каардынаты сваёй музы. Балелі хворыя зубы. Па небастыку качаліся бэзавыя парасоны.

У дзьве гадзіны ночы мне выбівагй дзьверы. Крычалі. Пагражалі. Потым падпалілі кватэру. Суседзі не рэагавалі. Напэўна, таксама спалохаліся. Я нават уявіў, як яны ператварыліся ў суслікаў. Гэтыя зьяркі перакуліліся на вушкі. Але ворагі сышлі.

Я сасьніў выступ бум-бам-літу. Крыкі вершаў у вялікай залі з трыма сцэнамі. Шыхты рознабаковых фатэляў. Чалавек шэсьцьдзесят слухачоў. Жук пацiху найграваe на фартэпіяна. Я падыходжу да яго. Ён шэпча: "Як называецца сёньняшняя імпрэза?".

**ПСЭЎДАЛІТАРАТУРНЫЯ ГРУПОЎКІ!**
**У МАІХ РУКАХ АФРЫКАНІСТА РУПАР!**

(Аднойчы, калі ў мяне быў цудоўны настрой і калі мне хацелася забіць сябра-павука, я зазірнуў у сваю вялікую драўляную шафу. Там на дне ляжаў мой паскудны дзёньнік. Адтуль я й узяў асобныя кавалкі тэксту дзеля гэтага аповеду. Атрымлівалася шызафрэнічна, але праўдападобна. Прынамсі, у вішнёўскім стылі. Асабліва мне падабалася перапрацоўваць нататкі са снамі. Бо ў іх разгортвалася ўся мая сутнасьць злодзея. Ша!)

*7 сакавіка 1996 году*

Сасьніў выступ бум-бам-літу. Псэўдалітаратары маршыруюць у чырвонаармейскіх шынялях зь пікамі. Чалавек дваццаць. Бумбамлітаўцы сьпяваюць хорам і гуляюцца ў нейкую дзіцячасьць — выпіхваюць адзін аднаго са сцэны. Гледачы крычаць, што разьбітыя толькі два яйкі — засталося яшчэ некалькі. Я стаю на стале ў цэнтры залі, махаю рукамі й крычу: "Хайль Гітлер!". Ус.е палохаюцца і разьбягаюцца прусакамі. Толькі Юрась Барысевіч ператвараецца ў

чарадзея. Ён — у масцы суськіка і чорным плашчы. Сябра нешта дзіка. мармыча, і зь ягоных рук вылятаюць маленькія цмокі.

**КАМАТОЗНЫ ПАЛЁТ**
**ПОДЫХ ТАМАТНАГА СОКУ**
**У ГАЛАВЕ СЬМЯРДЗЮЧЫ СОУС**

фырррррррр!!!
хррррррр!!!
цмокі лётаюць
крыльцамі ляпаюць
серабрысты суськік ад іх хаваецца
у халве качаецца
цмокі перамешваюцца з макам
камуністычнага наркотыку поўны КАМАЗ
на маіх далонях аркестр грае пахавальны марш
на галаве расьце шызафрэніі замак
трымайся таварыш —
прыйдзе зь сякерай белы казак!

* * *

У снах выплываюуь вонкі розныя страхі, радасьці, жаданьні й перасьцярога. Дзякуючы гэтаму наш мозг ня толькі нрацуе дваццаць чатыры гадзіны ў суткі, але й адпачывае. Я прадчуваю нараджэньне свайго соньніка! Там будуць парады барацьбы з суськікамі. Настольная кніга для патрыётаў!

**ХАЧУ БЫЦЬ САМУРАЕМ!**
*8 сакавіка 1996 году*

Павіншаваў знаёмую японку з днём нараджэньня. Падарыў гумовага бэгемота, букет крывавых ружаў і вялізную бутлю лаку для валасоў. Набор афрыканісткі.

Доўга сядзелі ў спальні й балбаталі пра ўсялякую цікавую лухту. Я нюхаў тухлую рыбу. Утыркаў у падлогу сахор. Слухаў праваслаўны дзіцячы хор. Я чамусьці зрэдчас рохкаў. Японка пркала мяне "Хіноэ-Ума". Ша! Я зьнішчу гэтую анамальную зьяву! Я не маню! Але злавіў сябе на думцы, што пачынаю ненавідзець Японію й прылеглыя да яе выспы. З этыкетак гарэлкі на мяне пазіраюць японскія пысы.

"Хіноэ-Ума" — гэта тысячагадовая магія. І гэтую зьяву можна круціць у самых розных кірунках. Як шашлык.

Я люблю экзотыку. Бо ў ёй заўсёды можна адшукаць нешта містычнае. Не — безумоўна, бываюць пэўныя выключэньні... Але яны хутчэй хаваюцца ўнутры нас.. Менавіта ад канкрэтнай асобы залежыць вынаходка патаемнага. Пазбаўленыя фантазіі, філязофіі, слыху... ня здатныя на гераізм першапраходцы! Дык што такое экзотыка? Бо некаторыя трапляюць на містыку і ў будзённасьці.

**СЭАНСЫ АЗДАРАЎЛЕНЬНЯ**
**АЛЬБО АХМАТАЎКІ ЯК ЗБРОЯ СУПРАЦЬ ВОРАГАЎ!**
*9 сакавіка 1996 году*

Заходзіў у госьці да асобы, якую можна вызначыць адным словам Гумілёва — ахматаўка. Падарыў ёй гумовага кракадзіла, гвазьдзік і чырвоны сьцяжок. Мяне сустрэлі, як ката Леапольда.. Спачатку— гарэлка, "селядзец у футры", запечамы хлеб з сырам і часнаком, яечня, кава з чакалядай, а потым — мяне называюць сукай і укусам паэта. Я заслаў яе ў Сібір этапам! Яна не жанчына — паэтычная малпа! Не — лепш пайду да японкі ды яе "Хіноэ-Ума"! Няхай здохнуць нашыя ворагі! Ня згодныя? Тады няхай нашыя ворагі ператворацца ў суслікаў! Ша! А ворагі-суслікі? Няхай бяруць сэансы аздараўленьня ў ахматавак!!!

**ДЗЁНЬНІКАВАЯ НУДОТА**
**ЮШКА ДЛЯ ПАРАНЕНЫХ У ГАЛАВУ**
**БЕРАЖЫЦЕ МАЗГІ ГЭТА ШЧАСЬЦЕ ДУМАЦЬ**
*15 сакавіка 1996 году*

Ха-ха. Сёньня я прыгадваю Баранавічы. Бо грыз там абаранкі. Там у адной заводзкай бібліятэцы я чытаў пралетарскага паэта Маякоўскага. Калі я чытаў вершы рускага футурыста, на галаву мне падалі мушкі. Я лаяўся і забіваў насякомых вялікім пальцам правай рукі. Ы-ы-ы-у-у-у-у-у. Бібліятэкарка была радая выпадковаму наведніку, і таму пасьля вершаў пачала чытаць мне казкі пра белага бычка, але я не паддаўся... Не паддаўся на. гэтыя правакацыі!

**РЫХТУЙЦЕ КАТАФАЛКІ!!!**
*15 ліпеня 1996 году*

Памятаю, прынёс матэрыял у часопіс "Крыніца." — "Недасяжныя мэты бум-бам-літу". Я падпальваў тады кноты на бомбах. Ды будучы кат маёй кнігі прыпёрся зь дзьвюма пляшкамі піва "Мінскі бровар". На

сталe разгарнулася мапа зь піўнымі бровамі. Калі Акудовіч прапанаваў нас пазнаёміць, спадар суськ адмовіўся: "Мы ўжо знаёмыя". Гэтаму я не зьдзівіўся. Бо прадчуваў гэты суськ мае прышэсьце ў анталягічную прастору беларускай літаратуры! Потым спадар суськ патэлефанаваў нейкай Вользе, павіншаваў з народзінамі і паведаміў ёй пра падрыхтаваны падарунак. Пасьля чаго ён перадаў слухаўку "падарунку"... Валянціну Акудовічу. Той спалохаўся й перадаў слухаўку мне. Гэтак і ў літаратуры — адбываецца паступовая зьмена пакаленьняў! Чуеце, саўдэпаўцы?! Рыхтуйце катафалкі! Я прыйшоў!!!

## СШЫТАК, У ЯКІМ Я ЗАБІВАЎ СВАЕ МАРЫ ФІНКАЙ!!!

Зь Юккам Малліненам мяне пазнаёміў Андрэй Бітаў. Фін шпацыраваў па Менску ў цюбецейцы й вялізным бітнічным швэдры. Мух мы забівалі разам. Таму хутка пасябравалі.

Потым мы наведалі кватэру аднаго кунака і расьпілі зь Юккам некалькі пляшак беларускай гарэлкі й пляшку каньяку "Арарат". Вух! Эх. Дзе мае юнацкія вухі ?

## ПРЫСТУПКА, ПОЎНАЯ БЛЁКАТУ

Памятаю, як да мяне падышла супрацоўніца рэстарацыі гатэлю "Менск" і запрасіла на абед разам з расейскімі пісьменьнікамі. Я сядзеў за адным столікам зь Яўгенам Паповым, Бэлай Ахмадулінай ды яе кавалерам. Добра мы тады скідалі мэталёвыя накрыўкі са штольні горла!.. Мы выпівалі бурбулістае золата і жавалі серабрыстых лётасаў. На маіх пальцах сьвяцілася лусіса. Рыбныя кляксы! Менавіта тады мяне пачалі шанаваць як беларускага генія! Мае творы былі белым хлебам!

(У гэтым месцы я нацягнуў на сябе вялікі паласаты швэдар. Бо мне зрабілася надта халодна. Захацелася пазбавіцца ўласных думак. Хацелася выйсьці ў поле ды накрасьці мазгоў у сустрэчных пустэльнікаў. Але я сябе стрымліваў. Я глядзеў тупымі вачыма ў тэлевізар і, як скульптар, працаваў над глінай. Яна выкідвала фокусы, і таму час ад часу ў мяне зьяўляліся нечаканыя госьці — каты, сабакі, насарогі, кракадзілы, суські, куі")ыцы. Усе яны моўчкі сядалі побач і разам са мной глядзелі тэлевізію. На экране паказвалі футбол.)

**НЕ ПРЫСТУПКА - ПАРТРЭТ СЯБРА КЛІНАВА**
**НЯ ПІ - МАСТАКОМ БУДЗЕ-ТАФА**

У 1997 годзе я сьвяткаваў наваселье. Да мяне прыехалі мастакі, паэты, філёзафы... і суслікі. Я напазычаў у суседзяў мэблі, і таму мая аднапакаёўка выглядала адной вялікай барыкадай. Суслікаў і людзей прыйшло шмат. Праўда, менш, чым чакалася. Бо па дарозе многія патрапілі ў пасткі — тэракты праводзіў таварыш Сін. З гэтае прычыны гарэлкі аказалася замнога, і ўсе перапіліся. Шпалеры размалёўваліся з натхненьнем. Завіхаліся й ма.стакі, і ўсе астатнія — Іваноў, Рымашэўскі, Клінаў, Барысевіч, Туровіч, Сін, Акудовіч, Мінскевіч і многія іншыя. Але галоўнае, што тут былі жонкі і... суслікі. Ха-ха.

Смачнае спагеты прыгатаваў Сін. Нарэзаныя вершы палівалі алеем і смажылі. Патэльня дымілася месяцам у хмарах. Таму я й прапаноўваў кінуць на патэльню сам агонь. Ха-ха. Не далі. Супакойвалі. Потым мы — я й Сін — дэклямавалі вершы. Не абышлося без эксцэсаў. Бо падчас гэтых імправізаваных чытаньняў мы пачалі выбіваць з-пад прысутных зэдлікі. Жонка мастака звалілася. Выбачай, сябра. Выбачай, Дзяўчо. Дзякуй Богу, усе засталіся жывыя. Ша!

А потым Клінаў запоўз у насьценную шафу. Вось адтуль звалілася ідэя пра сетку галерэяў у шафах. Клінаў, ты — плягіятар! Ты скраў іерогліфы маёй шафы! А Сін па сваёй кітайскай традыцыі зваліўся каля ўнітаза. Я думаю, што ён наслухаўся лекцыяў Дзюшана. Нічога-нічога. Гэта пайшло яму на карысьць. Дзесьці а чацьвертай раніцы я прывёў нейкую хворую на галаву жанчыну. Яна ўвесь час пляралася і крычала пра нейкага прыдурка са сьметніцы. А потым мясцовасьць кватэры запоўнілася сьпевамі. Сін і Клінаў прачнуліся і падхапілі зьвярыны лямант. Гэтак мае новыя суседзі даведаліся пра сваё няшчасьце... Ша!

**МАРАЗІЛЬНІК - АЛЬТЭРНАТЫВА КАТАФАЛКУ!**
**АДВЯЗІ СВОЙ БРАКАВАНЫ ЧЭРАП НА ЗВАЛКУ!**
*14 красавіка 1997 году*

Мая кватэра, як маразільнік — мяса можна класьці па ўсіх кутах, і яно не сапсуецца. Холад канцэнтруе прастору мысьленьня — лепш думаецца. Таму я прапаную час ад часу, ня ў мэтах эканоміі, а ў мэтах падняцьця мазгавога патэнцыялу, адключаць дамы ад ацяпляльнай сыстэмы. І гэта трэба рабіць у самы люты мароз. Бо інакш эфэкт будзе страчаны! Ды я выцягваю пласкагубцамі свае зубы. Ша!

**ПЕРШАЯ СЬМЕРЦЬ БУМБАМЛІТАЎСКАГА МЭТРА**
*16 лютага 1997 году*

Сасьніў, што памёр філёзаф Акудовіч. Я бегаю сярод сяброў і пытаюся ў іх: "Ці пасьпеў наш атаман напісаць прадмову да першага бумбамлітаўскага зборніка?". Прачнуўся ад болю ў грудзях. На лбе халодны пот. Няўжо на небе пачалі пладзіц-Lja рудыя яблыкі? Ня можа быць. Неяк філёзаф Акудовіч атрымаў тытул: Бесьсьмяротны хросны бацька бум-бам-літу. Таму думаю, што падобныя сны — правакацыі ворагаў! Ша! Суполка бум-бамліт урэшце сябе дыскрэдытавала, але Акудовіч застаўся! Бо ён — душа беларускай прасторы постмадэрну! Ён зрэдку ўжывае мадэру і таксама не выносіць саўдэпаўцаў! У паравозным дэпо псэўдалітаратараў ёсьць топка! Там жыўцом паляць фашыстоўскіх сусьлікаў і катоў!!! На маіх далонях нябожчыкаў пот!

**ПРЭЧ УКУСЫ ЧАРВЯКОЎ!!!**
*22.02.97.*

У вячэрніх навінах паказалі Юрася Барысевіча. Ён сядзеў за лакіраваным сталом і засяроджана запісваў словы нейкага чынушы. Мабыць, у Юрасёвым нататніку ўтвараўся чарговы трактат — бо ён часта варыць гадаў жыўцом... Вось-вось... Навучыў на сваю африканскую галаву!.. Я ведаю — гэта ціхі хірург. Так, некалі сярод цішыні бачыў я, як мастак скальпелем выразае зь цела кнігу. Ён пісаў крывёй! Ша! Наш! Мае вочы запацелі анашой! Прэч, скунсы й сусьлікі!

**ЗІМА 1999**
**ЗМАГАРЫ ПАД ШТАНДАРАМ ГРАДУСА**
**ТУТ ПРЫГАДВАЕЦЦА 1997**

Мы хадзілі па Варшаве воінамі! Сьнег звальваўся з дрэваў пудрай! Масты хрумсьцелі і рыпелі холадам. Мы расьціскалі прастору зімы сваімі чорнымі целамі. Шлемы аздаблялі нашыя галовы! Вецер раскручваў шалікі зьмеямі! Сін, Барысевіч і я рухаліся баявым атрадам. Сьмерць дыктатуры! У нашых кішэнях былі пістадеты, бомбы, гаўбіцы й даляры! Ха-ха! Сьмерць тупым!

Сьмерць мазгоў пачынаецца ня з джыну — яна падае на машыну галавы пасьля прыняцьця дозы дэзінфармацыі! Пасьля засваеньня савецкай сыстэмы знакаў! Калі ў каву замест бальзаму трапляе атрута таталітарызму!

## НЯМЕЦКАЯ ТРАДЫЦЫЯ ТВОРЧАЯ СЭКЦЫЯ КАТАВАНЬНЯ

*6 чэрвеня 1997 году*

Сасьніў, што я ў Бэрліне. Да заканчэньня Вялікай Айчыннай вайны — адзін месяц. *Я* — немец. Побач са мной — немец Ільля Сін. І тут раптам мы разумеем, што сёньня вялікае сьвята: Дзень алькагалізму. Нам у любым выпадку наміраць — таму я вырашаю, што трэба напіцца. Мы шпацыруем на нямецкім рынку — разглядаем кактэйлі. Але гэта кактэйлі... якімі надрываюць людзей. І тут мы бачым кактэйль Ільлі Сіна. На ім — каляровы фатаздымак зь вялізнымі нагамі пэрфаматара. Гандлярка кажа: "Гэта цеста, якое гучна крычыць". Мы ідзем далей, і я адчуваю, што зараз будзе кактэйль Зьміцера Вішнёва. І тут мяне будзіць тэлефонны званок...

*у нябыт адлятае серабрысты каток галава заплывав ў*
*карабсльны док на далонях дока фаиэндаскоп мне падабаецца*
*факстрот чорны пісталет выцягвае подлы коп*

*вэнджаныя трупы*

## НА РУКАХ ЗАЛАТЫЯ КУРХІ
## КУРОК - ГЭТА ЛЁС КАРКУ

*2 красавіка 1998 году*

Сёньня я парваў фатаздымак Шханавай на дробныя шматкі. Я рваў спакойна. З кожным стогнам паперы я пазбаўляў свае кішкі ад курары. Я даваў клятву забіваць суськікаў і куранятаў!

## РАДУЮСЯ
## У РУКАХ РЫДЛЁЎКА!

*6 лістапада 1998 году*

Праз адну гадзіну й дваццаць хвілінаў у цябе, сука, сьвята. Радуйся! Да твайго цудоўнага юначага ўзросту далучыцца адзін гнілы зубок. Ты ж — калекцыянэрка, гадзіна. Я ўжо падрыхтаваў табе падарунак. Роўна праз адну гадзіну й дзевятнаццаць хвілінаў я цябе павіншую... Ха-ха!.. Будзе тэракт у цэнтры "залатой горкі"! Будзе табе не чакаляда горкая, а выбуховая прылада ў выглядзе кіркі, дарагая мая Шханава.

## ТРАХНУЦЬ ВІГВАМАМ ПАБОЛЕЙ МАСТАЦКАЙ ФАСОЛІ

У 1999 годзе я адзначаў свой Дзень варэньня, які аб'еўся варэнікаў ды ператварыўся ў Дзень піва. Мы тады з псэўдафатографам Палойкерам закупал! піва трохлітровікамі. Нібыта былі лупатымі боінгамі. Стол сьвяціўся рыбай і суськамі. Луска. серабрылася. Вочы залаціліся. Да краніка мы прыпадалі вуснамі й адчувалі, як па шлянгах цела перапаўзае чырвоны краб. Ха-ха.

Каштоўным аздабленьнем піўнога краявіду быў філёзаф Валянцін Акудовіч. Ягоная барада расплывалася морам. Хвалі дыміліся ад цыгарэтнага дыму. Попел падаў у вялізны панцыр чарапахі, які быў прывезены з Альжыру. Але тлушчам на нашыя твары звалілася чача й хачапуры, якія раптам высьлізнулі з квадратнай торбы мастака Кахабера Гагохія.

Луска лятала порахам. За вокнамі бліскала начное хамства. Я гаўкаў вершамі. Па страўніках шоргалі ракавінкі.

— Пусьціце мяне з жонкай у вігвам, — прасіўся мастак Банько.

— Нельга парушаць мужчынскую філязофію жаночым вокам, — казаў я, — Прымаюцца бочкавыя філёзафы. Бяры паболей мастацкай фасолі й прыходзь.

Але ня верылі мне. Хацелі нечага зорнага. Нечага соннага. Ша!

Каха распавёў, што неяк у Грузіі прымалі Франсуазу Саган, сустракалі на самым высокім узроўні. Ведаючы грузінскія векавыя традыцыі, можна ўявіць, што значыуь запрасіць у тамтэйшых мясьцінах жанчыну на застольле. Гэта вялікая пашана. Тут няма аніякай зьнявагі нейкай паловы чалавецтва. Проста так склалася, што мужчына жыве як бы ў іншым вымярэньні. Дык што ж Франсуаза Саган? На самым пачатку застольля яна бярэ й сыходзіць. У Грузіі, дзе нельга выходзіць з-за стала да канца сьвята! Бо гэта некультурна! За ёй бягуць, а яна ходзіць каля горнай ракі ды ў адзіноце пра нешта разважае... І яе зразумелі. Бо яна жыве ў сваім сьвеце. Яна заглыбленая ў сваю творчую прастору. Дык пра што гэта сьведчыць? Жанчыны й мужчыны ў пэўны момант ня могуць перамагчы прыроду. Фэмінізм — гэта блеф! Я з павагай стаўлюся да некаторых фэміністак, але яны ня могуць перарабіць сваю псыхалёгію, бо гэта немагчыма! І факт адназначны — мужчыны мацнейшыя!

Аднойчы ў расейскай тэлевізійнай праграме "Антрапалёгія" рэжысэр Міхалкоў-Канчалоўскі выказаў думку, што калі б жанчыны былі кіраўнікамі, дык чалавецтва дагэтуль сядзела б у сваіх хатках і ня

марыла б пра нейкія падарожжы й вынаходкі. Сумнае меркаваньне, але, мне падаецца, шмат у чым слушнае.

## ЯК ВЫНІК ШАМАНСТВА

Зрэдку мне хочацца пісаць паэзіяй, бо мае эга дае нырца на дно эпатажніцкага калодзежа. Часам я думаю пра нейкую віртуальную сьмерць. Бо нарадзіўся нехта. Гэты Нехта прэтэндуе на ўсе ўзнагароды. Я ня здольны трываць садызму! Я ня здатны на прыгожы лірызм! Мае мазгі атрафіраваліся й нясуць нейкую бязглузьдзіцу.

Нядаўна я рабіў сабе экспрэс-каву, а цяпер стаю над рондалем і кідаю ў ваду мяса. Потым нюхаю паветра. І, пераканаўшыся, што атрутай не патыхае, бяруся за працэдуру зьнішчэньня спэцыяў. Здаецца, што й сам засмажаны рондаль неяк рэагуе на гэтае шаманства. З кожным подыхам соді або перцу ён зьмяняе колер. Прачытаўшы мае думкі, ён застывае ў адценьнях чырвонага. Я-ха!

Жоўты гарачы мэтал бярэ многа крыві. Ён любіць нашыя творчыя дэгенэратныя твары. Тым больш, што нашыя рукі па паходжаньні не ад гарылаў, хутчэй — ад суськікаў. Мы — я й Сін — сядзім на паразытнай камуністычнай літаратуры і пазіраем на калматую суку, што выпаўзла з рондаля. Рондальная гадзіна. Так-так. Яна харкае на нашыя ногі сьлінай і кідаецца на таварыша Сіна. Я й зараз чую гэты крык увушшу:

— Вось перад маімі вачыма сядзіць гэтак званы малады паэт!.. Але паслухайце яго!.. Ён лаецца на мяне: "Ты — лысы гопнік! Лысы гоблін!" Вырадак — вось што я магу сказаць пра яго. Дзе тваё славутае ўспрыняцьце сьвету? Косіш пад постмадэрніста? Ты — баран, а не паэт! Ты — ананас у чарвяках! Трэба цябе пастрыгчы налыса! А потым з садысцкай асалодай засадзіць табе ў вушы мэталічныя банькі, а потым — у нос, у вусны. І будзеш ты сапраўдным беларуска-афрыканскім мурынам. Трэба ліквідаваць у цябе ўсе зубы, таму што яны гнілыя і нагадваюць маю бабулю, якой ужо семдзесят шэсьць гадоў. І потым, не хвалюйся, мы зробім табе ўстаўныя сківіцы. Уяўляеш, як будуць цябе кахаць дзяўчаты?!! Зранку падняўся — зубкі ўставіў, прыйшоў з працы — выцягнуў зубкі, адпачыў. Ізноў уставіў. Нечага пажаваў...

— Ы-ы-ы-ы, — сказаў Сін і дзеўбануў ворага кулаком. На-а, сука! Антыпаэтычная сволач пырскнула сокам і зваліласа ў каналізацыйную шахту. Адтуль гхачуўся плюхат вады й руская лаянка. Напэўна, у гэты момант адрыгнулі падземныя гарадзкія трубы. На сонцы зрабілі пячатку.

Амаль адразу ў кішэні Сіна зазьвінеў мабільнік. Дрэвы-дубы заварушыліся. Сін спытаў:

— Але?

Знаёмы голас, прарываючыся скрозь нейкае булькатаньне, паведаміў:

— А дзяўчаты!.. Дзяўчаты!.. Яны б цябе закатавалі ад жарсьці. Прыхільніц было б больш на сківіцы, чым на твае штучныя мудзёжныя вершы. Уяўляеш, які будзе ў цябе выбар!.. Пацалункі з зубамі й без зубоў! А калі дамовіцца, дык сківіцы можна зрабіць напалову фарфоравыя, напалову жалезныя або залатыя, або мармуровыя. А можна дамовіцца зрабіць некалькі сківіцаў з усіх вышэйпералічаных матэрыялаў. І тады будзеш устаўляць іх у рот па чарзе. А колькі ўражаньняў будзе ад аральнага сэксу з гэткімі сківіцамі!..

— Ы-ы-ы-ы-ы-ы-ы-ы, — сказаў Сін і выцягнуў з кішэні лімонку. — На-а, сука! — І кінуў гранату ў каналізацыйную шахту. Пачуўся грукат, з шахты паваліў дым. Да нас выскачыла знаёмая пантофля. Напэўна, у Сьвіслачы ў гэты момант аглухла ўся рыба. Амаль адразу да нас падышоў паштальён.

— Вы таварыш Сін? — спытаў ён.

— Так-так, — сказаў мой сябра, — А ў чым справа?

— Вам ліст прыйшоў з Гвадэдупы. Атрымайце.

Сін ускрыў капэрту і пачаў услых чытаць:

— Добры дзень, дарагі. таварыш Сін! Паведамляю, што магчыма шмат варыянтаў у ротавым архітэктурным ансамблі. А калі ўставіць у твой худы азадак пару прысьцібак, каб даведацца пра моц волі... Ты атрымаеш поўны кайф. А мы даведаемся пра волю. Ты ж ня выдасі сваіх сябрукоў па паэтычным цэху ў кадэбісцкіх засьценках? А калі выцягнеш з азадку тыя прысьцібкі, дык цябе зноў пакахаюць дзеўкі. Бо яны любяць загартаваных, а ня толькі зь вялікімі языкамі й геніталіямі. Яны кахаюць ня толькі мінашукальнікаў ад паэзіі, ня толькі інтэлектуалаў прыгожых, але й людзей, дзеўбанутых токам. Трэба табе, таварыш Ільлюшка, мазолістыя моцныя рукі, каб зь іх не вывальваліся пэндзаль і сшытак. Таму дзьмі ты, паэтавы адмарозак, на штангу. Тады будзеш дзёўбаным качком. Або зганяй у войска ды напішы пра вайсковыя прыгоды. Народу надакучыла, што ўсе пішуць толькі пра каханьне й смутак, пра розных братоў-аслоў па пэндзлі. Ну, а ўвогуле, брат Ільлюшка, злога я табе не жадаю, а перасьледую адзіную мэту — выхаваць на тваім прыкладзе ня толькі пачаткоўцаў-літаратараў, але й усю беларускую моладзь...

— Ы-ы-ы-ы-ы-ы, — сказаў раззлавана Сін і падпаліў гадасную паперчыну запалкай. — Атрымай, сука! — Папера зашыпела кобрай, выгнулася, счарнела... І здохла, сука!

Некалькі хвілінаў было ціха. Гіпі курчыліся, як атручаныя прусакі. Мы падазрона прыслухоўваліся да ветру, сонца й зямлі. Здаецца, усё скончылася... Таматны сок ня вечны. І тут зьверху нешта звалілася!.. Ба-бах!!! Бомба! Мы кінуліся на зямлю ды заціснулі вушы рукамі. І... нічога. Няма выбуху. І раптам грымнуў голас, гэта працавалі дынамікі "бомбы":

— Здавайся, подлы таварыш Сін! Твая опэра скончылася. Табе ня месца на беларускай зямлі. Матай у Фінляндыю! У Вішнёва там сваякі — можа, прытуляць цябе, сволач-недабітка. А калі, Ільлюша, зьняць зь цябе манаткі ды пусьціць пасьвіцца на луг, дык адбудзецца мутацыя кароў. І магчыма, у цябе вырастуць, нарэшце, рогі, у лаха гэткага. Тады прыйдзе да цябе сусьветная вядомасьць. Тваё мудзёжнае імя ўключаць у кнігу Гінэса і, магчыма, у хрэстаматыю сусьветнай літаратуры. І ўвогуле, закахаюцца ў цябе ўсе прыгажуні сьвету. І, можа, нарэшце будзе карысьць ад псаваньня паперы. Тады й прыйдзе на твае тупыя санэты мода. Хаця я маю сумнеў наконт тваіх здольнасьцяў да мутацыі і сэксуальных вычварэньняў. Напэўна, у цябе нічога не атрымаецца,. І таму бегаць табе, мудак, без рагоў і славы.

## БОТЫ Й ТОРБЫ ВАЙНА КІПЦЮРА Я ЛЯЧУ НА БЕЛЫМ КАНІ

Ха-ха. На белым століку ляжаць сківіцы Сіна. Я рагачу. Я дыхаю ў гармонік. Катвігай забіваю прусакоў. Ды зьбіраю ў келішак іх кароставыя крыльцы.

— Навошта?! Навошта ты іх не бярог?! Хіба нельга, было іх замарынаваць? Навошта-навошта было іх губляць?!

Пыса майго сябра расплываецца боханам. Хлеб запякаецца імгненна. Чырванее. Дыміцца. Занаўняе сабой усю прастору кватэры. Па сьценках гойсаюць нейкія мурыны. Ша!

## МАЯ КРОЎ ГЭТА БУРБАЛКІ НЕБА

У 1999 годзе ў рамках Акцыі "Час. Прастора. Асоба" я выставіў пяць вялізных прац, аздобленых уласнай крывёю. Усе былі перапалоханыя.

Людзі падыходзілі да карцінаў і падалі трупікамі. Зь іх рознакаляровых вачэй тырчалі пікі. Я адЧуваў сябе дыктатарам з Чылі, які залівае ў рот сьвінцу юпень. Ша!

**НАЧНЫЯ ГАНДОНЫ**
**ПРОСЬБА НЯ БЛЫТАЦЬ З ГАНДОЛАМІ**

Неяк я, сладар Макарэвіч і серабрысты суськік здымалі прастытутак. На нас была вопратка бэдуінаў. Гэта было глыбокай ноччу. Калі маскіты кроў смокчуць. Калі глыбіня дасягае самых-самых гідотных каналізацыйныхямінаў. І гэтыя яміны падаюуь на твае рукі ў выглядзе шанкраў кастаеды. Тады ты задыхается і глытаеш з каскі ворага ягоныя мазгі...

Ну, Макарэвіча вы ўсе ведаеце — у яго сьветлая маленькая барада і вочы крычаць паэзіяй. "Я — паэцік. Падарую ўсім букеуік". Дружа, ну навошта было чапіцца да той дзяўчыны?!! Гэта ж мухі каўшанка. У яе быў ня твар, а гнілая тычынка. Ну навошта ты гэтак пакутаваў?!! Ты ж у кут кінуў сваё чыстае вока і закрычаў немым голасам нешта пра каханьне!.. Бачыў я, якая яна змрочная. Гэта ня дзеўка, а нешта задрочанае. Вуй-вуй. Выбачай, кожная дзяў'чына — гэта кветка... На яе галаве не паранджа, а жыуьуя сетка. Проста яна трошкі перасьпелая німфэтка. Яна штодня ў буфэуе глытае піпеткі.

Толькі хто кінуў на маёй кухні прэзэрватыў? Якая сука зрабіла тэты тэрарызм? Хіба ў нас ёсьуь паэтычныя расісты? Парву гэтым гадам рот! Ша!

**ПРЫСТУПКА ПРА СОНЕЧНУЮ САКАВІТУЮ ПЫСУ**

Хочауца заблытацца ў гэтым горадзе, каб бадзяцца па вулках. Прыемна. глядзець на дамы й неба, і чытаць вершы. Можа, недзе тут схавалася мая мара? А сонуа коуіуца сярод дамоў прыгожым жоўтым дыскам. Прамяні цалуюць гандляроў півам, каруінамі, ракавінкамі й марамі. Жоўты мёд выпадае з сотаў камякамі.

**КНІГА ПРА ЭКЗЭКУЦЫЮ ЧАЛАВЕЧАГА ЦЕЛА**

Падчас "Літаратурнага экспрэсу. Эўропа, 2000" быў прадэманстраваны наш баявы атрад. Усе чыноўнікі адплёўваліся гарбатай. А мы піхалі новую! Бярыце! Піце!

Мяне ня клікалі на сцэну. Ха-ха! Ня пройдзе! Я выйшаў сам! Выплыў на талерку смажаны сом! Я й Вальжына Морт збацалі перед кунакамі гарматны торт. Праз наш рот выплывалі таматныя гукі. Мы грукалі мікрафонамі па гарлавых люках. Але мы не былі сукамі. Мы сябры сусьлікаў! Мы зь літаратурнага Грын Пісу! Мы з атраду "Schmerzwerk"!

— Адзін верш! Толькі адзін, Зьміцер!.. — шыпеў са сцэны сусьлік.

Я расьцягваў у матрацы свае твары. Мае вусны адляталі самалётамі. На сцэне быў аэрадром з фаервэркам. Я быў літаратурным клеркам!

Сябры з "Тэатру псыхічнае неўраўнаважанасьці" рвалі прастору Дому літаратара вяроўкамі. Рукі стагналі венамі. З другога паверху лілося віно. Расстралялі вінаватага. Ён не супраціўляўся. Выцягнуў з рота сківіцы. Паклаў іх на баярскі стол і ў чаканьні сьмерці скурчыўся. Яму далі апошнюю цыгарэту і кубак з чыфірам. А потым з контрарэвалюцыянеэра зрабілі кефір. Куля была сястрой. Я на хутка сьвідравала. Боль адлятаў музыкай Вівальдзі. Клюшкамі махалі хакеісты "Дынама".

Літаратар з Вугоршчыны быў шакаваны. Шарыкі запаўзалі за ролпсі. Як не далі? А чаму выйшаў? Хіба Кубу прынялі ўжо ў Эўропу? Няўжо на Марсе патоп? Гэта проста суцэльны дурдом. Не! Гэта Дом літаратара! Не чапай нашых! Мы на шынах ставім мікробнае т:іўро! А потым п'ём ром!

Дзесяць бутэлек моцнага напою запацелі смагай. Яны сьпявалі з магам! Я боўтаўся ў гамаку. Па баках ляжалі прыгожыя кенгуру. На нашай высьпе было добра. Нашыя робы віселі ў шафе. Прысутныя абвесьцілі мяне авангарду шэфам! Усіх гадаў на эшафот!

## ЧАСОПІС "МАЎЗАЛЕЙНЫ СУСЬЛІК"

Па стале поўзаў тоўсты плюгавы сусьлік. Прывітаньне, сусьлік! Дам табе па зубах атамным матрацам! Ты будзеш пад рэвалюцыйным абцасам! Табе не дапаможа эскулапская каска! Ша! А потым я буду піць сакэ! Прэч, маўзалейныя сусьлікі! Вы сябры скунсаў!

Вусы сусьліка калмаціліся венікамі сумпымі. У ягоных вачах летала злоба. Ён быў ахоўнікам баабаба. Я грукаў перад ім балёнам. Сьмерць дэспатызму!

У выніку баталіі я атрымаў фінгал. За літаратурны тэрарызм. Сука! Нельга піць каву ў забароненым месцы! Нельга грызьці вопратку! Ша! І я стукнуў сусьліка лірай па галаве! На-а! Ха-ха. Ты не пісьменьнік — ты савецкая пыса.

Потым я сплюнуў у тым месцы. Тры разы. Каб не сурочыць. І паехаў выступаць у лягер "Юбілейны". На вуліцы сьвяткавалі зруйнаваньне Бастыліі. Гэта. было ў маім стылі. Рубон! Ша!

## ПАВЕТРАНАЕ МАЛАКО ПАЭЗІІ

Ну, што? Расплюшчвайце свае фары. Гучней, фанфары! Я іду.

Для мяне Менск — гэта родны дом. Я выхаваны на гэтых бэтонных прасторах. Мае думкі расплываюцца па праспэктах, саркафагах і пірагах. Тут я плаваю на мэханічнай пірозе. У маім афрыканскім габінэце вісіць аўтапартрэт — я пазіраю ў будучыню. Думаю, нашчадкі ацэняць гэтую пысу. Настолькі яна велікасьвецкая. Настолькі яна антысавецкая. Настолькі яна нямецкая. Жыве "Schmerzwerk"! А вам, "клёуны з бум-бам-літу", маё вішнёўскае "фэ"! Я страляю з фаўстпатрона! У гэтым сэнсе я падтрымліваю Дынько. Заўсёды любіў зеляніну! Яна сёньня дапамагае хавацца сэпаратыстам ад кадэбістаў! Гэта проста шчасьце нейкае! Гэта дынька на магм стале. Я пілую яе бэнзапілой. Смачна есьці табе, Зьмій Віш. Дзякую. І вы частуйцеся, паваясаны Буль Жы. Смачнага вам, бумбамлітаўскі паліндраміст. І вам смачнага, бумбамлітаўскія сэпаратысгы. А вам падавіцца, подлыя ніўскія рэакцыянэры. Дайце Фюрэру цыяністага калію! Дайце чалавеку спакойна падохнуць! Ён хоча на мыла! Ён хоча афганскай кулі, мілы! Ён проста ляжыць пад мастацкім абцасам Фэліні!

Ха-ха. Страшна? Гэтак і мне. Штовосень я думаю пра матылькоў, якія гараць на вогнішчах. Выцягваю кантрабас і бацаю музыку. Ствараю паветранае малако.

## ІЕРОГЛІФЫ НА БУЛЬДОГАХ

На кампутары я выбіваю малюнак. Гэта скальныя гульні. Гэта я бягу ад бульдогаў! Там, недзе на поўначы, маё выратаваньне. Я разумею сытуацыю. Ад злосьці грызу тасак. У маёй бабулі ёсьць сакура.

## ДЫМ МАШЫНЫ ЯК СЫН АФГАНСКАЙ ШЫНЫ

У ліпені на вулках Менску сьпякотна. Трамваі дзіравяць паветра сотамі. Але самае галоўнае, што жыцьцё дыхае дымам. Смачным. Самым разнастайным. Машынным. Трубным. Сыропным. Транзытным. Палітычным. Трошкі не сымпатычным. Але, там ня менш, вечным. Гэта ня сьмешна. Гэта стагодзьдзяў зьмена.

## АРТЫКУЛ ПРА САБАЧНАГА КАМПАЗЫТАРА ЁН ЛЮДЗЁЙ КАТАВАЎ

Павукі поўзалі вакол мяне. сьпіралямі. Сонца задыхалася. Я разломваў падрамнікі для сваей выставы.

Па маім баявым заданьні Буль Жы панёс маю агромністую карціну ў Дом літаратара. Усё б нічога. Ды карціна была зроблена алеем і страшэнна мазалася. Таму ён нёс яе ад майго дому да Дому літаратара пехатой. Як апасьля выявілася, бедалага перапэцкаў па дарозе чалавек трыццаць. Сярод якіх вельмі многа паважаных у горадзе людзей. Ён выпэцкаў аднаго кампазытара. З тага часу той ня піша музыкі для піянэрскіх арганізацый. Кіроўца тралейбуса па сваёй неасьцярожнасьці атрымаў плескача фарбай над вока, калі праязджджаў міма... Цяпер ён стаў пісаць вершыкі. Ха-ха. Ешце!

## МАКУЛАТУРА НА ДНЕ ТРУНЫ ТРУТНІ! ТРУТНІ! ТРУТНІ!

Я хачу памерці, як дзікі алень. Флянэлевы дзень.

Даўно ня бачыў спад ара Акулава. Ён, здаецца, выйшаў зь белай гарачкі. У яго адваліліся сінія рогі. У яго не баляць цяпер выліцы. Мой сябра прачнуўся ад доўгага сну!.. Выдатна!.. Я й Буль Жы прыехалі да яго ў склеп. Тут сярод каналізацыйных трубаў і карцінаў жыве дух мастацтва. Прывітаньне, таварыш шкілет!.. Тут з-пад пэндзля вылятаюць шэдэўры!.. Прэч, дзень шэры!..

Пляшка гарэлкі скончылася хутка. Шкло выпрастала лапкі тарантула. Я прыкладаўся да кратка і глытаў атручаную сьліну. Прыпякала. Ды я люблю фінскую лазьню. Другая пляшка вылецела хуткай дапамогай. Мяне клікалі ў морг. Ха-ха! Я перамог! На зубах трашчалі бярозавыя і дубовыя венікі. Зубы вывальваліся варэнікамі.

Акулаў марыць спаць у труне. Ха-ха. Спазьніўся. Я сваю труну падарыў клюбу "Альтэрнатыва". Трэ было раней штосьці. Праўда, можна й пазьней штосьці. Самае галоўнае — калісьці штосьці. Вымываецца з костак кальцый. Спадарыня Зося кажа, што гарэлку трэба запіваць вадой. Каб ён не вымываўся. Як жа тады страўнік? Лепш зусім ня піць. А як жа тады душа? Лепш зусім здохнуць. Не, — гэта проста нейкі шабаш. Дзе мая афганская швабра? Я буду рабіць для катлет фарш. Мае вочы п'яныя й сьвецяцца, як фары. Зьбег Буль Жы. Ха-ха. Так і трэба. Я і Акулаў пайшлі шукаць прыгодаў. Каля небастыка рукой махаў Прыгаў.

Пяць разоў мы здымалі розных дзяўчат. Гарэлкі пілі занадта многа. Нашы страўнікі праплывалі тысячы міляў. Каўбасу наразалі на газэце "ЛіМ". Ша!!!

**БЛАТ БЛАТНОГА БАЛЮ**
**БРАТЫ НА БАРЫКАДЫ!**

— Дастаў! Ты мяне дастаў! Па маёй кватэры бегае бізонаў статак! — крычаў мне ў тэлефон філёзаф Акудовіч. — Еду! Еду! Сядаю сёньня на цягнік! Прэч шызафрэнікаў! У Афрыку! Да Лімпапо! Так-так! У тры гадзіны на вакзале! Паедзем да паэтычных васалаў! Будзем есьці смачнае сала! І абавязкова захаплю сачок для маскітаў! А ты плюхні на галаву мастацкае сіта! Не спазьнюся! Хаця вакол лляне й ходзіць Бабкоў з байдаркай! Хаця патаемны голас і спакушае мяне краявідам з даяркай! Хаця й няма натхненьня над галаўной аркай!

— Так! Так! Дзякую! Буду ворагаў арканіць і біць кайлом! — крычаў я. — *Я* паважаю філязофію! Гэта сапраўдная літаратурная анкалёгія! Таму й захаплю ў падарожжа аднаго піўнога дырэктара! У яю вялікі завод! У яго дыплямат з кодам! Ён гуляе толькі з парасонам! Ён абяцаў нас потым перасадзіць на малярыйную баржу! Гэта наш буржуй!

— Цудоўна. Да сусгрэчы.

— Да пабачэньня.

На вакзале пад гадзіньнікам ужо стаяў Сін. Ён быў у камбінэзоне сынтэтычным. Таму па ягоным целе гулялі блісы. З зубоў Сіна тырчэла кубінская цыгара, якая была колеру афрыканскага загару. Хаха. Ён сапсаваў нікатынам свой бэтонны рот. Бо той крышыўся, як чакалядны торт. Я прыгадаў сябру пра абяцаньне займацца спортам. Але яму было пофігу. І таму, акрамя дымнай працэдуры, ён займаўся хірургічнай апэрацыяй. Ён выцягнуў свае трэцяе вока й скальпелем выразаў на ім нейкія паганскія сымболі.

— Цяпер яно будзе ня толькі прасьвечваць, але й сьвяціцца, — сказаў ён. — Трэцяе вока абавязана быць нашым лякатарам. Ад яго павінны ісьці прамяні любові й нянавісьці. Нашая пыса — гэта паядальнік ня толькі крупніку й біфштэксу; гэта сапраўдны паяльнік душы. Гэта шып цела. А вось у рыдлёўку і камбайн я пакуль не навучыўся гуляць.

— Ты ўжо дамовіўся са Ждановічам наконт лягатыпу?— спытаў я.

— Дзеля вока?

— Так. Дзеля гэтага энэргетычнага соку.

— І так пойдзе. Гэта не праблема. Вось іншае мяне хвалюе... Ведаеш, у мяне дома завёўся кракадзіл, — сказаў Сін. — Ён штодня перагрызае тэлефонны дрот. Гэта проста жах. Хочаш, падару кракадзіла? Ты, здаецца, любіш марынаваць жывёлінаў.

Я задумаўся. Вакол маёй галавы гуляў дым. Хаха. Я люблю марынаваць мудакоў. Дык чаму не завесьці кракадзіла? Ён будзе заўсёды сыты. Ён будзе маім хатнім дысыдэнтам. Ён будзе паядаць варожы дэсант. Я пакладу яго на дыван і буду паліваць вадой. Ён будзе даваць мне надой крывёй.

— Дамовіліся, — сказаў я. — Як прыедзем з Афрыкі — адразу прынось кракадзіла. Я буду яго карміць пры дапамозе насоса. Ён будзе грызьці косткі мудзілы. Ён будзе цэнтральным цьвіком маёй вілы!

На далягглядзе зьявіўся Акудовіч. Так-так. Мы нікуды не паехалі. Проста купілі бутэльку ды пайшлі піць. Ша! Ва ўсім вінаватае трэірiе вока!

**ТЫСЯЧЫ ЯДРДЎ У ПАДРАМНІК МЭТРА МЭТРАПАЛІТЭН ПРАЗ КВАТЭРУ ВЕТРА**

Наперад! Грымяць тысячы ядраў! Яны вітаюць мяне-адмірала! У грудзях сьпяваюць мушкеты! Я стукаю ворагаў абцасам батфортаў. І вось. Сволачы! Мяне-генія запхалі ў камэру.

Тут сярод пеністых сьценаў я лічыў не камароў — думкі. Зрэдку я спрабаваў лічыць сьценны пенкус, але з гэтага нічога не атрымлівалася. Цьвёрдая драўляная лаўка мяне дастала! Мой азадак балеў. Вам сьмешна... Ша! А мне было балюча! Я мучыўся. Пакуты дыхалі перагарам.

**ХЕРНЯ ХА-ХА**

3.07.2000 я раздумваў пра сыстэму. Сыстэмы бываюць розныя. Гэта як зброя. Чаму арганізацыі дасылаюць сваіх прадстаўнікоў на пахаваньні розных культурных дзеячоў? Традыцыя? Абавязак? Ну, даражэнькі, скажа нехта, ды вас панесла. Папрысутнічаць на пахаваньні — гэта проста звычайны жэст выхаванасьці. Не! Не разумею! Чаму, напрыклад, не пасылаць нашага пісьменнага дзеяча на народзіны дзіцяці ?! Вось, скажам, нарадзілася дачка ў слыннага кампазытара... ці, можа, нават, унучка... а сыстэма туды ня толькі сваяка, але й дэлегатаў ад Сыстэмы. Бо з кожным пахаваньнем адчуваецца сьмерць... Няхай толькі й віртуальная. Сьмерць мастацтва. Ша! А вось нараджэньне... выклікае адчуваньне жыцьця! Ха-ха. 1

няхай кажуць, што жыцьцё — гэта хвароба. Але прыемная. Патрэбная. Гэта значыць, бываюць добрыя прасьвятленьні. Парадокс. Ша!

— Паважаны Зьмій Віш, вы проста ахранелі. У мінулым стагодзьдзі была падобная практыка. Падобныя навасельлі нагадвалі пахаваньні.

Я пашкрабаў рукой патыліцу. Яна была накшталт мыльніцы. І паехаў на Альшэўскага, 12, дзе мяне чакалі вянок і стужка. Што зробіш — праца. У нас у саюзе бульдозэраў і пілаў нават напісаньне нэкралёгаў разьмеркаванае: адзін піша на празаікаў, другі — на крытыкаў... я — на паэтаў. Ша!

## ПРАЦЯГ ГІСТОРЫІ
## МЫ ТАМ ВАНДРАВАЛІ
## ВАНТРОБЫ ДЫКТАТАРАЎ ПАЯДАЛІ

Наш цягнік рухаўся далей. Наперадзе была каналізацыя. Колы грукаталі пахавальны марш. Я трымаў у руках фаршыраваны страўнік і зьдзіўляўся ягонай канфігурацыі. Потым высьветлілася — гэта была тушка. Яна трымцела ў маім горле і ванітавала пёркамі. Мой рот быў капіркай.

## НАЖДАК ДЛЯ ЗУБОЎ МАЙСТЭРНЯ ГІПАПАТАМУСА

Сёньня я пашкрэбаў шчаку ды падумаў пра вечнае. Ха-ха... Недзе на далёкіх маяках сьвеціцца ліхтар майго натхненьня. Дзесьці. Таму я й сяджу бяз гэтага сьвятла. Хрумстаю сухой рыбай і разважаю пра Швэцыю. Мае прыгоды ў Стакгольме перапалохалі ўсіх швэдаў. Думаю, яны й дагэтуль яшчэ ня могуць прыйсьці ў нармальны стан. Ходзяць як крумкнутыя. Ад уражаньняў. Тады, у 1999 годзе, я прывёз ім пачак пэрформансаў, вагон карцінаў, баржу вершаў і самалёт скандалаў. Але пра гэта іншым разам. Ша!

## НОВАЕ ПАДАРОЖЖА Ў СКАНДЫНАВІЮ Я ЗАПАЛЬВАЮ ЛІХТАРЫ КАХАНЬНЯ

*ну дай мне пацалаваць твае вока, Сафія*
*я свайго кшталту байгарын з Сафіі*
*у крыштальных азёрах знаходзяцца сапфіры*
*ты мабыць мастацтва фэміда*
*я пішу вершы пад полымем, сафітаў*
*я канстакутэнаўскі нэафіт*

*а віно бурбона як тыфус*
*у бочках думкі накшталт фікусаў*
*Сафія Сафія*
*ну дай сюды вока*
*гэткай кветкі няма ў маім садзе*
*давай давай хутчэй*
*інакш скажу сабаку фас*
*бо хоць кавалак забяру з сабой*
*кайстакутэнаўскага фасаду*
*я трошкі футбаліст Дасаеў*
*баліць мая душа самурайская*
*у маім садзе вочы як карштукі*
*ну дай Сафія*
*толькі вока*

*28 траўня 2000*
*Стокгольм*

**ВЭНДЖАНЫЯ АКУЛЫ**
**ПРЫСТУПКІ БЫЛІ БЯЗ СУСЬЛІКАЎ**
**БАРАЦЬБА БУБЛІКАЎ**

Мой дзень нараджэньня высьпяваў акулай. Тактак. Гэтая гадзіна ляжала на стале й дымілася. Вэнджаная акула... Ад яе ішоў цудоўны пах. На сьценах сьпявалі карціны. У мяне даўно было вялікае жаданьне пастраляць сусьлікаў. Але неяк не выпадала. Тут, разумееце, раптам магчымасьць. Я быў проста ўсьцешаны. Я рыхтаваў кулямёт "Максім". Сяброў-сусьлікаў павінна было прыйсьці многа. Праўда, галоўны сусьлік зь серабрыстай поўсьцю схаваўся ў Бабруйску. І насьцярожана адмовіўся наведваць маё жытло. Напэўна, меў нейкае падазрэньне, хер сусьлікавы. Але ня будзем пра сумнае. Бо мяне чакала.сьвята расстрэлу. Я пачысьціў усе мэханізмы зброі. Каб ніводная куля ня страціла прытомнасьці. Каб кожная куля: была футурыстычнай сукай. Уявіце толькі, чырвоны небастык... і на гэтым фоне адзін за адным рухаюцца зьвяркі. Шчоўкаюць затворы. Грымяць барабаны... І та-тата-та-та-та-та-та-ата!!! Усё зьліваецца ў адну бясконцую мэлёдыю. Гэта ж лірыка жыцьця. Менавііа. І ня трэба спрачацца. Я — афрыканіст! На маіх пальцах блішчаць пярсьцёнкі. З вуха высоўваецца руля кулямёта, а з носа крапае атрута. Проста кароль садыстаў. Праўда, па памерах я трошкі драбнаваты, затое мае амбіцыі расьцякаюцца на пяць плянэтаў. Ні больш, ні менш. Ха-ха.

**СОЛЬ ПАТЫЛІЦЫ**

На Дзень ведаў я нацягнуў афрыканскую байку. У Доме афіцэраў мяне чакалі швачкі. Усім вам балалайкі! Усім вам мэдытацыпо ад Ламы Карта! Ха-ха. Я махаў рукой, як дырыжор. Я быў хлопцам мажорным. Я распавядаў швачкам пра дурных маржоў. Ха-ха. Гэта іх трошкі разьвесяліла. Была ў маіх жэстах і голасе соль. Бо, разумееце, ня ўсе любяць салодкае. Некаторыя страшэнна багомляць усё вострае. Яха-а-а!!! Я выцягваў свой самурайскі меч!

**КРАКАДЗІЛ ГЕНЮСЬ НАС ВЫРАТУЕ!**
**ТУБЫЛЬЦЫ АТРЫМЛІВАЮЦЬ ДАЛІКАТЭСЫ!**

На Дзень ведаў я вышырхнуў на сумную вуліі;у праз запасны лаз. Чыгунны люк адкаціўся тазам. Трэба было адстрэльвацца ад контры, якая нечакана звалілася на маю патыліцу. Зладзеі былі паўсюль. Зэп ладук сык. Мады росклафа. Прэч, строма!!!

Непрыемнасьці здарыліся яшчэ зь некаторымі людзьмі й суськамі. Нават катарга ім не сьвяціла. Здыхалі адразу. Потым зь іх папуасы рабілі зразы. Да прыкладу, адзін паэт ішоў па праспэкце Машэрава, і рантам на яго зваліўся дзесяцітонны кампутарны манітор. Сьмерць была страшэнная. Ня доўга торгаўся — здох імгнепна. Сьляпы пасыпаў нябожчыка просам.

Клікайце-клікайце амэрыканскага кракадзіла Генюся! Ён выратуе радзіму ад контры. Ша! Рыбы — ня мы! Мы — ня рыбы!!! Мы — птушкі!

**СУСЬЛІКІ!!! ДА НАГІ!!!**

На Дзень пісьменнасьці й друку я быў страшэнна раззлаваны. Адзін мудак-чыноўнік "скунсавай зьнешнасьці" абазваў мяне казлом. Я даў яму ў адказ па галаве хакейнай клюшкай. Паразыт закалаціўся ад болю. Сволач! Але потым мне далі па галаве цаглінай. Прачнуўся я на сцэне каля мікрафона. Суські ўжо выпрасталі вушкі й насьцярожана прыслухоўваліся. Чакалі майго царскага слова. Я павіншаваў усіх са сьвятам і выцягнуў з кішэні пісталет. Хто першы? Але падыхаць ніхто не хацеў. Тады я пачаў адстрэльваць тых, хто сядзеў у першых радах ды імкнуўся быць па жыцьці тоўстым бурундуком. Усё роўна вы суські! На-а-а! Заглыні кулю, вушасты! Пасьля дзесяціхвіліннага адстрэлу ў залі застадася палова слухачоў, якая калацілася ад страху ды ляпала ў экстазе вушамі.

## ТЛУСТЫЯ ПЛЯМЫ СШЫТКА

Ёсьць мудакі, якія ня думаюць. Іх мазгі пайшлі на катлеты. Так і ў Беларусі. Я сустракаў падобных жывёлінак даволі часта. Яны плодзяцца добра. Адзін такі мангол пасяліўся ў "Навінках", а потым вырашыў прыватызаваць фэстываль пэрформансу "Навінкі, 2000". Але я думаю, што ў яго нічога. не агрымалася. Бо ягоная пыса занадта мангольская. Бо ягоная пыса занадта буржуйская. Такія манголы думаюць, што мастацтва — гэта булка, на якую можна намазваць масла. Ша-а-а-а!!! Ня пройдзе.

## ФАТАЛІЗМ + ФАНАТЫЗМ

Мой сябра Каха — гэта вялікі чалавек. Праўда, я на некалькі сантымэтраў вышэйшы. Але Каха — мастак! Нядаўна, паглынаючы булачкі й гарбату, ён прызнаўся, што любіць пацука.

## НАСКАЛЬНЫ ЖЫВАПІС

Так-так, працёр вока нейкім шматком — уключыў рэзкасьць. І можна пачынаі;ь справу. Даўно я ня піў крыві свалачэй. Вуй, як даўно я не адсякаў галавы ў тупапысых жандармаў. Вух, як хочацца дзеўбануць па грыбах і шышках гэтых сук! Вуй, як хочацца палаяцца па-расейску! Ша! Гэта літаратурны твор. Ня буду псаваць паперу! Буду ўжываць выключна беларускую лаянку! Усіх вас да балкамвырадкаў! Там, у тых мясьцінах, лесанарыхтоўка. Вось там і жывіце. Гам на елках падвешваюць за галаву некаторых казлоў. Балкампёсы! Сы-ы-ы-ы-ы! Сыр! На маёй чырвонай талерцы ляжыць галандзкі сыр. Я адкусваю кавалачкі ды запіваю кавай. Ха-ха.

## ВОРАГАЎ – НА САЛА!
## СМАЧНА ЕСЬЦІ!

Мяне запрасілі паўдзельнічаць у высгаве "Новыя імёны". Ха-ха! Знайшлі новага. Ды я вышэйшы за вас на дзесяць галоваў. Ша! Подлыя скунсы! Усім вам высьпятка ў нос! Я запаліў на вашай выставе сыгнал SOS! Мае экспрэсіяніецкія працы былі дынамітам! "Левы марш" і "Пах марыхуаны" запацелі ад маіх фокусаў! Усім вам на вочы гарчычны соўс! Экспрэсіяніст Акулаў мне зайздросьціў. Посьпехаў табе, чалавеча! Ведай Зьмія Віша!

Паэт Рыгор Барадулін сказаў: "...няма паэтаў старых і маладых. Ёсьць толькі паэты й не паэты". Я думаю, гэтыя словы выдатна стасуюцца і з выставамі кшталту "Новыя імёны". Бо мяркую, што з мастакамі — як і з паэтамі. Але любяць некаторыя гэтак званыя мэтры прафанацыю. Чаму?

**РАМАНТЫКА МЯСАКАМБІНАТА**

Неяк Поль Элюар напісаў: "Я ў клетку яе саджаю"... Ша! Я напісаў лепш: "У вялізны сачок я пасадзіў дзяўчыну!". Ха-ха. *Я* падыходжу да цела ў вайсковых ботах. Я выцягваю з кішэні бутэльку віскі ды распачынаю працэдуру садызму. Я пырскаю алькаголем у вочы. Я піхаю бутэльку ў розныя пячоры цела. Я дзіка рагачу. І цераз мае жоўтыя зубы прабягаюць сонечныя блісы й ручаінкі сьліны. Няголенай шчакой, нібыта. наждаком, я праходжуся па містычных краявідах. І, слухаючы стогны, адкусваю кавалачак малочнай дзяўчыны. Смак крыві... цёплае аскомістае пырскае чырваньню вішні й цячэ па маім падбародзьдзі. Крык, быццам ядро, скача па пакоі, разьбівае ўсе люстэркі й падае на дно какосавай попельніцы. А я, не спыняючыся, разьдзіраю на шматкі апошняе адзеньне гэтай сучкі. Я раблю кіпцюрамі белыя траншэі. Я кідаю дзяўчыну на белыя горы коўдры й нанізваю на металічны штыр. Куранё калоціць крыльцамі, піскае і памірае ў сутаргах. Чырвоныя пухіры выпаўзаюць праз вусны, як скафандры, і пад націскам атмасфэры трэскаюцца на тысячы кропляў. Я занлюшчваю вочы ахвяры й цалую яе ў дзюбку. "Сьпі. Заўтра я прыйду зноў". — Вось менавіта гэтак, час ад часу, апрацоўваюць тое мяса, што аздабляе наш сьвяточны стол. Ша!

**СЬВЕЖЫ ХЛОПЧЫК НА ПРЫЁМЕ Ў БАКАСЫ**

Хлопчык бяжыць па тратуары. Сонца мэдытуе з гарбузамі. Брыль скача, як маятнік гадзіньніка.. Палосы сьвятла кладуцца на прастору тасьмой. Я бяру гэтае аздабленьне ды скручваю ў маток, фырр-р-р-р!!! Кідаю шарык у сьметніцу. Грукае прыгажосьць, як лёд у вадасьцёкавай трубе.

Жыцьцё - гэта гульня чалавека. Розум — гэта тое, чым мы адрозьніваемся ад зьвяроў і пры дапамозе чаго мы спрабуем зьбегчы ад рэальнасьці. Тым ня менш у чалавека шмат што будуецца на інстынктах. Напрыіслад, жаданьне завесьці сям'ю зазвычай тлумачыцца многімі прычынамі, але галоўная прычына — гэта інстынкт працягу роду. Мой сяб~ ра мастак Кахабер неяк заявіў, што

ён цяпер вядзе барацьбу з прыродай. Я яго разумею, але думаю, што ён у нечым памыляецца., бо прыроду перамагчы нельга. Яна перасьледуе нас на кожным кроку. Мы й самі — частка гэтай прыроды.

**Я - НЯ МІЛЕР!**
**Я - МЮЛЕР!**

Я бяру гэтую тушку і раблю ў ёй дробныя дзірачкі. А потым апальваю поўсьць. Язычкі полымя ліжуць тушку з асалодай. Сьвежанінка. Поўная сьмерць. Ад яе нікому не схавацца. Сёньня — ты пазіраеш на сябе ў люстэрка: курчыш міны, разглядаеш свае прышчы альбо задаволена ўсьміхаешся. А заўтра — ты ўжо нябожчык: твая шаўковая скурка спарахнела. Паглядзі на свае пазногцікі, валаскі, бародаўкі, ямінкі — усё гэта часовае. Заўтра нябыт. Таму я бяру гэтую тушку і раблю ёй прэпарацыю. Нешта пойдзе на патэльню, нешта — на замарозку. Скурку я прычаплю над белым кругляком радыё і буду ўзгадваць забіяку. Ха-ха. Дарагі ты мой скунс.

Тушка-тушка... У мяне вялікі нож. Лязо тупоетупое. Таму лапкі я нават не адрэжу — адпілую. А як жа ты мог бы крычаць, калі б ты быў не адразу забіты. Спачатку я ампутую адну лапку, потым другую. Затым можна будзе выкалаць і твае ласкавыя вочы, якія гэтак нагадваюць сасьпелую чорную парэчку. Вушкі я адпілую мілімэтар за мілімэтрам, дыхаючы ў тваю шаўковую патыліцу. Менавіта так нашыя чыноўнікі забіваюць усё сьветлае і чыстае ў мастацтве. Прычым забіваюць не адразу, а паступова — пачынаючы з лапак.

**БЛЫХА ПАД ФОТКАЙ**

Неяк у адзін не халодны і не гарачы дзень. Неяк, калі не лістота і ня голыя галіны. Калі над морам лётаюць чайкі. У час ня добрага і ня дрэннага настрою. Пад грукат колаў трамвая. Пад рып форткі. Зайшлі людзі й суські не ў палату. А ў мой афрыканскі габінэт. Дзе на сьценах габэлены й мае цені.

Але я ня буду апісваць усяго. Я толькі адно прыгадаю. Ша! Сыс схапіў тоўстага плюгавага суськіа. Дакладней, абхапіў рукамі й зашаптаў крыкам: "Дарагі мой жыдок!.. Жыдок мой дарагі!.. Як цябе люблю!.. Адзін у нашай літаратуры жыдок! Астатнія не жыды!"

Генры Мілер у рамане "Тропік Рака" добра напісаў: "Для габрэя сьвет — гэта клетка зь дзікімі зьвярамі. Дзьверы зачыненыя, ды ён унутры — без рэвальвеэра ці дубца. Ягоная адвага настолькі вялікая, што ён нават не адчувае паху друхла, што ляжыць у куце".

**ХТО ЗАБАРАНІЎ ВАГНЭРА?**
**СЬМЕРЦЬ ГЭТКАМУ ШАВІНІЗМУ!**
**МІЛЕРУ - ПОМНІК!**
**ВАГНЭРУ - ПОМНІК!**
**ВІШНЁВУ - ПОМНІК!**
*помнікі не зруйноўваюцца*
*яны жывуць вечна і*
*пераходзяць з одной сьвядомасьці ў*
*іншую*

**БУБНЫ, ШТО ПРЫНЕСЬЛІ З СЫНАГОГІ**

*забараніць піўную раніцу!!!* ЗАБАРАНІЦЬ ПІЎНУЮ РАНІЦУ!!! ПРЫБРАЦЬ ВЭЛЬВЭТАВЫХ ДВОРНІКАЎ!!! ШТУРВАЛ НЕ АДПУСКАЦЬ!!! ВОЧЫ ПАКЛАСЬЦІ Ў РОНДАЛЬ!!! ЗУБЫ - У ПАШТОВУЮ СКРЫНЮ!!! ГАРЧЫЧНІКІ З ІКРОЙ - У СТРАЎНІК!!!
КМЕНАВАЕ
АМІН
НЕ ХОПІЦЬ НЕЛЬГА БІЦЬ РАВІНА!!!

**БАРАЦЬБА З ФОРТКАМ!**

Не азірацца. Не азірацца. Там за форткамі галавы схаваўся трунар. Ён, напэўна, ужо падрыхтаваў сякеру. Ён, напэўна, моцна ашчыляецца. Мыы-ы-ы-ы-ы-ы-ы-ы. Я нават патыліцай адчуваю, як блішчаць ягоныя жоўтыя зубы. Кожны зуб памерам з добрую гарбузовую семку. Свалата... Нічоганічога — толькі б дацягнуцца рукой да грудзей маёй музы. Тады па мне прабягуць бліскавіцы натхненьня. Электрычнасьць павыбівае ў гадаў зубныя пробкі. Будзе ім поўны алес-рыба.
Прэч, антысэміцкія сусьлікі!!!

**э.эх.**

24 верасьня 2000 году я чарговым разам згубіў партфэль. Здаецца, сёмым. Дагэтуль заўсёды вярталі. Цяпер, думаю, трындзец. Бо партфеэль каштаваў 100 баксаў. Э. Эх. Мой ты скуратурэцкі бэгэмот. Мой ты хатні чыноўнік. Як ты там дыхаеш? Ці ўжо даўно выпусьціў апошшою пару і ляжыш трупам і сьмярдзіш чарвякамі? Так-так, твой колер і бліскучасьць напэўна трасфармаваліся. Бо куды ж ты безь мяне? Толькі ад маіх моцных рук ты быў здаровы і вясёлы.

Ты любіў брэндзі, частаваўся варэньнем і сушкамі. Так-так, тыя ружовыя махавікі зь дзірачкамі ты засмоктваў з асаблівай асалодай. Крыльцы гучна ламаліся пад белымі моцнымі зубамі. Ружовыя птушкі ператвараліся ў пастападобныя цельцы. Ты быў эстэтам — штодня чытаў вершы розных аўтараў. Бавіўся ўмбэрта Эка і Валянцінам Акудовічам. Э. Эх. Сонца ты маё бэгэмотнае. Шкада нататнік і мастацкую дакумэнтацыю. Шкодна шмат піць. Хаця я стаўлюся да гэтага выпадку з паразуменьнем. Ігар Аогвінаў добра выказаўся на гэты конт: "Да абнаўленьня. Да-а абнаўленьня". Сапраўды — усё пыл. Што тыя часопісы, тыя фоты, тая графіка? Кажуць, што творы не гараць. Ша! Яшчэ як гараць!.. Трэба толькі паднесьці руку да полымя, каб адчуць сваімі нэрвовымі канчаткамі, як кусаецца навакольная прастора. Любая гарэлка й піва — таксама нажы гэтай прасторы, проста больш размаітыя, — менш заўважныя. Але варта толькі махнуць на іх рукой — і кожны нож атрымлівае самую моцную загартоўку. 1 бац: на целе крывавыя сьляды. Але гэта ўсё фігня, бо я будую новую прастору. Калі яе робіш — хочацца кавы. Ну, дык і пі! — крыкне нехта з вас. Не хвалюйцеся — я кладу цагліны асьцярожна: уэмэнт толькі зрэдку разьлятаецца ад маіх рухаў. А так — адно пляскач. Цудоўны атрымаецца саркафаг! Мумія фараоншы будзе ляжаць з гонарам. Яна будзе сьвяціцца бронзай. Я падрыхтаваў ужо спэцыяльную пудру.

У цэнтры Менску не пірог, ня нары, а сапраўдны многаўзроўневы саркафаг! Ха-ха. Якое гэта. шчасьце для маіх сябрукоў-гараджанаў. Поўны кайф. Электрадрэльлю я прасьвідрую тры тунэлі для прусакоў — яны будуць поўзаць па муміі маёй каханай. А ўсе партфэлі няхай лятуць на хер! Я куплю сабе заплечнік! Прэч эстэцтва !

## ШПІЁНСКІЯ НАТАТНІКІ

Спадар Сурскі — наш чалавек! Мяне таксама раз на тыдзень загружаюць у транспарт, як тушу забітага зьвера. Бязь дроваў печ не працуе! Бязь печы мы застанемся бяз печыва! Бязь печыва мы будзем галодныя і злыя! Ша! *Я* гляджу на паласатыя дрэвы — звычайныя бярозы. Але паспрабуйце адшукаць іх у афрыканскім лесе. Няма ў гэткай глушэчы беларускай прыгажосьці. Вось так і душа — ня ў кожным натоўпе знойдзеш нешта паласатае ды буяннае. Каб за каўнер можна было пацягнуць. Каб прысмак кавы, цукру і бальсану не псаваў краявіду. Бо й на сонцы ёсьць плямы рознага гатунку. Густ скача ад стравы да колеру і наадварот. Жоўтае мае вялікую колькасьць

адценьняў. Любы колер падобны да пальчаткі. Але кожнае адзеньне патрабуе свайго надвор'я.

**СШЫТАК ПАЭТА
ЯКІ ЗДОХ ПАД ПАЛЬМАЙ
ПАСЛЯ ЛІТРУ ЧАЧЫ
ЧЫПСЬДЗЕЦ**

Тэлефон сволач
подлы сутэнэр
скруха нэрпа
фэрма рэпа
арэна сэрная
ня еў я асятрыны я тут сяджу пад кранам з фільтрам трымаю на талерцы мазгі Альгерда Бахарэвіча.

Гэта — харчы для гарчычных ханаў. Адным словам, хто зьеў — таму хана. Я не пасылаў вас на ха.

Я проста ха-ха.

Мне да халеры ваша сваха. Усім вам хаваць казку.

Тут сярод крыштальнай і керамічнай пліткі, сярод ракавінаў і трубаў. Тут — на паверхні мора, якое плёскаецца ў ваннай — жыве дух мічмана нашай літаратуры. Нядаўна адна дзяўчынка ў гэтых мясьцінах крэмзала крывёй вершыкі пра каханьне. "Жаночая хрэнацень", — прыгадваю я словы Кісьліцынай. Не, дарагая — не пасьля цыяністага калію. Проста пад дзьвярыма ляжыць забітая акацыя.

Я разумею, чаму летась адіслючылі гарачую ваду. Зазвычай тут кожны робіць сабе харакіры. Ша! З асалодай факіра.

**ШКЛО КОЛЕРУ ЦІНЫ
УСІХ У ШКОЛУ!**

Тваё шкляное вока мне надакучыла. Зь мяне дастаткова штучных сківаў Сіна. Бо ён усіх дастаў цемрай мастацтва. Дальтонік на гранёныя шклянкі. Таму я не пераношу падробак! А яны ва ўсім! Да прыкладу, у маёй хаце штучнае электрычнае сонца. Мне не падабаецца вада, у якой шмат хлёркі. Я люблю кульнуць шклянку крынічнай! А вы задушыцеся зялёнымі чыпсамі!!!

Пазаўчора, калі мы ішлі па вуліцы, ты ўзяла сваё вока ды паднесла да носа міліцыянта!.. Зялёнае шкло цмокала па вочных абвалах. Сьвятлафор захрыпеў голасам для сьляпых. Я сказаў дрэннае

слова. Сукі! А сабака, які ішоў на ланцугу, проста гаўкнуў і адкусіў нагу ў міліцыянта. Тады мяне й задушылі гэтым сталёвым ланцугом. Цяпер на шыі таўро мага. Ша!

**ВАРКУТА НЕ МАЕ ПАКУТЫ ЧЫСТАЯ МУХА**

Восень прыдушыла мяне бранзаванымі рукамі. Мая жоўтая галава пакацілася па мармуровай лесьвіцы. На кожнай прыступцы я называў горад: Ашхабад, Душанбэ, Бэрлін, Варкута, Дрэздэн, Бабруйск, Чалябінск, Яшкар-Ала!

Вецер разагнаў жукоў па сваіх бярлогах. Цяпер маё "эга" ў поўным росквіце! Я крычу ва ўсю моц сваіх радыятарных лёгкіх: Варкута! Саранск! Ленінабад!

Чаму дрэнна працуе мэханізм адкруткі галоваў? Незразумела. Неразумна. Бо накрыўкі са слоікаў мы зрываем з натхненьнем! Я вырашу гэтую проблему. Я распрацую новую тэорыю адсяканьня чэлесаў. Будзе сярод восеньскіх прастораў свой НКУС і Гестапа! Я — не фашыст! Я — рэаніматар! Я — рэінкарнатар! Я проста арыентуюся на патрабаваньні часу й нашых лідэраў! Я — правакатар сярод нашых дыктатараў!

**МЯСА!**
**Я НЕ ХАЧУ МЯСА!**
**ІДЗІ ДА ЖЫБУЛЯ!**

*ня хочацца мне есьці цябе зайчык!*
*ну ня хочацца родны!*
*я ўжо аб'еўся сусьлікаў!*
*што за сіроп на мой рот?*
*І валі адсюль вушасты!*
*ну проста дастаў сука!*
*дзе мая электрычная лямпа?!*
*не штурхай мяне лапаміі*
*не дзяўбі мяне па плячох!*
*ну ня трахай мяне па галаве!*
*ры-ы-ы-ы-ы-ы!!!*
*сволач кажу проста*
*і зразумела*
*буду біць цябе сьмела веласіпедам!*
*прыбяры свае валасатае*
*сьмярдзючае апрупечча*

*не кладзі каля мяне сваю моркву*
*й капусту*
*я не выношу ахвярападношаньня*
*лох — адчапіся!*
*паглядзі колькі вакол розных*
*ідзі гуляй!*
*ня буду я цябе есьці!*
*ты ня смачны!*
*ты надта прыгожы*
*твой хвосьцік мяне спакушае*
*мне цябе шкада!*
*страўнік баліць!*
*адчапіся!*
*а-д-ч-а-п-і-с-я!!!*

## ДРУГАЯ СЬМЕРЦЬ БУМБАМЛІТАЎСКАГА МЭТРА

Сасьніў, што памёр філёзаф Акудовіч. Я коўзаюся вакол нябожчыка. Зазіраю ў расчынены рот і бачу ўсе гнілыя зубы. Шкада філёзафа. Бо ён столькі наварыў мастацкай фасолі. Усе вакол плачуць. І раптам... грудзі Акудовіча пачынаюць рухацца, і ён расплюшчвае вочы. Ша! Нашых ня возьмеш! Я прыгадваю кнігу "Мяне няма". Гэта мана для мамантаў! Няма мянтоў сярод літаратараў! Слухайце-слухайце Сафію Ратару!

## БО ПАРОДА ЖЫВАЯ НАРОДЗІНАМІ

*я жадаю разагнаць гэтую вінаградную цемру*
*каб твой розум быў сьветлы*
*каб параход аб'ёмістай галавы*
*там дзе надброўныя дугі пераходзяць у*
*бэтонавую шашу*
*рухайся да бухты сэзону душы там*
*бераг аплывае кацялком*
*бо пераход ад стадыі дэбільнасьці*
*да стадыі дзюбельнасьці*
*да стадыі дэцыбэлаў*
*да стадыі белых лілей*
*адбываецца не заўсёды*
*зрэдку дыскі гадзіньнікаў*
*таксама пачынаюць круціцца*

*разам са стрэлкамі*
*верасень 2000*

### ***ЖЫВЫ КУРХ***
### **ПРЫСТУПКА ПРАЛЕТАРЫЯТУ**

Напрыканцы верасьня я патрапіў у літаратурны запаведнік. Паўсюль у вялізных рамах пад шіслом красаваліся партрэты Коласа й Купалы. На цёмным помніку Багдановіча сядзела птушка. Яна аздабляла галаву паэта — быццам сама паэзія выскачыла з валасоў клясыка. ды махала крыламі. Але на кожным кроку каля кусьцікаў і грыбоў сустракаліся рознакаляровыя сусьлікі з партфэлямі рознай велічыні. Яны экстазна паказвалі зубы ды агрэсіўна сьпявалі фальклёрныя песьні. Нібыта гумовыя вусны нацягваліся канатамі й кляшчамі выцягвалі драўляны язык.

Пад дубам стаяў стол са стравамі, за ім сядзелі некалькі чалавек і каля дзясятка сусьлікаў рознага полу.

— Зьмій, кульні гарэлкі, — паклікаў мяне нехта.

— Прывітаньне, сябры, — сказаў я.

Сярод прысутных людзей я пазнаў Някляева, Сэнюха й Пушчу. Сярод сусьлікаў вылучаліся трое: двое вусатых — адзін дробны й сьмярдзючы, другі вялікі й пануры, трэці барадаты. Усе сусьлікі перамолвалі капусту й моркву і ў перапынах прыкладаліся да рыльца вялікай шкляной каністры.

— Я хачу сказаць пра Зьмія, — сказаў Някляеў — Ён жывы клясык. У ім я прыгадваю рысы нябожчыка Максіма Танка.

— Я супраць! — закрычаў барадаты сусьлік. — Ён ня любіць беларускай літаратуры! Ён пра гэта сказаў у лазьні! Я памятаю!

— Я хачу выпіць за чалавека. За. новае пакаленьне літаратараў, — сказаў Някляеў.

— Я супраць! — закрычаў вусаты й пануры сусьлік. — Ён сказаў, што Някляеў у пралёце. Ён сказаў, што Някляеў у пралёце над Беларусьсю. І што апошні ягоны супынак — Фінляндыя!

— Я хачу выпіць за паэта, — сказаў Някляеў.

Я пакрыўся чырвонымі плямамі. Мае пальцы апухлі й варушыліся надзьмутымі шарыкамі. Валасы абвальваліся восеньскім лісьцем. Недзе на небастыку сярод гэтай шумнай алеі я пабачыў жанчыну. Яна рухалася павolі. На ёй была вялікая белая накрухмаленая сукенка. Кожны яе рух суправаджаўся пахрумстваньнем. Тканіна размаўляла на мове засохлага крэму. Яе грым паласацілі зморшчыны. Валасы былі такія самыя, як сукенка, таму іх крухмальная закасьцянеласьць часта

парушалася... Похап ветру дыхаў на валасы, і тыя абвальваліся глязурай булачкі.

— Я адкажу, — сказаў я.

— Не!!! — закрычалі суслікі.

— Не апраўдвайся, — сказаў Някляеў.

— Ня буду. Я скажу тост, — сказаў я. — Ніколі ня быў расістам і ня буду. Я застануся паэтам. А вам, суслікі, на партфэлі — кляксы!

— Выдатна! — закрычалі Сэнюх з Путчам.

Усе выпілі й разьбегліся па талерках. Было ўражаньне, што салата й катлеты здабытыя з-пад зямлі. Нават здавалася, што нехта працуе шахцёрам. Недзе справа ад мяне сярод чырвонай ікры грымеў адбойны малаток. Парода шыпела і адлятала вялікімі кавалкамі. Вусы шахцёрнага сусліка хісталіся ножкамі вусеня. Нават сонца напалохалася і схавала промні ў пальчаткі хмараў.

— А ты, барадаты, памятаеш, — сказаў я барадатаму сусліку, — як твайму бабру мы падарылі ліхтарык у гандоне? Шкада, што тут няма гэтага ліхтарыка. Я б табе пасьвяціў. Бо з тлуму сваёй талеркі ты можаш заглынуць костку.

— А-а-а-а-а-а-а-а!!! — завішчэў барадаты суслік.

— Ты ня любіш беларускай літаратуры! Для цябе акрамя жыдоўскай паэзіі нічога не існуе!

— Я паважаю вершы нашага малодшага брата, — сказаў я, маючы на ўвазе дробнага вусатага сусліка.

— А-а-а-а-а-а-а-а!!! — завішчэў дробны вусаты суслік. — Я беларускі літаратар!!!

— Я й кажу, — сказаў я, — што ня супраць беларускай і габрэйскай літаратуры. Я люблю вершы Іосіфа Бродскага. Я багомлю карціны Амадэо Мадыльяні. А вы — суслікі!

Ха-ха. Вось так я павесяліўся ў запаведніку. Потым мяне загрузілі на насілкі й вынесьлі ў парк. Там сярод аголенага сонца і стракатых хваляў ракі я ачуняў — выцягнуў з кішэні касьцяную трыкутную люльку ды закурыў. Дымам адляталі мае ворагі ў верхавіны дрэваў. Там сярод калючак яны мармыталі плёткі й паграясалі мне нікатынавымі кулакамі. Я заплюшчыў празрыстыя вочы й пабачыў цягнік. Колы рухаліся як раскручаныя да вар'яцтва гадзіннікавыя стрэлгсі. Іржа цалавала пыл. Таму вялізныя бочкі нагадвалі карагод жукоў. Я ўскочыў на люк адной бочкі й раскруціў над галавой тамагаўк. Сьмерць бяздарным суслікам! Мяса на сталы нашых галодных грамадзянаў! Ша!

**СТАРАЖЫТНЫЯ ЗАПІСЫ**
**ТЫЯ ШТО ЗАЦІСНУТЫЯ Ў РУЦЭ АТРУЧАНАГА ПАЭТА**
**ЯНЫ ВЫЯЎЛЯЮЦЦА ПРАЗЬ ФІКСАЖ НЕБА**

*дрэвы насоўваюцца*
*зазірне ў мае вочы родная*
*там і застлнешся*
*карабель бяз мачты*
*стаіць ля выспы*
*зямля патыхае халвой*
*можа катвіга зачапілася*
*за сэрца і там засталася*
*жабры пакінутыя безь кіслароду*
*штосьці мармуровае вакол*
*майго подыху што не саграе*

**ПРЫГАЖОСЫЦЬ СКАЛЬПА**

У бабульках ёсьць свой смак. Так, кожная зь іх прывабная зморшчынкамі, перакатамі расколінаў, жухлымі краявідамі, чырваньню восені. І час. ад часу на іх робяцца сэксуальныя напады. І я думаю, нездарма гвалтуюць старых жанчын. Прастора здарэньняў ляжыць на некалькіх узроўнях — нельга шукаць сярод гвалтаўнікоў адно маньякаў, сярод іх трэба шукаць мастакоў і паэтаў. Хаця, у пэўным сэнсе, і першыя і другія могуць жыць у самабытным творчым тандэме. Я маю на ўвазе, што асоба маньяка можа цалкам натуральна расплывацца ў асобе творцы. Бо, па сутнасьці, кожны маньяк свайго кшталту творца. Іншая справа, на што накіраваныя ягоныя мастакоўскія пошукі...

У кожнай брутальнас.ьці й гэтак званай брутальнасьці прыхаваныя свае разынкі. Ня проста вінаградзінкі, а менавіта ўжо ссохлыя на сонцы ягадкі, якія, тым ня менш, ня страцілі асаблівага смаку й духмянасьці.

**ВЫЧВАРЭНЬНІ НА ТЛЕ ДЫПЛЁМНАГА ПАФІГІЗМУ**

У студэнцкім дыплёме я знайшоў вершык. Поўная лухта. Але нешта бурбуліцца. Таму я бяру гэтыя радкі й раскладаю іх па костках... А потым аддаю іх сабакам...

*шыпяць бурбалкі як зьмеі — топ-мадэлі*
*мая адзнака пырскае мэталёвым штопарам*

*на тую бутэльку ромавай новукі,*
*якую не вучыў але ахутваў*
*наркаманской парай*
*бо чынам шайбовым ня выйшаў*
*бо шыю выгнуў*
*калі выў на вуліцы вершамі шатанскімі*
*пад грукат гарматаў Басаева Шаміля.*
*але я прайду дыплёмныя мілі*
*бо ў маіх волосатых руках мэталёвы лом.*
*і загучыць дасьледчыка ліра*
*дзеля Іван Іванавіча і таварыша Шылера*
*ша!*
*22 траўня 2000*

Ха-ха. Поўны ўлёт. Бурбалкі й штопар.

**Я ЗНОУ ТРАПЛЯЮ Ў ГІСТАРЫЧНЫ 1998 ГОД**
**ТАРАЙ У ВУХА**
**НА ЗЯМЛІ ЯШЧЭ ЖЫВЕ ГЭТАЯ СУКА**

Вільня мяне прыняла, як роднага сына. Яна цалавала й карміла. У 1998 годзе ў "Рускай галерэі" я правёў пэрформанс "Тубыльскія відарысы". Каля сарака графічных твораў я агучваў сваімі сыіевамі.

Я паказваў віртуальную сраку! Эйфарыя шамана зьмяшалася з эйфарыяй публікі. Здаецца, расейскі чыноўнік разьюшана ікаў. А я выў, я крычаў! Я быў папуасам, які рыхтаваў акт людажэрства ў межах адной асобна ўзятай галерэі! Зараз будзе вам ням-ням!!!

**СШЫТАК СКРАДЗЕНЫ З АРХІВА БІБЛІЯТЭКІ**

Сасьніў, быццам сінім кітом быў. Вочы люстэркамі падалі ў ваду. Там іх заглыналі празрыстыя мэдузы, якія, у сваю чаргу, ператвараліся ў дадаістычныя зоры. Унітазы сьвяціліся мармурам. У гэтым было нешта ад маіх віленскіх дэбошаў. Вуліцы абкладаліся творчай пастай. Гэтак часта мы шлі з Кэры Кізам і Рычардам Кедлам. Там я сьпяваў і танчыў па-папуаску.

**КАКОС МОЖАМЕЦЬ АТРУЧАНЫ СОК!**

Вось сяджу ў гэткім афрыканскім габінэце! Дзесяць тысячаў тон ціснуць на маю галаву! Адчуваю, як адплываю. Усё — здыхаю! Я —

здыхаю за гэтым бясконцым драўляным сталом! Папкі шпаламі лятуць да аблокаў! Тэлефонны апарат замест жалезнага сэйфа — ён б'е малатком па маёй скроні! Здыхаю! Здыхаю! Шафы танкамі на мяне насоўваюцца! Замкі шчоўкаюць! Кулі рыхтуюцца! Сволачы! Сволачы! Я — Зьміцер Вішнёў! Я — геній усіх часоў і народаў! Футура-афрыканіст! Я чарвяком выкручуся з-пад вашых мэталёвых вусеняў! Я рыфлёную гранату маю! Над плянэтай вісіць цень фашызму! Я ра.збураю любыя ідэі сваім існаваньнем! Бо можна вынайсьці новае на плянэце Зямля! Часта сярод камянёў нараджаецца. пясок! Сьведчу сокам свайго алімпійскага лба! Я скрыжаваў свастыкай сваю неўміручую экстрымную канцэпцыю!!!

**ПРАВАКАТАРСКАЕ ТАЎРО**

Я прытуліўся да дзьвярэй. Так — я за бранявымі створкамі. Недзе за імі адзін суськ чухае свой карак. Зьвярок зьбег з турмы! Ша! Я дрэнна яго катаваў! Я фігова яго забіваў! Цяпер ён на. мяне палюе! Ды я цыгарэту палю!..

У маёй кішэні ляжыць нож — кароткае бурштынавае джала. Я цябе аблажаю, суськ!

Вось так. Усе нашыя ўчынкі адбіваюцца пячаткамі ў прасторы.

Нішто не застанецца па-за кантэкстам чалавечага жыцьця. Кожная падзея дрэннага ці добрага характару — свайго кшталту наш генафонд, які ўнутры нас вечна. Не губляй яго! Дакуль існуе навакольная прастора — да таю часу прасторавыя пячаткі будуць актуальныя, нават калі й зьнікне само чалавецтва.

**НЕПРЫХАВАНАЯ ПРАСТЫТУЦЫЯ**
**ЯКАЯ ТУЗАЕ ПУЗА ТУЗА!**

Прадажнае масгацтва! Вы ўсе прадаліся! Неістотна каму! Істотны сам факт!

У нас — у Менску — некалькі шлюшных панэляў! Хаця прызнаюся — у прастытутках ёсьць свой кайф. Наркаманія ды прастытуцыя, алькагалізм і здрадніцтва — існуюць вечна! Кайф спакушае! У народзе кажуць: "Што занадта — то ня здрова". Таму зазвычай любы вялікі кайф мае вялікія наступствы.

(Той, хто плаціць, — замаўляе музыку, але пазбавіць музыкаў інструмэнтаў ён ня мае права. Дык пра што я? Продаж мастацтва абмежаваны! Ша! У рамках рэзэрвацыі ёсьць свой кавалак свабоды!!!)

## ТРАПНАЯ ПАЗЗІЯ

З акна майго афрыканскага габінэту выкуліўся знаёмца-паэт. Бо зачараваўся, небарака, восеньскай лістотай. Цяпер ён ляжыць на асфальце і булькае чырвонымі пухірамі.

*калі стаяць на рэйках обо шпалах*
*і глядзець зачаравана на цягнік*
*гарачае сонца электрапілы можа*
*праехацца па кадыку твайго горла*
*сінія фактурныя*
*размаітыя гузікамі краявіды*
*трапляюць пад рабрыстыя падэшвы*
*амэрыканскага абутку*

*я ўчора замяніў кеды*
*на прыгожыя зімовыя чаравікі*
*каб псаваць восень*
*сваім замёрзлым подыхам*

*мой язык мае рыбны шкілет*
*ён мае рыбнае вока*
*я выцягваю яго рукамі*
*і адпускаю спружынай*

*маючы падобныя фізыялягічныя*
*здольнасьці я выдыхаю ў мікрафоны*
*тысячы гукаў Гэта безумоўна*
*зьвяры*

*яны кусаюцца*
*яны нагадваюць дзікабразаў*
*маючы на ўвазе самазабойствы*
*я папярэджваю —*

*бараніцеся!*

## ПРЫЗНАНЬНІ МАЙГО ПРЫДЗЬВЕРНІКА

Ты мне прызнаўся ў забойстве сусьліка. Ты плакаў. З вачэй выпаўзалі карункі смалы. У кубках замест кавы стагнаў мазут. Стол перасякалі доўгія прусакі. Іх крыльцы сьвяціліся алеем. Я клеіў

паштовыя маркі. Ты плакаў. Сусьлік, падла, цябе дастаў. Ён згрыз усю тваю моркву й капусту. Усю! белую сакавітую ежу! І чырвоныя ступялі морквы ён трушчыў белымі зубамі, а ты захлынаўся сьлінай. Капуста — якая гучала венамі — зьнікала, быццам у горле пыласоса. Я разумею цябе. Твая квадратная галава выбухнула чорным бунтам. Твая лысіна, якая заўсёды была замёрзлым полем, хутчэй паліравала паветра філязофіяй думкі, чым магла змагацца зь несправядлівасьцю. Але бунт нарадзіўся. Нават у самыя непрадказальныя моманты, нават у самых дзікіх мясьцінах адбываюцца надзвычайныя рэчы. Ты задушыў сусьліка. Ён хрыпеў і адчайна біў лапкамі. Ты быў няўмольны і націскаў на пяшчотнае горла зьвярка да гуку стрэла шампанскага. Да хрумстаньня сухарыкаў. І ты заплакаў. І смальта вачэй сусьліка зьлілася з тваёй. Я разумею гэты садысцкі ўчынак. Бо даволі часта жорсткасьцю адказваюць менавіта на дабро. Даводзіцца лічыцца з рэчаіснасьцю.

## АСНОЎНАЯ СЮЖЭТНАЯ ЛІНІЯ АБО ЧАРГОВАЯ ПРЫСТУПКА ТРАПА

Існуюць трапы рознай даўжыні, шырыні. Яны робяцца з розных матэрыялаў. У кожнага трапа прыступка можа быць своеасаблівай. Рэльеф, іржа і г.д. Ня кожная лесьвіца вытрымае чалавека, ня кажучы ўжо пра сусьліка... І не заўсёды трапы маюць пэўную завершанасьць — у гэтым выпадку яны моіуць не абрывацца, а цягнуцца да бясконцасьці. Бо завершанасьць самалётам або параходам — гэта надта ідэальны варыянт для садамазахісцкага героя дадзенага раману.

## ДРУГАЯ СЮЖЭТНАЯ ЛІНІЯ АБО МАЁ БУДАВАНЬНЕ КАХАНАЙ

Я ўвайшоў у тваё жыцьцё пад трымценьне вагоннага шкла, пад гудкі паравоза. Аіхтары станцый зьнікалі імгненна. Здавалася, што цемрач, якая існуе за фіранкамі купэ, вынішчае пах інжыру і яблыкаў. У тваіх горных краявідах з адценьнем мармуру я праклаў архітэктурныя масты й выклаў брукаванкай дарогі, але галоўнае, піто сярод гэтай усходняй прыгажосьці я зрабіў першую лінію мэтрапалітэну.

**ПАЛАТНО СА СТАКГОЛЬМУ**

Я люблю пракладаць новыя лініі мэтрапалітэну ў розных горных і пустэльных ляндшафтах. І гэта ня проста хобі. Значна большае. Я ствараю новыя сусьветы творчасьці. Сынтэз выяўленчага мастацтв?.. і прыгожага пісьменсгва. Так, менавіта. Крыкі крамных гандлярак і навуковых мадоннаў, лаянка прыбіральшчыц і мурканьне сакратарак. Гэта пыл не$^{\text{г}}$граў! І зразумець падобнае дадзена ня кожнаму. Плыць толькі ракой інстынктаў я лічу паскудзтвам. Проста кожная жанчына — гэта палатно, над яісім часта ўзьнікае жаданьне папрацаваць. Іншая справа — што з гэтага атрымліваецца.

**ФАШЫКАЎ НА ФАРШ!!!**

Не люблю флегматычных сусьлікаў. Гэта ня рыба й ня мяса. Не капуста й ня морква. Не гарбата й ня кава. Гэта — як нейкая сусьлікавая мэдуза. Так адна падобная сволач заплыла да мяне вечарам. Нажэрлася на халяву. Выпіла ўсю крынічную ваду. Дыміла марыхуанай. Потым мяне аблаяла з ног і да вачных тунэляў. Я сядзеў у фатэлі, вузіў свае разумныя вочы, усьміхаўся паловай твару і хацеў свой курх выкарыстаць у якасьці кастэта. Бо не люблю некаторых выблюдкаў. Бо не люблю правільных дэбілаў. Анархія павінна быць як сродак выратаваньня, а не наадварот. Гэта — закон гарадзкіх джунгляў. Таму я пералічыў на сваім курху ўсе косткі, адпаліраваў іх бруском і... У цэнтры флегматычнага сусьліка, там, дзе яюная аўра, быццам пена, я зрабіў клявіятурную панэль. Я-ха! Як цудоўна біць плястылін!

**ВЕРШ БЯЗ НАЗВЫ**
**БО БЭЗАВЫЯ ЗЭБРЫ**

*адпілі пенапляставы дзень*
*зноў схапіў мяне за горла*
*я — алень*
*зьмеяў рукамі не хапаюць*
*гэтыя карункі пах маюць*
*карона на маёй галаве*
*кожны зубчык быццам лязо*
*брытвы на зоне трупы*
*да самай да Ямайкі*
*да самай майскай крыві*

*я ўжо раззлаваны!*
*у вочы вам лавандубаму!*
*усіх на будоўлю савецкага БАМу!*

## АД ТРОНА ДА ТРУНЫ СЬЦЯЖЫНКА АТРУТЫ

Я зноў ляжу ў труне. Колькі можна?!! Дастала! Прэч паэтычнае сала! Тут цесна! І мала кіслароду! Мяне не задавальняе пэнал, як спадара Бахарэвіча!

Гэта толькі яму патрэбная гэткая кватэра! Прэч, вычварэнцы! Тут драўляныя дошкі ды цьвікі колюцца! Трунары, сукі, сваю працу дрэнна выконваюць! Я ня ёг! Я па шкле не хаджу! Тут сьвятло праходзіць праз шчылінкі! Гэта горай за краты! Свабоду!!!

## МОЙ ВЭЛЬВЭТАВЫ ПІНЖАК

Патрапіўшы на працу ў сбп, я атрымаў калоду картаў, дзе былі ня толькі сябры, але й ворагі. Прычым першых было значна менш, чым другіх. Таму ў маёй афрыканскай шафе стаіць кулямёт. Усе мала дыя сусьлікі, якія трапляюць на маю кансультацыю, зазвычай паміраюць. Я запіхваю наведніка на падваконьне ды на фоне дрэваў і сіняга неба працінаю кулямі. У гэткія хвіліны я адчуваю пад рукамі не кулямёт, а цыравальную машынку. Бывае, акрамя маладых сусьлікаў да мяне наведваюцца і старыя. З гэтымі трэба сябе паводзіць больш асьцярожна. Бо іх, як кажуць, мёдам не заб'еш. Ледзь што — яны адразу хапаюуца за мае горла. Гэтыя падазроныя ва ўсім. Гэткіх трэба ня проста абаяць, але і апаіць. Бо інакш гора будзе. Э. Эх. Мая цыравальная машынка!.. Трэба зрабіць сабе вэльвэтавы пінжак!

**ДРУГІ ТРАП,**
**або новы раман да паднябеснай вежы**

1.

Паэзія. Яна перасьледуе мяне на кожным рагу. Нават сярод прыступак трапа. Я сустракаю рознае. І, безумоўна, я адпіхваюся. Б'юся. Але мая прасьпіртаваная паэзіяй душа супрацiўляецца, таму й сусьлікаў я забіваю пяшчотна. Кожны раз з асаблівым вычварэньнем.

Прыгадваю, як у Доме літаратара падчас прыезду Рымы Казаковай на сцэну выпаўз тоўсты бурундук. Праўда, па ягоным купрыку было бачна, што рабіў, гад, пластычную апэрацыю. Насамрэч быў бурундук зусім не бурундуком... Сусьлік! Не схаваешся ад пракуратург.1, хер сусьлікавы! Тэты псэўдабурундук крывіў сваю пысу, падымаў часам правы вус, а часам левы. Нібыта рабіў зарадку. Псэўдабурундук жэстамі прасіў мяне прынесьці графін з вадой. Гледачы варочалі галовамі, як псэўдабурундук вусамі. Яны ўсё чакалі маёй рэакцыі. Я нешта нашэптваў Кісьліцынай, якая карэжліва страляла вачыма. Адразу зразумела, што побач крытык!.. Зброя пры нас. Пры нас. А псэўдабурундук пакерхаваў. Зрэдку сумна адхарквaў, неяк нярадасна курчыўся. Да яго па чарзе падпаўзалі выступоўцы-сусьлікі — цiснулі ягоную *паважную* жоўтую лапу ды зачытвалі нейкія пасквілі. Я глядзеў на гэты спэктакль і раптам уявіў, як да сусьліка падыходзіць мой знаёмы драны сусьлік і дорыць небараку графін з вадой. Які ўчынак! Брава! Усе радасна віскаюць. А псэўдабурундук калмаціцца венікам і задаволена рохкае парсючком. Не! Драны сусьлік на. падобнае ня здатны. На жаль, як і я. Бо я ванну прымаю штодня. Ша!

2.

Мне надакучылі гнілыя мастацкія тусоўкі! Літаратары, мастакі і ўсялякая шушамець акрамя пляткарства і пляваньня ва ўнітазы на сходках нічога ня робяць! Поўнае друхло! Мне хочацца ванітаваць! Мяне дасталі гэтыя чмутловыя мэтры, якія разважаюць аб прафэсіяналізьме! Задыхніцеся — я профі! Я — цэнтр сусьвету! Мае карціны і кнігі — гэта вечнае! Мне непрыемна пераносіць снабісцкае сьмярдзеньне пра навучальны працэс! Ды клаў я хрэн на ваш працэс! Я й бяз вашых акадэміяў напінту алеем сваю музу! І гэтая кніга можа быць мачалкай з шыпамі на вашых сальных плячах! Каб атрутныя голкі вывелі вас да калодзежа маіх ведаў! Ша!

Так здарылася, што мне запрапанавалі прадаваць мае карціны ў Нямеччыне. Я, натуральна, як вядомы хвалькун, пачаў усім пра гэта

казаць. Бачылі б вы гэтыя перакручаныя зайздрасьцю пысы. Яны шыпелі, выцягвалі джаламі чырвоныя язычкі, талупілі мярзотныя акунёвыя вочы. Ша! Лёс у чарговы раз кінуў мяне на алтар шчасьця! Бо геніяльнасьць майго мысьленьня ачароўвае навакольную прастору! Вы пра гэта і ня думалі, подлыя мымры й мымрыкі?!! Атрымайце, сукі!

3.

Мастацтва неабсяжнае, як космас. Каб яго ахапіць, трэба быць геніем або вар'ятам. Ці першым і другім, бо геніі часьцей за ўсё вар'ятныя, а вар'яты — геніяльныя. Гэтак і хочацца ў дадзеным кантэксьце спалучыць генія з геніталіямі. Настолькі сытуацыя вымагае брутальнасьці. Таму мяне проста калоціць ад няздарнасьцяў, што лезуць на творчыя абсягі. Так, на сваю афрыканскую галаву, я неяк рэкамэндаваў вусатага псэўдабурундука для Нямеччыны, дык ён, сакэ разбаўленае, вырашыў скарыстаць маю рэкамэндацыю для Швэцыі. Ша! Сволач! Печыва качалася рудымі шынамі перад маімі вачыма і высьвечвала пукатыя партрэты манархаў. Я выцягваў руку над лакіраваным мурынскім сталом ды гістэрычна барабаніў фалянгамі па каламары.

Швэцыя — краіна, дзе я паядаў курыныя яйкі памерам са страўса, піў віно XVIII стагодзьдзя, лаяўся і пужаў фэміністычных жанчын! Мая сьліна смачна кропала з валадарных вуснаў, а сківіцы аўтаматычна рухаліся, быццам цягнік на трасе Зямля — Марс.

Я не жадаю пускаць у Швэцыю беларускіх бурундукоў і суськікаў! Ня трэба псаваць жывую мару літаратурнымі экскрэмэнтамі!

У вузкім, як траншэя, калідоры Дому літаратара перад груваснкімі дзьвярыма кіраўніка я злавіў псэўдабурундука. Ха-ха. Я задушыў ката! Нельга гадам качацца на кітах! Стакгольм — для абраных! Секчы варожыя кілаты!

4.

Мой лоб тут спыніўся. У гэтым перакрыжаваньні снайпэрскага прыцэлу. Я нарэшце знайшоў свой шлях. Мяне не спыніць. Я заяўляю, што вечнасьць — гэта імгненьне, імгненьне — гэта вечнасьць. Гарох падае на талерку, як зоркі зь неба. Кожнаму зьвярку марыцца быць зоркай. Але ня кожная камета трапляе ў цэль. Па воку падсьценкам!

**5.**

Ад сусьлікаў, напэўна, не пазбавіцца. Гэтыя дакучлівыя стварэньні пладзяцца, як мушкі дразафілы. Немагчыма вынішчыць усіх гадаў з плянэты Зямля. Я тэта, разумею. Таму й сяджу каля

эцюдніка й крэмзаю крывёй маленькія карцінкі. Будуць заўтра новыя памінкі. Я буду рэзаць свалачэй фінкай.

6.

Нядаўна я быў у грамадскай лазні. Бо я аматар пары, веніка і тазіка (калі ласка, толькі ня блытаць з паганай кнігай "Тазік беларускі"!), і таму запрашэньне наведаць парыльню прыняў ахвотна. Але я памыліўся. Ня трэба было церціся мылам. Усе гэтыя суслікі хацелі адно гарэлкі. А некаторыя наагул зацыкліліся на марыхуане з прастытуткамі. Уявіце ружовую прымадонну, плечы якой не праходзяць у праём для дзьвярэй... І за ёй бегае лысы суслік, з наздрынаў якога ідзе дым!.. Ша! Таму я запусьціў акулу ў басэйн, каб яна кусала гідкіх зьвяркоў. Крыкі й кроў напоўнілі лазьню. Я пьцягнуў вялікі пэндзаль са свайго амэрыканскага заплечніка і з асалодай мачаў яго ў гэтую прыродную фарбу. На сьцяне, побач са сталом, дзе дыміліся люлькі з марыхуанай, я намаляваў птушку, якая абтрасае апаленыя пёркі.

**7.**

У гэтым калідоры дзесяць тумбаў. Я перацякаю бальсанам па сургучовай сьцежцы ды раблю сякерай засекі. У кожнай тумбе сядзіць суслік. Я не расчыняю дзьверцаў — мне дастаткова зірнуць у шчылінку. Вялікае вока зьвярукі — найлепшы індыкатар майго здароўя. Бо па злоснасьці бляску ў маёй крыві рэгулюецца колькасьць эрытрацытаў. Гэта, безумоўна, неверагодна — але факт. Я не сьпяшаюся — я атрымліваю асалоду. Калідоры асьвятляюцца ліхтарамі, што шчэрацца сеткай. Плямы ад ліхтароў падаюць паўсюль амбразурамі. Мая сякера блішчыць люстэркам. Я раблю акопы на тумбах. Магчыма, сёньня скончыцца мае жыцьцё наглядальніка. Я гэта прадчуваю. Таму й не сьпяшаюся. Мне хочацца апошняга сьвята.

8.

Я зь цяжкасьцю дыхаў. У бэтонным горадзе мае лёгкія праціналі трасы інфэкцыі. Кожны раз, калі я апранаў сваё паліто садыста, па пальцах танчылі сутаргі. Мне даводзілася весьці ўнутраную барацьбу з комай.

На вулічных ліхтарах віселі суслікі. Іх лупатыя вочы глядзелі зь нейкім жудасным пытаньнем. Лімузыны гулі халадзільнікамі ды выкідалі ў паветра шлангі хомару. Я грукаў ботамі па касьцяным тратуары і разважаў пра сэнс існаваньня сусліка...

— Вы памыляецеся, — сказаў ше тоўсты сусьлік, які выпаўз з мэтро. — Сусьлікі — гэта мікробы чалавецтва, якія рэгулююць творчы балянс. Вяз нас вы даўно б зьніклі. Таму нас трэба цаніць і песьціць.

— У нечым вы маеце рацыю, — пагадзіўся я. — Але колькі ад вас мярзотнага паху... Сьмярдзіце гэтак моцна, што без супрацьгазу немагчыма перамяшчацца па гарадзкой мясцовасьці.

— Ня варта нас забіваць, тады й сьмярдзець ня будзем.

— Не перабольшвайце.

У кішэні я намацаў сьвінцовы кастэт. Каб сонца на небе не ператварылася ў бронецягнік, а дрэвы варушылі лісьцем... трэба зьменшаць колькасьць сусьлікаў!

Насупраць крамы "Жако", якая знаходзіцца побач з паркам Горкага, я забіў сусьліка. Рука вылецела з кішэні тамагаўкам і прайшлася па галаве сусьліка скальпелем. Індзейцы з племя Чэрокі мяне віталі! Сусьлік не паспеў і вокам міргнуць, як ягоная подлая душа адляцела на неба.. Ша! Я люблю рэзаць батон!

**9.**

Прэзэнтацыя "Анталёгіі беларускай паэзіі" ў перакладах на баўгарскую, што праходзіла ў Доме дружбы, пасекла прастору паразуменьня паміж рэалістычным і постмадэрновым. Я думаю, што мае творы зрабілі ў мазгах чыноўнікаў дробную рэвалюцыю. Але гэта супакойвала. Мая агрэсіўнасьць апляла мікрафон і выбухнула фаервэркам. Ша! Усіх сусьлікаў у Баўгарыю! Там добрае віно! Яны будуць падыхаць алькаголікамі! Параноікамі! Усіх пасадзіць у каноэ!

Мае творы былі дырыжаблямі! Вакол была дэструкцыя штампаў!

10.

Свой новы партрэт, зроблены Акулавым, я абмыў крывёй страўніка! Раніцай, калі вецер гуляўся ружовымі фіранкамі на вокнах, калі я запускаў бурбалкі на парашутах, калі неба плакала зямлёй, прыйшлі мастакі. Яны не мармыталі — крычалі пра цыроз пячонкі й шкілета! Я сустрэў іх радасна! Менавіта таму я й атрымаў бадун пад вечар! Але партрэт ня ў стылі рэтра — эксітрэсія й валасы Вішнёва мэтра!

**11.**

Я мылам з цукрам труціў сусьлікаў. Я выцягваў сваё эга з куфра і загортваўся ў яго, каб сагрэцца. З дрэваў ляцела апошняе лісьце. Ты да мяне прыціскалася. Я цалаваў цябе стамлёна ды прыгадваў верш Ігара

Севяраніна. Мае рукі акрэсьлівалі твае шаўковыя прасторы. Ты ўсьміхалася сьняжынкамі. Нараджаўся верш Зьміцера Вішнёва.

12.

Вера — сумнае і вясёлае, прадказальнае і непрадказальнае. Мая вера ў вынішчэньне сусьлікаў з кіруючых пастоў у нечым сьветлая і ў нечым незьдзяйсьняльная. Ды можа, здарыцца "неспадзяванка"?.. Гзта — нібыта нечакана моцны кайф ад рыжскага бальсану. Чакаеш аднаго, а прыходзіць іншае — хадою рыцара. Ты спрабуеш абараняцца — і нічога. Толькі рыжскія сьвятлафоры рэгулююць рух. Дзяўчаты ясамонліва падымаюць ножкі. Рысункі іх панчохаў паралізуюць думкі. І ты баявым канём імчышся на новыя прасторы палёў!..

**13.**

У Латвіі я перапужаў усіх латышоў. Так, у рыжскай галерэі "Нуас" я запоўз у кетчуп. А потым, булькаючы, высьлізнуў. Я выклаў зь яек адбітак свастыкі наадварот. Ша! Мой пэрформанс "Рэінкарнацыя дыктатара" аказаўся катарактай для гледачоў. Усе церлі вочы, а я паядаў латышскія курыныя яйкі! Я скінуў за борт "Нуаса" нейкую мауку, і тая там раўла сукай! Чырвоны і склізкі, я здох у шэрай камэры карабля. І тыя, хто мяне цягнуў, атрымалі вялізныя шнары па ўсім целе!

**14.**

Рэанімацыя цела прайшла нармальна. Яго выкацілі ў палату на насілках і пасыпалі мукой. Чалавек заварушыўся, закашляўся і сказаў: "Я — не Вішнёў. Я — вішнёўка. Часам Астап. Зрэдку гарэлка .

Лекар падышоў да. пацыента і цюкнуў яю малаточкам па лбе. Пад марлевай павязкай лекара хаваўся таварыш Сін.

**15.**

Пакруці вачыма. Тут каля бочкі. Тут каля купіны. Бегае зграя сусьлікаў. Гэта абраза. Абразы гавораць пра вечнасьць. Пацягні загвоздку на гранаце. У гэтым месцы будзе стаяць мармуровы помнік. У чацьвер не прымаюць да фэльдфэбэля. Пан нажэрся. Сьвіньні лепшыя за сусьлікаў. Ша!

16.

У Латвіі штораніцу мы адкаркоўвалі пляшку віна. Ад рыпу корка на сваім ложку пачынаў варушыцца таварыш Сін. Ён ажываў. Кашляў. Пляваўся. І зь цягам часу расплюшчваў адно вока. Ягонае

другое вока прачыналася пасьля першага тоста. На стале ўзьнікаў п'яны абрус з сотамі.

У нашых страўніках плавілі золата.

**17.**

За сталом насупраць сядзіць курыца. Злоснаязлосная. Гішпанская курыца. Квокча. Крывымі пёркамі варушыць і п'е каву. Навошта яе пусьцілі на працу да пісьменьнікаў? Напэўна, каб несла яйкі. Бо паэт бязь яйкаў, як слон бяз хобата. Курыца толькі й робіць, што чакае званка свайго пеўня. Сумуе курыца. Хочацца ёй сьвята. А мне марыцца яечня. Ша!

**18.**

Я падрыхтаваў выставу шэдэўраў. Я мэтадычна працаваў некалькі месяцаў над гэтым мастацкім швэдарам. Мае рукіператварыліся ў пэндзлі. Пальцы сьлізгалі па структуры кратаў палатна і рабілі для вусякоў хаткі. Дымок ішоў з комінаў, і нараджаўся туман чарадзейства. Сьцяжынка паветра з балькону разганяла наркатычны пах фарбы. Да маіх далоняў дакраналіся жырафы.

Праз фіранкі на мяне глядзелі вочы каханай. Я страляў у іх з нагана. Мяне не спынялі нават злосныя крыкі дыктатара, які сядзеў у японскім Нагана. Я ствараў новую карму. Я зьнішчаў муку. На фарбу я накладаў ільняны алей. У перапынах паміж размовай з вусякамі я паядаў селядца філе. Нават Маякоўскі і ягоны ЛЕФ у гэткія хвіліны мне былі да фені! Ша!

**19.**

Я зноў ішоў праз мост. Сёньня зранку зь яго ўніз скочылі пінгвіны. Яны разводзілі крыльцы ў бакі, піскалі ды звальваліся ўніз маленькімі запечанымі булачкамі. Ха-ха. А ўчора аднаму мудаку я цюкнуў у вуха, і ён зваліўся на дно траншэі. Так і трэба яму, хапугу. Я бараніў сваё пасьведчаньне літаратурнага кансультанта. Я пракансультаваў ягоныя мазгі сваім талентам! Я здаў яго ў'мянтоўку! Там мудак шчыліўся вінтоўкай. Урэшце, мяне ж ледзь і не застрэлілі. Я лаяўся па-беларуску. Да балкама абсекчы твае кілаты!

**20.**

Чацьвертыя суткі я бег воўкам па бэтонных прасторах Менску. Рукі ўжо балелі, па нагах чарвякамі поўзала кроў. Сонца, расьціснутае панэльнымі хатамі, дымілася падгарэлым блінам. Я не зьвяртаў увагі на гэтыя акалічнасьці й працягваў паюню. Дробны сьмярдзючы

сусьлік з прыёмнай камісіі савецкіх бульдозэраў і пілаў сьцягнуў таварыша Сіна. Зьвярок, напэўна, ужо таксама крыху стаміўся, бо цяпер перад маімі вачыма скакаў ягоны маленькі потны азадак. Я нават заўважыў больш дробныя дэталі: сутаргі вушка і г.д. Таварыш Сін спрабаваў яшчэ супраціўляцца, ён выкручваўся, але з гэтага. нічога не атрымлівалася. Драпежная жывёлінка біла яго па галаве лапай і бегла далей, Я чуў стогны таварыша Сіна, ягоную лаянку: "Сука каратканогая! Вырадак, адпусьці вольнага літаратара! Я супраць кулістых саўдэпаўцаў!" Няшчасны. Трымайся. Зьмій ужо на падыходзе.

Гадзіньнікі пераходзілі ў стан тэрмомэтраў. Стрэлкі выпучваліся ды зьмянялі колер. Рэле шчоўкала, і лічбы прымалі форму ролікаў. Я глытаў смажаных конікаў і пляваў у кубак атруту для караля сусьлікаў.

21.

Ня ведаю чаму, але мне шанцуе на сьцерваў. Так, адна мая сяброўка — самая сапраўдная мэгера. Неяк на творчым уздыме я патэлефанаваў ёй пахваліцца... Вы б чулі, як гэтая гадзіна ўзьвілася!.. Ну, дык вядома, у яе мужа карціны за столькі не купляюць.

Па сваёй наіўнасьці я слаба яе кусаў. У наступны раз загрызу суку! Ша!

22.

Людзі — гэта ракавая пухліна Зямлі. Усе катаклізмы вакол нас — гэта алергічная рэакцыя на чалавечую цывілізацыю. Я веру, што некалі наступіць пэрыяд аздараўленьня. Няхай гэта будзе і праз мільён гадоў. Тады лёгкія Зямлі павалі выпусьцяць магму і вочы азёраў засьвецяцца асятрынай.

**23.**

Ну, вось, ляжыце. На халеру? Вам што, дрэнна было шпацыраваць? Выцягнулі свае ручкі, галовы ўзьнялі ў апошнім рыўку. Э. Эх. Бедалагі. Бахарэвіч, Сін, Барысевіч, Морт. Чацьвёра няшчасных. Пажаўцелі. Напэўна, мала кіслароду. Вы ўжо музэйныя экспанаты, даражэнькія. і ня трэба спрачацца. Я сказаў. А Морт, якая мушка. Вусны выцягнула трубачкай. Нібыта марыць жыць у вечным пацалунку. Заляжаўся ён, гэты пацалунак. Скруціўся, спапяліўся. А Сін — дык гэты нібыта ў вечным пэрформансе. А Бахарэвіч накшталт ёга — ляжыць на бітым шкле. Што да Барысевіча, дык ён і раней спаў. Самы натуральны выгляд. Ляжыце-ляжыце. Хутка прыйдзе жук з атрутным джалам.

**24.**

Арганізацыя "Сёмая грань" запрасіла мяне ў Віцебск. Гэта поўная недарэчнасьць — бадуновая раніца! Мяне-канцэптуаліста хацелі запхаць на тэрыторыю дзіцячага капусьніка! Ха-ха. Ні фіга. Я не паддаўся на гэтыя варожыя правакацыі! Я хадзіў паміж дзяцей і раскідваў вершы. Ешце паэзію! Я адмаўляюся ад крывавага. пэрформансу! Я не Кабаса, і дзяцей не паглынаю! У мяне для людажэраў ёсьць жарт сьлюды! На мне грымелі бомкі. Галава сьвяцілася німбам. Афрыканэры хадзілі за мной збраяносцамі — яны цягалі яйкі, тазікі й кетчуп. Не! Я не хацеў яечні! Мяне дасталі рэінкарнацыі! Я рыхтаваў карны атрад фэрмэраў! На палатне гучаў фаервэрк.

Лізаць табе патарчаку!!!

25.

Бахарэвіч афігеў! На мой дзень нараджэньня ён разьбіў шкло ў пад'езьдзе! А нядаўна, калі кватэра Вішнёва. развальвалася ад крыку афрыканскіх дзяўчатак, ён зачыніўся на кухні й пачаў рэзаць свае тоўстыя шлянгавыя вены! Кухня загрымела цягнікоm мэтрапалітэну. На сьценах кашляла чырвоная вадкасьць. Газавая пліта плявалася паходняй.

Я падкраўся да дзьвярэй кухні і злосна прашыпеў: "Падабаецца?.. Пада-ба-е-цца?.." "Не! Н-е-ее!!!" — зароў Бахарэвіч і ляснуў курхам па шкле дзьвярэй. Ба-бах!!! Аскепкі праляцелі тайфунам па кватэры. Я схаваўся на бальконе. Бо злосны й п'яны сабрат па тусоўцы бегаў па кухні і махаў вялікім акрываўленым нажом. Дзяўчаты сабраліся ў куце канапы і дрыжэлі сусьлікамі. "Не! Не-е-е!!!" — насіўся паўсюль шалёны крык. Я сядзеў за барыкадамі і разважаў пра Нямеччыну. Э. Эх. Не хапае табе тамтэйшага выхаваньня, Альгерд.

**26.**

Пасьля перапою лепш за ўсё прыняць душ і папіць ліманаду. Кожны раз, узяўшы замнога чарак, я заракаюся больш ня піць. І нічога не атрымліваецца. Не таму, што я алькаголік. Не. Мяне ня цягне піць. Спакушае размова ды жанчыны. Чарка аб'ядноўвае. Яна стварае ўмовы для філязофіі. Няхай і п'янай.

Раю ўсім філёзафам замест чаркі гуляць у даміно альбо ў бадмінтон. Альбо... душыце сусьлікаў. Няма нічога больш прыемнага за забойства варожых зьвяркоў. Я заўважыў дзіўную рэч: так, падчас сьмерці сусьліка мне прыдумляюцца мадэрнізаваныя камэры допыту. Я-ха! Вось яна, філязофія садызму!

**27.**

Такое ўражаньне, што я сам правакую раман на сюжэтныя перапляценьні. Сёньня прыгадваў выпадак са шклом і Бахарэвічам. Бо ўсё гэта разыграў я. А ніхто і не заўважыў. Ша! Як цудоўна быць драматургам! Я выводжу на шпацыр дога! Усіх віншую з новым годам! Будзе вам садысцкая догма!

**28.**

Мы зьмяняем свой лес з кожным імгненьнем, з кожнай хвілінай. Любая недарэчнасьць ламае ня толькі настрой, але й сцэнарны плян нашага жыцьця. Спазьняючыся ў патрэбнае месца, і ці то на сустрэчу зь сябрам, ці то на працу, мы робім вартыя карэктывы свайго жыцьця. Так, я даволі часта не прыходжу на сустрэчу своечасова, бо лаўлю імгненьні. Я накшталт натураліста бегаю з сачком за рознымі матылысамі. Дзяхсуючы гэтаму я, напэўна, даволі сур'ёзна расквеціў свой лес. Бо ня будзь гэтых спазьненьняў — не было б і пэўных цікавых знаёмстваў, уражаньняў. Так — я згодны, што я пазбавіў сябе іншых знаёмстваў. Бо, ішоўшы на пяць хвілінаў раней, я быў здольны сустрэць іншую сваю музу. Але смак жыцьця ў непрадказальнасьці. Разьняволенасьць і пэўнае раздзяўбайства дае магчымасьць марыць, і тады пачынаюць спраўджвацца нашыя самыя патаемныя жаданьні. Я аб'яўляю вайну пунктуальнасьці! Бо яна выпрацоўвае ў чалавека мэханічнасьць робата, яна спрашчае мазгі да ўзроўню матэматычнасьці! Я за. рамантыку! Я супраць таго, каб нашым лёсам кіравалі чыноўнікі! Я за свабоду жыцьця! Я не хачу,. каб чыноўнікі выбіралі мне жонку і прыступкі кар'еры! Лепш ляцець галавой уніз у кар'ер! Усіх вас на абед да тэр'ера!!!

29.

У мяне горлам пайшла кроў паэзіі. Я сядзеў у галерэі "Nova". Побач у абліччы Мао Цзэдуна мамрыў Буль Жы. Я жвакаў паэтычныя пернікі й пляваў крывёй на жабаў. На сцэне сядзеў Разанаў і накшталт манарха трымаў скіпэтры літаратурнай улады — жалеза й камень. Ягоную галаву асьвятляла полымя. А я сядзеў на апошнім радзе залі і пракладаў дарогу вадзе. Ша! Чуеш, чытач, якім шляхам рухаецца мая скіпідарная думка? Калі пяюць дытырамбы сотам, ня варта забывацца і на пчолаў.

**30.**

Адзін крытык мяне пакрыўдзіў: сказаў, што я ніхто, і паслаў мяне на хер! Я гэтага крытыка абазваў патолягаанатамам — інакш кажучы:

адзін паталягічны атам! Варушыцца селядзец на бліскучых костках літаратуры і сваім скепсысам псуе настрой паэтам. Ха-ха. Я напісаў праўду. Усім ворагам задыхнуцца ад поту! Крытыкі — гэта наш невылечны боль. Даруйце. Я не напісаў пра Лёлека і Болека. Таму я глытаў анаболікі. Сёньня здох часопіс на роліках!

**31.**

Уначы я зрабіў карціну два на тры мэтры. Я шчыліўся ясоўтымі тыгровымі зубамі, скакаў, быццам кенгуру, і махаў рукамі, як вар'ят. Пэндзаль лётаў нахабным насякомым, ягоны хабаток пляваўся ядам. І на палатне пачалі кпітнець цудоўныя піраньні. Я-ха! Мае эга села на трон кайфу! *Fuck you!* Пад піраньнямі я намаляваў сем вялізных чырвоных лічынак, кожная зь якіх сымбалізавала душу патолягаанатама! *Fuck you,* савецкія крытыкі!

**32.**

Сэксуальных маньякаў трэба кастрыраваць і запіхваць у пакой сьмеху. Каб яны бачылі свой выгляд у люстэрках, хадзілі кругамі і... паміралі ў вясёлых сутаргах. Ня ведаю, ці гэта гуманна, але ў нечым справядліва. Саджаць у турму іх нельга. Бо гэта надта лёгкае для іх выйсьце. Праўда, часам гэтую праблему вырашаюць зэкі.

Сэксуальных маньячак варта саджаць на ланцуг і пакідаць у адзіноце з дубам. Думаю, што іх галава будзе пакрывацца лісьцем думак, бо дрэвы часам разумнейшыя за людзей і могуць нашаптаць шмат добрага. А ўрэшце, варта ўсялякіх гэткіх пераносіць на нейкую выспу — няхай ствараюць новую цывілізацыю. Іх магчымыя дзеці зробяць лепшыя ўчынкі й крыху рэабілітуюць сваіх бацькоў. Праўда, шкада тамтэйшых індзейцаў.

**33.**

Курыцы не пужаюць — яны раздражняюць. Мне здаецца, што нават сусьлікі лепшыя за іх. Сусьлікі, прынамсі, ня кажуць глупства. Рабіць дрэнь і казаць дурноту — што лепш? На мой погляд, адмоўнае суседнічае са станоўчым. Абыякавасьць і тупасьць — вось самае страшэннае. Рогат і слёзы — цудоўныя рэчы — з налётам элітнасьці. Я давяду вас да стану шаленства! Шаманы вечныя!

34.

Муміфікацыя ў сучасным мастацтве — гэта ня проста актператварэньня нечага ці некага ў мумію — гэта гвалтоўнае стварэньне

паралельнай прасторы, дзе ўсе сымболі зьнішчаныя альбо зьняважаныя.

35.

Кампутар праглынуў палову майго раману. Фыркнуў і смачна адрыгнуў. Сука! Я стукнуў яго курхам! І потым доўга лаяўся. Крывавыя птушкі поўзалі перад маімі вачыма. Але зьмяніць нешта было немагчыма. На мачалках вочы чыноўнікаў. Праца дзесяці месяцаў засталася марнай. Я марынаваў сваю дэпрэсію ў кватэры. Карціны не пісаліся, вершы курчыліся ды кусаліся клапамі. А я прыгадваў начныя дэбошы з Зайцавым. Мы балявалі. Траплялі ў рэстарацыі. Адтуль сыходзілі, а потым у кішэнях знаходзілі попельніцы! Клептаманы, недабіткі!

Я пакутаваў. Ніякія п'янкі мяне не выратоўвалі. Попельніцы не весялілі. Я качаўся па сьценах раскручаным вэнтылям. Пакідаў на шпалерах сьляды наркатычнай ломкі. Полымя разьдзірала мой страўнік, і дым марыхуаны вырываўся на. паверхню, быццам з трубы паравоза.

Я быў перапоўнены адчуваньнем крэматорыю. У мяне было ўражаньне, што дзесяць месяцаў я працаваў трунаром — прымаў трупы і запіхваў іх у адну вялікую скрыню без усялякай надзеі на разьвітальную малітву. Мой выдавец Ігар Логвінаў сказаў: "Рукапісы не гараць — іх паядаюць вірусы".

**36.**

Мой кампутар, сука, напэўна вэгетарыянец — ён не вытрываў мяса. (Капуста, морква, сэльдэрэй, цыбуля, часнык, крон, бульба, фасоль і г.д. Усё гэта было марай майго электроннага сатрапа. Ён вякамі пляваўся дыскетамі і злосна грымеў вінчэстэрам. Але час насьпеў...)

**37.**

Я наноў пачынаю душыць сусьлікаў. Гэтых калічных зьвяркоў. Сусьлікі жывуць сярод нас. Прыгледзьцеся. Бывае, што й некаторыя нармальныя людзі на пэўны час ператвараюцца ў грызуноў. Да прыкладу, прачынаешся раніцай, падыходзіш да люстэрка і бац! Бачыш у люстэрку подлую сусьлікавую пысу. Той жа псэўдафатограф Палойкер, калі падыходзіць з бадуна да люстэрка, ляпае твар далонькамі ды сумна кажа: "Вуй! Зноў апух". У кожнага. свая карма. Як і свой камар у куце. Сваіх павукоў шкада. А кроў хатніх, як чакаляда. Абы пыл з кватэры не выносіць. Так-так.

38.

Ты напішы гэтыя словы на паперы. Стане лягчэй. Чый стан лячыць? Напэўна, танкі й чыфір. Можа, мы патранілі на рыфы? Не, няма тут аніякай рыфмы. Гэта на пальцах цацачныя сфінксы. Я паглынаю фінікі й кексы. Ды марыную суслікаў у кейсе.

39.

Бухгальтаркі некаторых ведамстваў ня носяць бюстгальтэраў! Гэта істотны факт. Надобны ўчынак абсыпаны карысьцю. Іх валасатыя рукі абрастаюць грашовай каростай! Я ведаю, як адна бочка падобнага кшталту перапаўзала ад стала да стала і ў дакумэнты заносіла хлусьлівы мазут. Потым у інспэкцыі адвальваліся мазгі. А гэтая сука надзявала каску і чысьціла ў сваім габінэце паркет! Супрацоўнікі пад вокнамі рабілі пікет! Хер! Яна ўсіх аблажала! Выставіла свае цыцкі й на ўсіх наплавала! Ша!

40.

Кампутаршчыкі дзёўбаныя дасталі! Вінчэстэры поўзаюць вакол пацукамі! Сукі! Я хачу выбіць іх зубы адкруткай! У вас усіх! І ў пацукоў, і ў кампутаршчыкаў! Сусьлікі пладзяцца разам зь вінчэстэрамі. Я вінт пяцілапчасты закручваю на кране. Атрутная вада не хавае свайго дясала. На маёй шыі крыжы ўкусаў. Я праводжу дэзінфэкцыю соўсам. Фіксажам і сапухай пасыпаю вірусаў. Але дохнуць усе. Кампутаршчыкі, вінчэстэры, вірусы й сусьлікі! На кусьціках вісяць іх сінія трупікі. Праўду казаў мой бацька: "Нефіг займацца глупствам. Варта думаць пра страўнік". Бо страўнік — генэратар ідэй. На бліскучую пустэчу клюе толькі дурны акунь. Нават ён патрабуе нечага, няхай і пустога, але са зьзяньнем. Мы кахаем ня проста вока, але й ягоны колер і блісы. Так, гады! Токам соўсу па вашых галовах!

**41.**

Выдаўцы таксама дасталі! На сталах даўно адно сала! На дно калодзежа падае адрэзаны нос сусьліка! На мне ў гэты момант халат, зь якога сыплецца моль. Я мылам разломваю лысыя горы. Гэта паміраюць вар'ятныя зоркі. Раю вам, чытачы, эміграваць з краіны. У Швэцыі выдалі мой шматтомнік. Там і жыву. Няхай і мазгамі. Затое тут мяне подлыя сусьлікі б'юць нагамі. Я супраціўляюся. Слухаю нейкую рапсодыю. Ад соды задыхаюся. Ванітамі выю! Адчуваю, як ноты скрадаюць выдры. Я з кішэні бяру кедравыя арэшкі. Гэта для смачнай курыцы, у якой галава — мёртвая шышка.

**42.**

Барадаўкі падобныя на соты, празрыстыя купалы. Яны прарываюць паверхню с куры, як вулкан, што выкідае магму. Яны тырчаць на пальцах маленькімі сопкамі. Яны аздабляюць белы фон цела цьмяным загарам нетраў. Я пешчу іх гарачай вадой ды памнажаю пры дапамозе салянай кіслаты. Споры разносяцца ветрам, як тысячы дробных аэраплянаў. На паласатых структурах далоняў я крэсьлю новыя пляны. Сьлюда маіх барадавак прыгажэйшая за ўсе пярсьцёнкі чалавечай цывілізацыі!

**43.**

Усьміхаешся. Расьцягваеш абцугамі свае мэльхіёравыя вусны. Напэўна, там, унутры тваёй галавы, сядзіць п'яўка. Ты хочаш працяць яе пікай. Але чача, якую я заліваю ўсярэдзіну цябе, перашкаджае гэтаму. Вакол нас шпацыруе п'яны маёр. Ён раве, што ты абавязаны выпіць яшчэ й ром. На карысьць Радзімы. Тым ня менш, ты рады. Ты не зьвяртаеш увагі на гэтыя загады, як на правакацыі радыё. Маёр красуецца сваімі чырвонымі лямпасамі. Ягоная чырвоная галава сьвеціцца лямпай. Нарэшце, ты працінаеш свой язык. Ён варушыцца схопленай гадзюкай. Ты дыхаеш сьмяротнікам. Я слухаю апошнія весткі з фронту. Ты з захлынаньнем ясарэш мяса і запіваеш яго чачай. Нашыя твары ахінае чырвонае прасьціраддла.

**44.**

Аўтобусы ў Беларусі — гэта бязногія буслы. Яны ня едуць — плююцца чорным дымам. Зрэдку яны некуды даязджаюць. І тады ты разумееш, што лепшага месца для сьмерці не адшукаць. Аніякай цывілізацыі — цішыня і спакой. Вакол адны балоты, і ты стаіш, адкаркоўваеш пузатую пляшку гарэлкі. Можа, расквітнее?

**45.**

Надыходзіць Новы год. Я рыхтуюся падыхаць. Труна ў хаце. Мне надакучыла існаваць хамэлеонам у ваце. Гэта крыху хмель, і ты на мелі. Пісьменьнікі коўзаюцца вакол храму калярадзкімі жукамі. Я душу іх дротам ад радыё, адкуль нясецца песьня пра сьветлы рыначны сацыялізм. Мне выказваюць сваё незадавальненьне. Хочуць мець маю галаву вэльвэтавую на сямейнай талерцы. Даводзіцца хавацца за тушкамі сусьлікаў. Ша!

**46.**

Я заслаў сваю фанатку-калекцыянэрку ў БДУ. Там у дубовай шафе-трубе. Недзе там. Аяжаў мой дыплём-раб. Яго пакінулі на даляглядзе мастацтва. Тады ў шырокіх калідорах была графаманская мастурбацыя! Бо Зьмій Віш зьняважыў сваё журналісцкае ткацтва. Ён заслаў ва ўнівэрсытэт дывэрсантку. Каб правесьці акцыю санітарную пры дапамозе касаткі. Сьвятло без нэону. Прэч, снобы! Дзьміце на рудніку! Я абкладаю ліхтары чарвякамі бруднымі! Ша! На слупы дурняў! Усе на плошчы!!! У мяне па панядзелках валасы рудыя!

І ня трэба лашчыць шчокі.

І ня трэба абвінавачваць мяне ў ляноце. Я й бяз вас пра гэта ведаю. Бо люблю спаць да дванаццаці раніцы. У ляноце ёсьць свая прывабнасьць. Я, наагул, цаню адзіноту і ляноту. Мне падаецца, што яны знаходзяцца ў адной прасторы. Дзякуючы ім я й спраўдзіўся як Творца сусьветнага маштабу. У стане духоўнага адлёту ствараюцца найлепшыя творы. Сядзіш за кубкам чорнай моцнай кавы і не сьпяшаючыся крэсьліш сымболі на палатне. Але тым ня менш, гэтыя рэчы непасрэдна зьвязаныя з працавітасьцю. Бо, як ні парадаксальна, бяз трэцяга кампанэнту першыя дзьве бездапаможныя. Толькі ў спалучэньні можна дасягнуць сапраўднага посьпеху!

47.

Пальцы скруціліся ў дзікім танцы. Здаецца, гэта — крэвэткі. Я прыглядаюся. Не!.. Гэта — адзін вялікі васьміног выпрастаў свае шчупальцы. У іх патрапіў сусьлік. Ён хрыпіць, чытае вершы, нешта крычыць пра свайго настаўніка Бугаёва. Аношні стаіць ды задуМенна пазірае на дзіўную сытуацыю. Я прыглядаюся да постаці пісьменьніка. Над ягонай. галавой вісіць партрэт Чыгрынава. Літаратары перакрыжоўваюцца духоўнай аўрай. Я чую галасы абодвух. Мне сумна. Бо тут жа ўтвараецца акт сусьлікажэрства. Прычым мне не шкада маленькага сьмярдзючага зьвярка, які паскудна вішчыць. Заслужыў, сволач. Нефіг выпендрывацца, нефіг прэтэндаваць на ролю вешчуна, калі на падобнае ня здатны.

Па маім ілбе цякуць сінія кропелькі поту. Я нясьмела бяру туманны кілішак гарэлкі й выпіваю за здароўе пісьменьнікаў. Так. За вызначэньне вечнага ў прасторы літаратуры.'Мяне разумеюць. Твары абодвух пісьменьнікаў расплываюцца і зьнікаюць. Застаюцца толькі васьміног і люстэрка.

Сьнег падае нясьпешна, і пад ім застаюцца трупікі ворагаў і сяброў.

**48.**

У Стоўбцах я быў літаратурным агрэсарам. Я быў для некаторых тупых выкладчыкаў прафэсарам. Я біў іх афрыканскай паэзіяй. Яны падалі, курчыліся і паціху адпаўзалі на вуліцу. Мясцовыя панкі й анархісты шпацыравалі вакол мяне са сьцягамі свабоды. Крычалі нямецкія маршы. Куплялі за апошнія грошы бутэлькі чарніла ды частавалі мяне. Ша! На некаторых дамах у Стоўбцах захаваліся мае аўтографы. Цяпер туды выязджаюць замежныя фатографы!

*але правгнцыйны фальш*
*фары асьбятляюць твар Рафаэля*
*граф ветлівы*
*ён любіць больш Рэмбранта*

*на ягоных карцінах квітнеюць*
*сьлібы і жаночы фарш*

*у галерэі выбух бра*
*усе здохлі мастацкія блядзі*

*ты — раб*

49.

Нажы крэмзаюць гэтае цела. Сьвінцовы прамень падае на твар зьбялелы. Вусны скрыўленыя, вочы выталупленыя. Нажы сьмелыя. Смала. Ніці крыві паўсюль. Нажы рухаюцца, не спыняючыся, — яны працуюць ужо над мёртвым чалавекам. Камяні. Аавіна. Чорнай ноччу паганыя сусьлікі забілі афрыканіста-паэта. Ша! На дне салёнага мора чытае паэмы тапелец! Ша! На маёй патэльні смачныя пальцы генія!

50.

У пераходзе мэтро — там, дзе плітка крышыцца і сьвятло разьбягаецца павукамі, — я сустрэў Шханаву. Я адразу яе пазнаў. Хаця яна й прыняла новае аблічча. Але каўшак захаваўся. 1 вочы захаваліся. Праўда, струхлела крыху. Ды нічога. Некалькі зубоў засталося. Ха-ха. Там, у пераходзе мэтро, я пабачыў яе подлыя ядавітыя ручкі, якія могуць пяшчотна трымаць сякеру мясьніка. (Вясна! Вясна!) Яна! Шханава! Яе ногі выцягнуліся і былі падобныя да Эйфэлевай вежы. У прасьвеце паміж ног я заўважаў узоры сваёй шашы.

51.

Я вырву зубамі ўсе гузікі на гэтых сініх джынсах. Дзяўчына стаіць у мэтро. Станцыя мэтро "Інстытут культуры". Я адчуваю кожны мілімэтр дзявочага цела. Адчуваю астральна. Мае пальцы ўжо паўзуць па рэльефе джынсаў і смакуюць дрыжэньне ног. Пругкае неба. Там я скрыжуюся. Паходняй будзем гарэць. Мой сябра мастак Каха неяк прызнаўся, што паміж жаночых ног павінна быць бачнае сьвятло, каб там пралятаў бэйсбольны мяч. Я згодны! Я праімчуся тут шайбай! Ты выгінаешся ў сваіх джынсах кобрай. Элястычная і прыгожая. Жаданая атрута. Напіцца. Здохнуць. Стрымацца немагчыма... Падысьці й запаўзьці пад тваю джинсовую коўдру. Шкло трымціць. На поручнях пагойдваюцца рукі. Станцыя "Плошча Перамогі". Я выходжу. Я выпускаю джына. Па целе нажом! На горла шыну! Ша!

52.

Я працаваў і працаваў. Я дзень і ноч ня спаў. Усё біў зашацьвелымі пальцамі па клявіятуры. Хацеў зрабіць у сваіх мазгах норку. Я люблю норкі! Але прыйшоў вірус і застрэліў мой кампутар. Сволачы!

53.

Я сустрэў трэцяе тысячагодзьдзе ў поўнай адключцы. Чарапную скрыню адкаркоўвалі не ключам! — ломам. Не, час ад часу я прыходзіў у прытомнасьць. Летала шабля комы. Перад вачыма прабягалі твары сяброў: Акулава, Жыбуля, Барысевіча, Курылы, Акудовіча, Гапеевай... Я выліваў на галаву халодную ваду ды прымаў новую дозу алькаголю. Па вяроўцы шпацыравала ня Шханава — Гала. Сальвадор варушыў злосна вусамі. Мае рукі ўпрыгожвалі баявыя ўкусы. Здавалася, што ў страўнік запхалі горад Сыктыўкар. Але мая галава сьвінцовай гірай кулілася на плячо каханай. Яе панцыр расколваўся, і я падаў у мора.

**54.**

*зашыфраванасьць тваіх белых каленяў*
*у сэйф я зьбіраю лакавыя валаскі*
*нахіляецца ліхтар камісара*
*на вуснах застыглі кроплі расы*
*мая рука як ліса*
*на пальцах брыль сонца*
*у вачах залатыя блісы*
*ты выгінаешся пантэрай*
*ты выгінаешся гюрзой*

*ты выгінаешся шынай б'юіка*
*гэта — тэрор*
*мякаць твайго цела зьмяняецца*
*па меры зьмены мясцовасьці*
*гэта — тэрор*
*я хачу здохнуць альпіністам*
*маленькім самцом-павуком*
*як прыемна шоргаюць сьцяблінкі травы*
*я ем гэтае поле*
*у вочы ляціць пух тапалі*
*12.45 3.01.2001*

55.

Чыноўнікі й сусьлікі былі ўпрыгожаныя гальштукамі. Сам дыктатар, празваны ў народзе Сухім і Бязрукім, начапіў гэтую шыкоўнасьць на сваіх рабоў. Кволыя шыі служачых канторы саюза бульдозэраў і пілаў нагадвалі сьцяблiны нейкай экзатычнай расьліны. Пысы квітнелі атрутнымі бутонамі — усе чырвоныя альбо зялёныя.

Я сядзеў на ўскрайку стала і марудна варушыў відэльцам у талерцы, бо мне было сумна і няўтульна.

Сусьлік насупраць рохнуў і заўважыў:

— На сцэну ты не прынёс ня толькі графіну, але і сонечных батарэяў. Глядзі — звольнім.

— Ды меркаваў. Ды думаў, — сказаў я, — гэтак хацелася апырскаць вядучага з графіна... На жаль, па дарозе сустрэў.адну суку і перадумаў.

Сусьлік рохнуў больш гучна:

— Дык у наступны раз вынось! Бо звольнім! Нам паэты не патрэбныя! Нам патрэбныя чыноўнікі! Пяцьсот жыхароў саюза чакаюць ад цябе тоўстых папак для архіву!

**56.**

Сланы прыйшлі ў Менск нечакана, калі я стаміўся змагацца з ворагамі. Яны пратупалі маленькім статкам. Тратуары тады ільсьніліся скарынкай лёду. Рэдкія дрэвы нагадвалі вадасьцёкавыя трубы. Сланы, не сьпяшаючыся, перасоўваліся па праспэкце ды хобатамі зьбівалі сустрэчных мянтоў і сусьлікаў. У колах інтэлігенцыі было агульнае прадчуваньне перамогі. Калі на далягдядзе ўзьнікла плошча зь вечным полымем, мара зрабілася зусім рэальнай. Надпіс "Подзьвіг народа бесьсьмяротны" затрашчаў і абваліўся. Сланы зьнесьлі некалькі

выпадковых машынаў, бо транспарт даўно стаяў без бэнзыну, і рушылі далей.

Я падыхаў на далоні дзяўчыны і зазірнуў у яе вочы. Там чыталася мора. Я крыкнуў: "Ша!" I скочыў туды.

57.

Глёбус паглядзеў на сваю жонку праз плястмасавую шклянку і сказаў: "Ну, вось, яна ўжо зьняла заплечнік. А немец чаго да яе прычапіўся?" Я дастаў з торбы літаратурныя чыпсы й прапанаваў Глёбусу і сфінксу. З палацу фараона выносілі забароненыя кексы. Галодныя буслы сьнілі нараджэньне барона. На галаве мэтра сьмярдзела карона.

## 58. ЛІСТ ДА КІСЬЛІЦЫНАЙ

*Прывітаньне, мая дарагая Ганна!*

*Тут морозы. Масква — горад, дзе пануюць халады. I ад гэтага робіцца зусім понура на душы.*

*Вельмі безь цябе сумую — без тваіх крытычных артыкулаў, сонечных усьмешак і апошніх навінаў з літаратурнага фронту. Але ты не хбалюйся, я не зьбіраюся доўга тут затрымлібацца. Бо бэсьціць маасоўскія даляглядьі няўдзячная справа для беларускага нацыяналгста. Мяркую вярнуцца ў хуткім часе і зноў выйсьці на працу ў вечным союзе бульдозэраў і пілаў.*

*Нядаўна атрымаў ліст ад нашага агульнага сябра Юрася Барысевіча, дзе ён прызнаецца, што бульдозэры заглухлі, пілы зусім затупіліся... шрацей папросту — праца паўсюдна спынілася. Тэта вялікая недарэчнааць. Абяцаю — у лютым вяркуся назаўсёды. Няхай тутэйшыя маскоўскія дзеўкі плачуць, але нашых хлапцоў гм не дачакацца. Ужо надта мы вольныя людзі. I нашае мастацтва — вялікая і магутная крэпасьць.*

*Ты пытается ў апошнім лісьце: навошта я друкую дрэнныя артыкулы на спад ар а Глебу са? Павер, я гэтым не займ.аюся, бо вельмі кепска ведаю ягоную творчасьць, акрамя кнігі вершаў "Парк" нічога не чытаў. Праўда, аднойчы спрабаваў сесьці за "POST SCRIPTUM", ды падалася надта сумнай гэтая справа.*

*Таму запэўніваю цябе, дарагая Тонна, што пра Глёбуса: пішу тольк г добрае. Дарэчы, у гэты момант, калі я сяджу над лістом, вакол мяне. шпацыруюць птушкі з драпежніцкімі мордамі Тэта мясцовая фаўна. У гнтэрнаце літінстытуту схавацца ад іх няма куды. Таму зь вялгкай аггдай, але цярплю іх прысутнасьць.*

*Што ж датычыцца сьмярдзючай кароны, пра якую ты пыталася ў адным з апошніх лістоў, яе я падарыў знаёмаму асецiну. Нядаўна ён хацеў мяне забіць, бо я па сваей неасьцярожнасьці выступіў супроць расейкага шавінізму. Білі мяне доўга. Як не зрабілі ў галаве дзірку, зьдзіўляюся дагэтуль. Але ты не хвалюйся — бінты зь мяне ўжо зьнялі.. Ты ведаеш, што, у прынцыпе, — я чалавек добры. Ня здольны пакрыўдзіць і павучка. А тое, што пра мяне кажуць усялякую дрэнь ~ суцэльная хлусьня і выпады ворагаў. Навошта я пра гэта пішу? Помсьціць тутэйшай гнюснасьці я ня буду. Бог ім судзьдзя. Таму перадавай спадару Адаму мае шчырае прывітаньне і пажаданьне ў хуткай сустрэчы. Перадавай прывітаньне і мужу зь дзецьмі.*

*І апошняе, памятаеш я неяк раагавядаў пра Мэтра? Дык гэта я меў на ўвазе спад ар а Зьмгя Віша, бо ён для мяне, акрамя цябе, найбліжэйшы сябра, і таму Мэтрам лічу толькі яго, перадавай і яму прывітаньне. Напэўна, дарагому Зьмію цяпер вельмі цяжка працуецца на маім месцы. Бо ведаю тамтэйшых чыноўнікаў. Яны любяць хваліцца, што людзі — здаровыя. Але я ў гэтым маю вялікія сумненьнг (дый і досьвед), гэтак яму і перадавай. Ну, не сумуй. Пастараюся пісаць, як мага часьцей, каб надта на мяне не забывалася.*

*Пішы!*

*Па-сяброўску абдымаю. Твой Зьміцер Вішнёў*

**59.**

Жаданьне пакінуць абсягі роднай краіны ў сёньняшняга грамадзяніна былога савецкага саюзу ўзьнікае даволі часта. Гэта накшталт шостага пальца, які трэба ўвесь час абсякаць. Бо без ампутацыі ён нератвараецца ў нейкую хранічна-невылечную хваробу. Нястача грошай — вечная праблема нашага інтэлігента. Але я тым ня менш навучыўся выкручвацца з падобнай сытуацыі. Так, я экспартую свае мазгі на захад і там час ад часу атрымліваю баксы. Безумоўна, гэта нагадвае татара-мангольскія набегі, але сёньыія інакш нельга. Я лічу поўным глупствам меркаваньне некаторых, што творца можа быць толькі жабраком... Некаторыя гэтак лічаць!.. Ша! Гэта прыдумалі бальшавікі! Гэта поўная лухта! Інтэлігент павінен і нават абавязаны быць багатым! Каб, да прыкладу, мець магчымасьць выпендрывацца залатымі зубамі альбо срэбраным унітазам.

Я падыходжу ў мэтро да краю пляцформы. Там унізе мэталёвыя сыпіцы трымаюць махру шпалаў. Зрэдку тут прабягае рука цягніка. Шоргат матораў. Ліхтары высьвечваюць у тунэлі трасу. Твар машыніста асьветлены тумблерам. Па лбе бягуць зігзагі думак.

Дзьверы, як валаскі, што ўвесь час варушацца. Нехта ня можа ўцiснуцца. Давай! Давай! Ты, свалачная баба, прыбяры свае пуза! А ты, выблюдак у акулярах, навошта выставіў свае боты?!! Давай! Давай! Наступная станцыя "Кастрычніцкая"! І рука цягніка паўзе далей, нібыта рабаўнік, які хоча намацаць грошы ў чужой кішэні.

60.

Узяць і адпілаваць кавалак цела. Потым назіраць за ім. Цікава, як ён будзе гніць. Як там завядуцца чарвякі. А можна гэты кавалак і засмажыць. А потым зьесьці. Ха-ха. Тут яса я ўяўляю, як на патэльні шапоча духмянае мяса. Я тыркаю яго срэбраным відэльцам і кажу каханай, якая знаходзіцца побач: "Ну, што, зайка, зьеш смачненькага на карысьць радзімы".

61.

У мяне расплавіліся мазгі. Разумееце? Няма аніякага выйсьця. Паўсюль адны сусьлікі. Учора да мяне прыходзіў фатограф. Ён цудоўны чалавек. Мы выпілі зь ім літр хатняга віна. Кроў перасоўвалася павукамі. Мы трaплялі ў павуціньне і там заставаліся назаўсёды. Разумееце ? Мы фатаграфавалі мазгі. Каб яны не блішчалі, "выстаўлялі сьвятло". Підой працінaлі гэтую шэрую маску. Бо хацелі ўнутранай глыбіні. Хацелі падзеньня ў бездань. Верылі ў перамогу чалавека. Бо векапомны стаяў параноік і зьмяняў вектары. Ша!

62.

Я ляжаў на падлозе і аплываў. Лыпаў вачыма і пальцамі чачотку адбіваў. На галаву зваліўся карнавал. Ды я глытаў валідол, а потым ванітаваў. Ша...

**63.**

Зь немцам А. мяне пазнаёміў Алесь Разанаў. Выпадкова. Калі я коўзаўся па Доме літаратара ў пошуках Шханавай. Ды мяне спынілі. Працяг знаёмства каштаваў мне эшалёна здароўя. Бо пры кожнай нашай сустрэчы мы бліскалі пляшкамі. Не адны. Разам з намі п'янствавалі Бахарэвіч, Сін, Барысевіч, Слай. Недзе на даляглядзе назіраўся Буль Жы. Ён ня піў. А запісваў нашыя тосты ў свой тлусты сшытак. Шпіёніў на карысьць ворагаў *" Schmerzwerk".* Ша! Была-была мазгоў варка!

Не — не дарэмна нашая радыкальная суполка абазваная па-нямецку. Гэта нехта прадчуваў. Бо адкуль узяліся на працягу году пяць праектаў, зьвязаных зь Нямеччынай? Гэта літаратурны лес. У

кожнага ён свой. Іншая справа, што некаторыя псэўдатворцы ламаюць свае кволыя ножкі, калі спрабуюць рухацца шляхам славы.

64.

У кожнага свае паняцьці пра дабро. Так, некаторыя курыцы лічаць, што робяць для чалавека вялікую ласку сваёй прысутнасьцю. Гэтае "прышэсьце Хрыста народу" праяўляецца праз вязаныя шалікі, дранікі ды іншую падобную бытавуху. Чалавек упарціцца, адплёўваецца крывёй. Ягоныя рукі сутаргава трымаюцца за апошнюю прыступку трапа... Ды курыца б'е па. пальцах крыламі, квокча: "Ты са мной не параіўся!" Дарагія курыцы, думайце больш пра вечнае: пра сэнс існаваньня, пра мастацтва. Ня злучка вызначае лёс чалавека. Ёсьць прастора, дзе жыве думка, дзеля якой урэшце і патрэбная чалавеку курыца. Бо азадак ніколі не заменіць галавы.

65.

Памятаеш, сука, сусьлік, як я цябе падвесіў у лесе? Трымцелі жоўтьтя дрэвы. Камісар Юрась сядзеў за часопісным столікам і паглынаў мяса. Яму было радасна назіраць гэтае сьвята.

66.

Скунсы, сусьлікі й бэгэмоты бегаюць вакол майго панцыру. Тамадовыя зграі. Натхненьне для ДАДА. Я адчуваю сябе малюскам. Я хаваюся. Але свалачныя жывёліны крычаць мне пра графін! "Ты пакрыўдзіў сусьліка!!! Ты ня вынес яму на сцэну вады! Ты — антысэміт! Мы цябе зьямо!!!" Ды тарантула на ўсіх вас! Ша! Пап'ю віна з Катулам. У маіх руках паэзіі молат!!!

У майго сябра Бахарэвіча цэлая калекцыя графінаў. Так, у ягоным сэрванце сустракаюцца самыя экзатычныя экзэмпляры. Ёсць трохлггровыя і квадратныя, пяцілітровыя і круглыя. Зялёныя, ружовыя, шэрыя... і нават адзін сіні!.. І усе яны маюць гістарычную каштоўнасьць. Колькі графінаў — столькі месцаў працы зьмяніў Альгерд. Ніводнага разу ў сваім жыцьці ён не прынёс графіна сусьліку альбо бурундуку. Ён ня здрадзіў свайму эгацэнтрычнаму нямецкаму жыцьцю. Таму Альгерда Ба~ харэвіча нідзе доўга і не трываюць. Ша! Наш!

67.

*мае думкі паралізавала*
*мяне ўсё дастала*
*одна дзеўка мяне заманала*

*душа зьмярцьвела*
*няма моцы глядзець на неба*
*вочы выцягваю з залапюга пэнала*
*туман зваліўся на мяне крывабы*
*я не рэагую на вашую мову*
*я душу піначэтнага генэрала лапай!!!*
*бывай лярнэт бяздарны*

68.

Запой. Гэтае слова палохае. Яно падобнае да каменя, к і нута га ў твар. Я стаю на бальконе — рукі ў кішэнях, у зубах цыгарэта — і гляджу на рэдкіх людзей. Здаецца, ад дрэва да дрэва перасоўваюцца цені.

У мяне ў гасцях Слай. Слайд анархіста. Ён п'е многа і пераважна гарэлку. І чырванее памідорам. Усьміхаецца трохдзённай барадой і эфэктна закідвае доўгія валасы за вушы. Праўда, яны бумэрангам вяртаюцца назад. Ён хіхікае, як правакатар, і распавядае чарговую показку. Худая дзяўчына незразумелага ўзросту, якая сядзіць зь ім побач, ікае і моршчыць барадаўчаты твар. Здаецца, што гэта недаваранаяcardэлыса. Хочацца ўзяць яе рукамі і расьціснуць. Каб пырскнуў сок. Я бяру какое і шпурляю ў вусяка, які паўзе па маёй геніяльнай карціне. Ён падыхае і застывае ў паставе пакутніка. Назаўсёды. Цяпер ён — частка шэдэўра. Чырвоныя й чорныя колеры пічыляцір. акуламі і плаваюць па сьценах. "Цудоўна! Цу-доў-на!" — крычаць мае госьці й калоцяцца ў сутаргах рогату.

Запой распачаўся банальна. Справакаваў яго немец, які прынёс торбу піва. Ша! Цяпер мы п'янствуем на поўную катушку! Заядаем гарэлку тушкам! сусьлікаў і кідаем з балькону сушкі.

Тусоўкі зь сябрамі мне нагадваюць статак кароў. Усе яны хворыя на мастацкі рак. Невылечнахворыя. Бездапаможныя. Зрэдку на парозе кватэры я ўтвараю мытню, дзякуючы чаму і спыняецца кантрабандны правоз нелегалаў. Такія жорсткія захады трошкі рэгулююць мірны працэс. Тым ня менш, у пэўны момант я не вытрымліваю дэбошу і дзіка крычу: "Усе-е-е прэч!!!"

69.

Дома ў Палойкера я перакуліў каву на кілім. Я пакрыўдзіў віннага кілера. Цяпер у яго плаваюць срэбраныя налімы. А Палойкер бегае па кватэры з клеткай і займаецца рыбнай лоўляй. Мы з мастаком Банько перакідваемся ягонымі кампактамі., як мячыкамі.

Мэблі ў Палойкера надта шмат, таму здаецца, што вакол растуць сосны. Ха-ха. Проста сонны сынок утапіў у рацэ суслікa. А Палойкер і не заўважыў... Ша! Ведай усіх шахматыстаў!!!

70.

Пазванкі хрумсьцяць, нібыта галеты. Я паглядзеў на суседа.. Побач са мной стаяў таўстун з носам — гнілая морква. Ён дыхаў паравозам і пляваўся шпулякамі дыму. Фортка ўвесь час ляпала белымі далонямі і задыхалася да сінечы. Цыгарэта, заціснутая паміж пальцамі таўстуна, асыпалася мёртвай елкай. Ён не зьвяртаў увагі на, гэта, і таму ягоныя гумовыя пальцы трошкі плавіліся. У чырвоных абадках я заўважыў курыныя яйкі, жаўткі якіх былі ўжо трэснутыя. Яны часта міргалі і патанам ў дымавых шпуляках. Мне зрабілася брыдка. Я схапіў рукапіс свайго рамана і пакінуў абсягі вар'яцкай рэдакцыі. Няхай здохнуць усе тутэйшыя літаратурныя праклaмацыі! Ша. Пайду куплю літр малака.

**71.**

Кампутаршчыкі звар'яцелі. Зноў поўзаюць па кватэры. Паляць марыхуану. Ядуць хурму. Ёсьць гэткае цудоўнае рускае слова — мура! Я выцягваю з паліцы раму і кладу туды твой твар. Зробім табе з кампутаршчыкам загар. Я-ха! Як я цябе кахаю! Кампутаршчыкі, прэч!!!

Я выцягваю з сэйфа сіняе сонца і кідаю яго ў кубак. Там яно іпыпіць, адрыгвае і кажа: "Кампутаршчыкаў на патэльню!" Я згаджаюся. Сапраўды. Бо чым горшыя суслікі за дрэннага чалавека? Нічым. У сэньсе смаку. Ха-ха.

**72.**

*калі ходзіш па лязе жарсьці*
*і чакаеш маленькую дзяўчынку*
*мае мяхкае сонейка-мітрэнгу*
*набягае сьляза*
*кончыкі пальцаў пакрываюцца порахам*
*гэта палымяная соль ляціць праз рупар*
*як подых як паўднёвае віно*
*ціхае і моцнае з парай*
*чырвонае і самотнае поўная ванная*
*яна мая анархічная вясна*
*калі па артэрыях прабягае холад*
*тады чаканьне ператвараецца ў каханьне*

*якое чамусьці нагадвае першамайскае сьвята*
*хочацца правесьці вейкамі па абадках*
*яе вуснаў*
*хочагща прабегчы дзікім зьверам пад*
*вопраткай*
*там на дне шахты*
*там на абячайках ханскі сьнег*
*кроў кропелькамі вьтучваецца на венах*
*калі крочыш па вастрыні бездані*
*дзень падобны на полосатую здань*

**73.**

Ты патэлефанавала, калі я спаў. І гэта было сьвята. Бо тваё зьяўленьні заўсёды былі прыемнай нечаканасьцю. Тым ня менш, я не прачнуўся. Я радасна ўсьміхнуўся і аклаў сасулькі ў куфар. Мая галава была фурункулам. Я ўяўляў аксаміт тваіх ног. Мне хацелася ператварыцца ў гвалтаўніка. Бывае, хвіліна шчасьця робіцца хвілінай вечнасьці. Мне было напляваўь на наступствы. Я сядзеў на ланцугу каханьня. І потым пад маім самсунгаўскім тэлефонам ляжала кніга Набокава "Лаліта". Гэта вам ня ггсэўдабумбамліты. Таму я чакаў верталёт, каб кінуць на горад ядзерную пліту. На далягля дзе ляжаў твой клітар.

Я-ха ! Як я люблю біфштэкс!

74.

Жанчына падарыла мне чорны ваўняны шалік. *Я* ўзяў яго і адчуў, як недзе гаўкнуў сабака. Я нават уявіў нейкага белага пудзеля. Хатняе пудзіла.

Ха-ха. У мяне зьявіўся ашыйнік для доўгай мастакоўскай шыі. Кожны раз, калі толькі пачынаеш паядаць свабоду, зьяўляецца мілая сэрцу сьцерва, якая імкнецца завесьці хатняга зьвяругу. Гаў-гаў!!! Мне не патрэбныя гувэрнанткі!!! Дам у газэту аб'яву: "Шукаю музу! Якая можа натхняць ня пуза, а душу!" Ша!

75.

У сусьліка вылецела вока. Потым адваліўся хвосьцік. Ён уздыхнуў і паклаў зубы на столік.

З воску я зрабіў ворага і ўтыркаў у яго срэбраныя голкі. Я быў чорным чарадзеем. Бо ў маёй кватэры ўсюды валяліся аголеныя трупікі сусьлікаў. *Я* мармытаў заклінаньні і поўзаў на кукішках.

76.

*сэрца — мэханізм на падшыпніках*
*круціцца колам*
*варочаецца як дакумэнт у партфэлі*
*асабліва калі пажар*
*языкі полымя салодкае пірозіва...*
*з плафонаў падаюць кажаны*

77.

ТВОР НАПІСАНЫ
НА ЗАМОВУ ГАЗЭТЫ "НАВІНКІ"
АНТАЛЯГІЧНАЯ ПАРАХОДА
НЕВЯДОМАЯ ДАГЭТУЛЬ ПАРАВОЗА
ГЕНІЯЛЬНАЯ САМААЁТА
ГАЙДАРНАЯ МАРА

КІМ ЧЭН ІРА прымацавалі да чорнай скалы каля Паўднёвай ракі і ўзьнялі над ім вялізны чырвоны сьцяг.

*Плывуць параходы — прывітаньне Кім Чэн Іру!*

*Аятуць самолёты — прывітаньне Кім Чэн Іру!*

*Прабягуць паравозы — прывітаньне Кім Чэн Іру!*

*А пройдуць піянэры — салют Кім Чэн Іру!*

У Менску жывуць тысячы маленькіх кімчэнырчыкаў. Яны носяць шыкоўныя гарнітуры і тоўстыя сакавітыя гальштукі. У іх ёсьць пупавіна, якая смокча кроў радзімы. Яны лёгка перажываюць зімы. Часам іх галовы пакрываюцца сытымі лысінамі. Варта. любіць гэтых трутняў прыроды. Во бязь іх у нас будзе замнога хлеба. У нас будуць машыны і кватэры, А тады мы здохнем ад пераяданьня, патрапім у аварыю. Магчыма, і дом разваліцца ад землятрусу. А пакуль мы жывем спакойна і ўтульна. Як Бахарэвіч, якому дастаткова пэналу!

78.

У п'яным стане я пазнаёміўся зь пятнаццацігадовай дзяўчынай. Яна стаяла зь сяброўкай і паліла цыгарэту. У яе вачах плавалі марскія вожыкі. Я быў ідыётам. Бо верыў у трансфармацыю цела. У той момант мне здавалася, што нарэшце да мяне прыйшла слава. Не,

безумоўна, я быў знакаміты. Але ня варта верыць у казкі пра Лаліт. У нашай краіне няма Айбаліта. Таму я хістаўся антэнай машыны і сьвяціўся семафорам. На мне была, форма літаратурнага фюрэра, Я вырабляў зь дзяўчынкі Юлі гравюру.

А потым неяк. Пасьля начнога кіно. 1 Іасьля тысячы сноў. Калі я варушыўся ў ложку дэльфінам. Мне пазванілі. Шчоўкалі тэлефонныя запінкі. На сувязі была панкаўская Юля. Яна прызналася, што мяне кахае. Што цэлы месяц чытае мой паэтычны кашаль. Што яна падрыхтавала мне ў падарунак ваўняны шалік. Але падчас нашай размовы пачуўся крык. Недзе ў школе быў шалёны кок. Мне паабяцалі перазваніць і зьніклі. Я слухаў шэпт тэлефона — ягоныя гудкі нагадвалі стогны нябожчыка.

А потым мне пазваніла дзяўчына Каця, якая прызналася, што знайшла мой тэлефон на парцэ. І што хоча са мной пазнаёміцца і схадзіць разам на тэнісны корт. Мая галава ператварылася ў драўляны форд. Lila! Я супраць маленькіх куранятаў! Я хачу мець старую мэгеру!!!

79.

*Пурпуровы кокан*
*белы сьнег за вокнамі*
*а я чую нечы хрыплы крык*
*ён як шэпт*
*сіняя рука запісвае рэцэпт*
*п'явачнага настою*
*мяне праціна е наскрозь гэты настрой*
*маленькімі чорнымі пікамі*
*я прыслухоўваюся*
*заборонены ўваход*
*і ратпам разумею што*
*мае вочы пырскі крышталю*
*што недзе засталася застылая зямля*
*і рукі што просяць майго цяпла*
*але чуецца шэпт*
*злосны тлусты*
*ён кладзецца лустамі*
*на пахавальную хустку*
*не — гэта чуецца крык*
*гэта апошні штык*
*майго чырвонага горла*

**80.**

У 2001 годзе на фэстывалі "Не!" ў кінатэатры "Ракета" я быў касманаўтам з іншай плянэты. Я піў таматны сок літрамі і глытаў аспірыну таблеткі. Там пад языкамі пражэктараў я поўзаў па залі ў мышыным шынялі і ванітаваў крывёй! Я абварацаў труп дыктатара! Дзяўчаты, што прыйшлі пагусавацца, адчуўшы атрутны пах, паміралі — курчыліся, сінелі й ледзянелі. А я пакідаў паўсюль чырвоныя лядунцы. Пэрформанс "Труп дыктатара" распавёў пра барацьбу вантробаў узурпатара і ягоных мазгоў! Дарэчы, падчас яго я і беларускія афрыканэры збацалі чырвонымі цаглінамі пахавальны марш! Шнары разрэзалі залю ўздоўж і ўпоперак. Студэнт, памятай: камень — гэта зброя дэманстранта! Бо менавіта ён быў вынайдзены ў страўніку дыктатара! Ша! Ня будзе новага нашэсьця манголаў і татараў!

**81.**

Нашая літаратура змуміфікаваная ўшчэнт! Помнікі Купалу й Коласу панастаўленыя на кожным рагу! Сёньня лляне ванітуе ад мяснога рагу! Нельга ствараць свайго бога! Бо тады будзе гамон! Сьведчу бровамі свайго твару! Так яшчэ ў 1913 годзе Вацлаў Ластоўскі пісаў: "Спомніліся мне вершы нашых беларускіх паэтаў, каторыя заместа ўслаўляць нашу папраўдзе бязьмерна харошую прыроду, абесслаўлялі яе. Адзін зь іх кажа:

*Куры, сьвіньні, гною кучы*
*Напаўняюць кожны кут.*
*Вокны затканы анучай,*
*Так і кажуць: "Усюды бруд".*

Другі падпявае:

*Край наш бедны, край наш родны,*
*Гразь, балота ды пясок!*

Яшчэ іншы плача:

*Невясёлая сторонка*
*Наша Беларусь.*
*Людзі: Янка ды Сымонка,*
*Птушкі: дрозд ды гусь...*

У канцы нехта чуткі з роспаччу крычыць:

*"Край ты мой родны,*
*як выкляты Богам".*

І далей у Ластоўскага знаходзім: "...гэтым "паэтам" можна даравацъ іхнія няскладныя плачы".

Я асабіста ня супраць балотаў, я — супраць мумій! Асабліва. яны не падабаюцца мне на прасторах мастацтва! Трэба іх пахавацъ надежным чынам! Каб не было сьмярдзеньня "гною кучы"! Я — за могілкі дзеля "няскладных плачаў"! Ды як пісаў наш слаўны паэт Паўлкж Шукайла: "...гвізданўў па заскарузлых трантах фармальнай стар'ёўшчыны". Гвізданём!

Абарвацъ тваю карталыгу!

82.

Я не прыхільнік сялянскай паэзіі. Я люблю гарадзкія крыгі. Мне здаецца, што сьпевы пра палі і вясковы дабрабыт часам выглядаюць неяк занадта штучна. Тым ня менш, працуючы ў саюзе бульдозэраў і пілаў, я вымушаны быў мірыцца зь некаторымі гэтаіс званымі апосталамі сахі. Мне як ітаэту зусім не падабаецца творчасьць Купалы й Коласа. Мне бліжэй Ільля Сін і Альгерд Бахарэвіч. Але, выконваючы абавязкі літкансультанта, я вымушаны шанавацъ ня толькі літаратараў, але й вясковых песьняроў. 7 ліпеня 2001 года здарылася "неспадзяванка": мяне накіравалі на ўскладаньне кветак Купалу. Я прыйшоў аб 11-й гадзіне. Няголены, бадуновы, у афрыканскай кашулі і з пляшкай піва, я выглядаў надзейнай зьменай вясковага брата-паэта. Дарэчы, я ня маю на ўвазе абразіць сапраўдных паэтаў, што выйшлі з-пад сялянскага даху — гэткіх таксама шмат, але яны хутчэй не песьняры, а печкуры навакольнага сьвету. Так я паважаю: Міхася Башуру, Паўлюка Шукайлу, Анатоля Сыса, Янку Лайкова...

У супрацоўнікаў музэя Купалы здарыўся шок.

— Жанчыны, — сказаў я, — не хвалюйцеся. Купала калісьці працаваў на піўным бровары, і думаю, што ў гэткую сьпёку піў выключна слабаалькагольныя напоі.

Вось гэтак я выклікаў крызыс у асяродку чысьціні паводзінаў. Нездарма я часта чую: "Ты — не паэт! Ты — вораг! Ты — разбуральнік традыцый! Ты — кат вясковых кактусаў!" Ды не, даражэнькія!.. Якраз я і ёсьць найсапраўдны пераймальнік традыцыі. А вы — вычварэнцы ў жаноцкіх халатах!

На наступны дзень я паехаў у Вязынку, каб і там ушанаваць Купалу. Па дарозе я сустрэў добры тузін сусьлікаў. Усе яны ашчыляліся ды паказвалі язычкі. У-у-у, паразыты!.. Няма на вас мяне зь бізуном!

Я выступіў на пляцоўцы перад разьюшанымі сусьлікамі і паабяцаў усіх змуміфікаваць.

— Рыхтуйцеся! Я выцягваю сякеру!

У аднаго лупатага я нават ампутаваў хвост падчас чытаньня вершаў. Бам! Шэрая кілбаса звалілася пад сцэну... Карацей кажучы, разварушыў кола прыхільнікаў песьняроўства. Потым за сьвяточным сталом, калі я адкаркоўваў шампанскае, Кюнас Дап сказала:

— Глядзіце, як у яго калоцяцца пальцы — гэта не зь перапою, гэта — ад жаху.

Прайшлі сьвяты, я прыйшоў на лятучку апарата сбп. Прабег праз статак сусьлікаў і схіліўся сусьлікам ля кіраўнічых постацяў.

— Выканаў, — сказаў я. — Цяпер пяціюдка шанаваньня нашая. Культурныя мерапрыемствы — народу каша.

— Шукай працу, — сказаў мне чыноўніцкі голас. — Ты давёў да ручкі ўсіх сакратароў, зганьбіў сбп і зьнішчыў прыгажосьць традыцыі. Ты — вораг беларушчыны. Ня месца гэткім у сбп. Шукай новую працу. Шукай птушку Маразу!

— Дзякую, — прагаўкаў я. — Але сабакі лепшыя за сусьлікаў у дзясяткі разоў. А птушкі — пераляцелі на захад! Памятайце пра гэта, літаратары! Сякеру пад карталыгу! Я — уладар свайго лесу! Ха-ха!

Тут я разварочваюся бульдозэрам і рушу на бераг цёплага летняга сонца. Мазгі варушацца ўспамінамі пра мінулыя выступы ў музэі Купалы... Гэх, незабыўная даўніна... Жыбуль, Корбут, Туровіч, Гапеева і я перад навучэнцамі старэйшых ісьлясаў чытаем свае творы. Прыносяць запіску з залі: "Купала перакуліўся б у сваёй труне". Жыбуль агучвае тэкст невядомага разумніка. Недзе на апошнім ра~ дзе плач сваячкі песьняра... Туровіч экстазна чытае свае вершы...

Але сонца плавіць мае мазгі.

83.

*СУКА ЗАДЫХАЛАСЯ ПАД ГРАВЮРАЙ*
*НА ДАЛЯГЛЯДЗЕ ~ МАЛАДЫ ФЮРЭР*
*ЁН ПАЗІРАЎ НА СУСЬЛІКАЎ*
*І СТВАРАЎ НОВЫ "MEIN KAMPF"*
*я ўжо даўно не ўсьміхаюся*
*пад абажурам маёй галавы*
*плёскаецца гаручая атрута*

*зморшчыны майго твару — маска*
*там сядзіць не паэт — чырвоны мак*
*я гляджу на адлюстраваньне*
*на карціне ў рамцы*
*стаіць немец у рагатай касцы*
*гучаць закадзіраваныя цыкады*
*праломлібаюць вочы сяляне з косамі*
*з гарматы вылятае чыгуновы какос*

**84.**

На стадзе ляжаць пятнадцаць трупікаў. Сярод якіх шмат і сусьлікаў, і трусаў, і бурундукоў, і скунсаў… Шмат мяса. Але ня гэта мяне цікавіць. Хоць я і шпацырую вакол стала зь вялікім нажом, які шчыліцца зубам быццам прыціснутая кобра. Хоць я і рагачу, быццам пацыент санаторыя “Навінкі”. Узяць і пачаць секчы мяса!.. Ша! Каб забясьпечыць сваю патэльню смажанінай! А мая патэльня гэта — плаўленае вока кіта! Там заўсёды ікаюць, яйкі сьвінцовымі літарамі! Кнігі друкуюцца яечнямі і складаюцца ў слоікі. Чыноўнікі паміраюць пад фільтрамі! Іхнія слёзы пырскаюць літрамі! Ша! Патарчаку ў вуха чмутла! Каб у страўніках была каламутра!

Вітаю спадара Леаніда Галубовіча! Гэтага мудрагелістага пііта! Салют пітардамі! У 1995 годзе гэты разумнік падпісаў мне сваю кнігу "нятленак" — "Заложнік цемры": "Зьміцеру Вішнёву — паэту ад паэта". Ды здаецца мне, што зашмат у нас вясковага песьняроўства!.. Неяк даведаўся, што Галубовіч скончыў у 1969 годзе Слуцкае ПТВ № 97, а потым працаваў электрыкам на прадпрыемствах Слуцку, Жабінкі і Клецку. Цудоўны штуршок для біяграфіі паэта! Усім ворагам тарта! Ша! Поўзаць па электрычных слупах гэта вам не вершыкі крэмзаць! Геніяў электрычнасьці варта шанаваць! Недарэмна. Канстанцін Алімпаў калашмаціў сваёй паэзіяй навакольную прастору! Ха-ха! І мяне да болю кранаюць словы спадара Галубовіча: " А можа, і насамрэч — паэт я ўсё-ткі?.." Не — у першую чаргу — электрык! Бо без электрычнасьці мы можам павымірацьь! Дайце нам току на крэсла! У спадара Галубовіча можна адшукаць наступныя прызнаньні: "...і сам. я ў літаратуры ў нейкай меры — мазахіст. Часам нават маю поясад да крытычнай лупцоўкі, але не дзеля крыві, а для эгаістычнага задавальненьня: мяне б'юць, бо — любяць і хочуць, каб я стаў лепшы, чым ёсьць, каб любіць мяне яшчэ больш..." Не хвалюйцеся, спадар электрык, мы — і бумбамлітаўцы, і шаноўныя шмэрцвэркаўцы — зробім вам цёмную! Будзьма біць ласкава — не да. крыві! Да першага паэтычнага пырску! Да першага электрычнага віску!

Ды я шпацырую вакол стала зь вялікім блішчастым нажом. На мне трымціць шлафрок. *Я* пералічаю зубы ва ўсіх мёртвых зьвяркоў. Ша! Мазгі ворага салодкае сочыва! Нездарма ў Афрыцы ў рэстарацыях мазгі малпы каштуюць вялізарных грошай! Ша! Гэта лепш за сумную песьняроўскую кашу!

Сусьлікі і скунсы й ня марылі быць у гэтых мясьцінах. Мае вочы ўзгоркамі ціны. З дыскетаў я выrabляю кулі для пометы. Будзьма рабіць мост да галоў сусьветных ўзурпатараў. Там укрыжуем паэтычную фару! Ша! Сыс, завязвай на сваёй шыі чырвоны шалік!

85. ПЕЧКУРЫ СУСЬВЕТУ

Я паважаю спадара Галубовіча за шчырасьць. Вось тады і растуць вершы! Вось пачуў, што адной вядомай літаратурнай асобе ён сказаў: "Вы — беларускі Жданаў". Прама ў вочы. На-а-а!!! Прыгадаў бумбамлітаўскі друкапіс Валянціна Татура пад назвай "Батон", дзе былі зьмешчаны паэтычныя тэксты, і падумаў, што некаторыя паэты ня проста ствараюць вечнае, а выпякаюць хлеб.

86. ГЛЁБУСА НА ПЭНСІЮ!

Глёбус падобны да мячыка, якім хочацца граць у футбол. Я заўсёды зьневажаў школьных географаў, бо любіў шпацыраваць у ботах па іх каляровых мапах ды сшытках. Таму, сустрэўшы ў друку псэўданім Адамчыка — Глёбус, — я рагачу. У гэткія хвіліны я прыгадваю мячык, які так утульна кладзецца на бутс і скача ад нагі гумовым снарадам.

Спадарыня Кісьліцына, па словах Юрася Барысевіча, "спрабуе выконваць у беларускай літаратуры ролю фатальнай жанчыны". Сапраўды, куды б не патрапіла Ганна, там пачынае разгортвацца вайна плётак ды абразаў (можа, гэта прыродны фэномэн?). Я — чалавек добры (праўда-праўда), таму на творчыя вычварэньні Кісьліцынай адно ўсьміхаюся і сплёўваю празь левае плячо. Дарэчы, што датычыцца Фройда... неяк падчас выпіваньня зь Дзьмітрыем Прыгавым Кісьліцына старанна. калупала на сваей піўной бутэльцы этыкетку, што, напэўна, гаворыць пра сэксуальную заклапочанасьць — але ж гэта ейная асабістая справа. Мае герантафілічныя пачуцьці памерлі на далягдядзе дзяцінства.

Апошнім часам я сутыкаюся з Кісьліцынай у раёне батанічнага саду, калі там, па сваёй рамантычнай завядзёнцы, яна шпацыруе пад ручку са спадаром Адамам Глёбусам. Чамусьці гэтыя незаплянаваныя сустрэчы выклікаюць на тварах Кісьліцынай і Глёбуса картаграфічную рэакуыю — па іх тварах бягуць хвалі зморшчынаў. У гэты момант я

падсьвядома спачуваю Вітаўту Іванову (пляткарацьч, што гэта. псэўданім Серабракова), які прызнаўся, што Адам Глёбус — гэта "німфэтка, якая прагне набыць першы сэксуальны досьвед" ("Навила", 3-10 красавіка 2002 г.). Як чалавек выхаваны, я вітаюся з зоркамі літаратурнай эстрады. Іх колкія праллянi мяне не турбуюць. І няхай Глёбус раве, што "Вішнёў і ў жыцьці, і ў пісаніне падобны да непрыгожай цёткі, якая страшэнна баіцца састарыцца". Восьяны, зоркавыя ўплывы "фатальнай жанчыны" — напачатку скунсы, потым географы-параноікі. Ы-ы-ы-ы-ы.

87.

Гарбату трэба купляць з душой, пра гэта я сказаў адной курыцы. А наагул, любая рэч патрабуе тактоўнага падыходу... духоўнай пяшчоты. Бяз гэтага будзе і гарбата нясмачная, і настрой дрэнны.

Сёньня я спыняю працэс трапу, дакладней — я выходжу з кантэксту кнігі, Бо гэты трап бясконцы, як сам космас. Тут і цікавасьць, тут і банальнасьць. Трэба ад бананаў пераходзіць на какосы. Прынамсі, я прыходжу да такой высновы. Наколькі яна карысная ці патрэбная, меркаваць напэўна ня мне, а суськікам.

У маёй шафе вісяць паліто садызму, нацыяналізму і фашызму, на тумбачцы ляжыць капялюх мазахізму, у зубах я трымаю пальчаткі дабрыні, пад нагамі пакутуюць кілімы пэдафіліі і герантафіліі, у носе баньга антысэмітызму і расізму, у вачах каньюнктывіт каханьня. У маёй драўлянай хаце жыве шмат цудоўных рэчаў.

ПРАЦЯГ БУДЗЕ

***Зьміцер СЕРАБРАКОЎ***
Эпілёг у 5 нэкралёгах

***Ільля СІН***
ВІШНЁЎ І ЯГОНЫЯ СУСЬЛІКІ

***Зьміцер ВІШНЁЎ***
А СУДЗЬДЗІ ХТО?
(Пасьляслоўе да пасьляслоўяў)

## ЭПІЛЁГ У 5 НЭКРАЛЁГАХ

З ГЛЫБОКІМ СМУТКАМ ПАВЕДАМЛЯЕМ
АБ СКОНЕ ВЫСОКАПАВАЖАНАГА
БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДЗЯНІНА.

Сёньня раніцай рэшткі спачылага спадара Зьміцера Вішнёва. Машыны.

Зьмелюць чалавека на атамы, калі трапіць туды. Кіруюць сёньняшнім сьветам. І ягоная машынэрыя таксама шпарыць. Як гэтыя, калі выйдуць з-пад рук: зашумуюць. Разьнясуць, паразьдзіраюць. А той, стары шэры пацук, ірвецца, каб пралезьці ўсярэдзіну.

### № 1: Нэкрялёг для фармалістаў

Люстра

Увайшоў агідны чалавек і глядзіцца ў люстра.

*"Чаму вы глядзіцеся ў люстра, хаця і ня можаце бачыць сябе без агіды?" І агідны чалавек адказаў мне: — "Шаноўны спадар, паводле. бесьсьмяротных прынцыпаў 1789 году, усе людзі роўныя ў сваіх правах; таму я маю права, глядзець на сябе ў люстра, з задавальненьнем альбо без — гэта справа майго сумленьня"; таму з пункту гледжаньня здаровага розуму я меў несумнеўную рацыю, ;іле, з гледзішча закону, і ён не памыляўся.*

БадлерПарыжскі Сплін.

Напрыканцы XX ст. фізікі вызначылі да долі сэкунды час пачатку нашага сусьвечу. Генэтыкі шукаюць ураўненьне бесьсьмяротнасьці, кланоюць авечку Аолі ды іншых суськікаў і праз некалькі хвіляў зоймуцца прадукцыяй клону неўміручага чалавека (што тут увогуле можна прамовіць на тэму душы?). Інфарматыкі стварылі сусьветнае павуціньне камунікацыі й інфармацыі — агульны розум, супольную памяць чалавецтва.

І ў гэты час дамінуючым матывам сучаснага мастацтва зрабілася разбурэньне й дэканструкцыя ўзораў культуры. Бунт і супрацьстаўленьне па канонах і папярэдніках сталі ня столькі патрэбай, колькі абавязальным у мастацтве XX сгагодзьдзя шаблёнам, які выяўляецца ў шакавальных не столькі творах, колькі чынах мастацтва, дзе адзіным спосабам для выбітнага творцы зьвярнуць на сябе ўвагу пад соўсам камэрцыялізаванага бунту і новай формы ёсьць

абраза і напад па якуюнебудзь больш-менш шанаваную каштоўнасьць. Кожны наступны ўдзельнік мастацкага чыну пачынае сваё існаваньне з больш шалёных і разьятраных атакаў на грамадзкія вартасьці. Было б ідыятызмам выказваць прэтэнзіі да мастакоў і творцаў, бо яны толькі адлюстроўваюць дух эпохі, акрамя якога, часам яшчэ званага модай, альбо, як кажуць у народзе, "парадыгмай", існуе і пэўная лякальная спэцыфіка, якая адрозьнівае ангельскі "гэпэнінг" ад бязьлітаснага і бессэнсоўнага бунту ўсходніх народаў. Тут рэч пойдзе пра форму — гэта значыць пра тое, што не дазваляе спалучэньню розных элемэнтаў выглядаць адвольнай выпадковасьцю: твор мастацтва — гэта тое, што чалавек адваёўвае ў выпадку. Выпадковымі і непатрэбнымі творы мастацтва падаюцца тым, хто ня бачыць у іх ніякай формы: абстрактная карціна для Хрушчова была толькі крэмзаньнем асьліным хвастом па палатне; безумоўна, ён памыляўся, але на свой спосаб усьведамляў, што мастацтва — гэта перамога над выпадкам, забыўшы, што любым прыхваткам можна навучыцца, незалежна ад тага, будзем іх стасаваць ці займацца іх расшыфроўкай.

Аналіз структуры мастацкага твору палягае ня столькі ў прыпісваньні сэнсу рэчам, якія ён выкрывае, колькі ў спасьціжэньні, яісім чынам, якім коштам і якім шляхам магчымы гэты сэнс. Можна нават сказаць, што аб'ект структурнага аналізу — гэта не чалавек з мноствам разнаітых сэнсау, а толькі акт, у вытку якога паўстаюць сэнсы зьменлівыя, гістарычныя, выпадковыя, новы чалавек структуралістаў — *homo significans.*

Такім чынам, праз акт расчляненьня адбываецца пераняесеньне акцэнту шуканага сэнсу мастацкага твору — камунікацыйнасьці на іншыя складнікі, што ўрэшце прыводзіць да нэўтралізацыі суб'екту, як праца *ghostbuster'ay* — паляўнічых за прывідамі. У дадзеным выпадку гэта прывід творчасьці без тармазоў, джын, вызвалены з бутэлькі яшчэ "імпэратарам рамантыкаў" Напалісам (1772-1807), які абвясьціў пачатак "магічнага ідэалізму", угрунтаванага ў перакананьні, што выслоўям сапраўдных паэтаў уласьцівая здольнасьць выклікаць духаў, пануючых над прыродай, і зь іх дапамогай перакшталтоўваць навакольыіую рэчаіснасьць альбо, прынамсі, ствараць такую ілюзію ў адрасатаў наратыўнай акцыі.

За апошнія дзьвесьце гадоў састарэлыя маральныя, звычаёвыя й эстэтычныя нормы непазнавальна перамяніліся, засталося, аднак, нязьменным адвечнае імкненьне мастакоў займаць пэўнае выключнае становішча, і калі караля, як вядома, робіць сьвіта, то творцы, якія прэтэндуюць на поўную незалежнасьць і ад соцыюму, і ад атрыбутаў

каралеўскай улады, жадаюць заставацца ў сваім наіўным эсэнцыялізьме "голымі каралямі".

Голы кароль, "чалавек без уласьцівасьцяў", асоба, якая, зьнянацку страціўшы атрыбуты ўлады — касьцюм ці павагу свайго атачэньня, была аб'ектам кпінаў у знакамітай казцы Андэрсэна, а ў рамане Марка Твэна "Прыгоды Гекльбэры фіна" стала правобразам мастацкіх чынаў постсучаснасьці.

У рамане Твэна правінцыйнае мястэчка наведваюць два махляры, якія выдаюць сябе за вандроўных актораў і, не атрымаўшы ні грошай, ні пашаны ад гледачоў, жадаючы адпомсьціўь, абвяшчаюць супэрдарагое супэрвідовішча — спэктакль "Каралеўскі Жыраф".

Выкачаны ў пер'ях і запэцканы ў фарбе годы кароль на карачках некалысі разоў прабягае па сцэне, і на гэтым сканчаецца ўся дзея. Незадаволеная (а толькі за хвілю перад гэтым рагочучы ў захапленьні) публіка патрабуе вярнуць грошы, паіражаючы суровай бойкай, але адзін з падманутай публікі супакоіў разьятраных спажыўцоў культурнага прадукту, параіўшы прыняць удзел у падмане тых, хто на гэты раз не прыйшоў на спэктакль. Трэцяга прадстаўленьня не адбылося — махляры ўцяклі.

Такім чынам, скандал, як зьява сацыяльная, непазьбежна патрабуе публікі й нармуючых варункаў, зрабіўшы неабавязковым само мастацтва, ітакідаючы заместа клясычнага ўсімі шанаваігага *катарсысу* жаль па страчаных грашах і часе.

Нуда як форма спадарожнічае фармальнаму скандалу. Нуда ахоплівае ўсіх, хто апынуўся ўцягнуты ў перманэнтную дзею — аўтарскія вечары, пэрформансы, на якіх адбываецца зазвычай усё тое самае.

Яшчэ на. пачатку XX ст. комплекс падобнай салоннай стомленасьуі служыў фактарам, які правакаваў выклік з боку літаратурнага авангарду, але футурыстычныя скандалы, эпатажы, шакавальныя прадстаўленьні, стаўшы клясыкай гістарычнага авангарду, сёньня выродзіліся ў гэпэнінгі ды інсталяцыі, які нікога ўжо не шакуюць, а часьцей выклікаюць скептычнае пазяханьне. У пэўным сэнсе літаратура вычарпала запас калялітаратурных прыхватак прадстаўленьня сябе самой.

Рэжысэр Рыд Таліпаў у рытарычным пытаньні "Чаму беларус ня можа быць у касьцюме ад Вэрсачэ?" даў яскравы прыклад фармальнага скандалізму постсучаснасьці, зьнітаванага з паранаідальным культам зьнешняй атрыбутыўнасьф, што зиайшло сваю маніфэстацыю ў гомаэратызме як вышэйшай стадыі эстэтычнага аўтанарцысізму. Невыпадкова рэжысэр адмыслова выбірае для свайго тэатру нудныя й

шэрыя п'есы сярэдніх аўтараў, каб надта перагружаныя сэнсам тэксты не перашкаджалі гледачам атрымліваць асалоду ад уласнай дзерзкасьці, сузіраючы салодкія забароненыя плады, за што гэткія агідныя відовішчы ўсё яшчэ атрымліваюць незаслужана гучны какетлівы тытул "псыхалягічкай драмы".

Фактычна не было б сэнсу распачынаць гэтую гаворку, калі б штучнай нудзе не спрыялі штучныя варункі, якія надаюць скандальны прысмак самым нікчэмным мастацкім падзеям. Гэта так званая "новая літаратурная сытуацыя", якая насамрэч ніякім чынам не жадае пераўтварацца ў новую, сытуацыя, калі дзяржаўная падтрымка розных штучных бюракратычных структураў прыводзіць да самых нечаканых ды ідыёцкіх вычварэньняў. Рэч ня ў тым, што на. беларускай глебе суадносіны істэблішмэнту і авангарду, як і ўсё астатняе, пад уплывам усеагульнай мутацыі прышялі нейкую дзівосную форму — справа пра іншае: Дом літаратара на некаторы час стаўся прытулкам самага бязглуздага ў сваёй нахабнасьці і наіўным цынізьме літаратурна-мастацкага скандалу стагодзьдзя, які быў пэрсаналізаваны асобай нядаўна спачылага літкансультанта Зьміцера Вішнёва. Зьміцер Вішнёў часта чытаў свае "вершы" размаляваны каляровымі фарбачкамі быццам той "ісаралеўскі жырафа", але пры гэтым ніхто не адчуваў сябе падманутым, наадварот — тыя з крытыкаў, хто вучыўся яшчэ па савецкіх падручніках эстэтыкі, цьвёрда засвоілі, што буржуазнае мастацтва — гэта гаўно, і таму наколькі мы даімкнуліся да капіталізму, настолькі й паэзія Вішнёва адпавядала надзённым патрэбам "літаратурнай сытуацыі" ў гаўне. Кампэтэнтнай крытыкі ніводзін з вішнёўскіх зборнікаў не вытрымліваў (як можна крытыкаваць нуду — нуда яна і ёсьць нуда), таму надалей застаецца адкрытым пытаньне — як? Якіснаваў у паэзіі паэт, падобны да чэмпіёна алімпійскіх гульняў сярод інвалідаў, які фізычныя недахопы кампэнсуе няўрымсьлівым жаданьнем самавыяўленьня, паэт, у якога заместа валоданьня формай вершаскладаньня і літаратурнага густу былі толькі бязьмежны нарцысізм і нахабная самаўпэўненасьць ?

Вядомы выпадак, калі знакаміты расейскі пісьменьнік У. Набокаў шукаў месца прафэсара літаратуры ў адным з амерыканскіх унівэрсытэтаў, і яму адмовілі. Адмовіў сам Раман Якабсон. — "Як? Набокаў — буйнейшы расейскі пісьменьнік!" — "Так, — адказваў славуты тэарэтык літаратуры, — слон таксама буйная жывёла, але мы не прапануем яму катэдру біялёгіі..." Вішнёў не прэтэндаваў, дарэчы, на імя якогась буйнога зьвера; ён, падпісваючы свае опусы какетлівым

псэўданімам "Зьмiевiш", тым самым дакладна азначаў сваё месца ў паэтычным заасадзе і сваю гадскую сутнасьць.

**№ 2: Нэкралёг для аматараў біяграфій**

Нехта сказаў, што ў добрых паэтаў зазвычай шэрыя біяграфіі.

У гэтым сэнсе Зьміцер Вішнёў заслугоўваў як найбольш пільнай увагі.

Як вядома, літкансультант і асабісты сябар Карлсана любіў чытаць публічна ўласныя вершы, якія ён так і аб'яўляў, падвываючы: "А зараз я пачытаю жанчынаненаві-і-сьніцкія ве-ершы" — навошта ён гэта рабіў, ніхто ня ведаў, тым больш, што ў ягоных вершах і так ніхто нічога не разумеў, але ў Вішнёва быў гэткі стыль — поўная чайная лыжачка "эпатажу".

Паколькі Вішнёў жыў яскравымі, поўнымі жывога жыцьця экзыстэнцыяльнымі парывамі — то творчасьць яго была шэрая і нудная. Калі ён сам перад тым, як чытаць свае вершы, забываўся правыць: "зараз я пачыта-а-ю эпата-ажныя (аванга-ардныя, жанчы-наненавіісьніцкія і г.д.) вершы", ніхто й не здагадваўся, што яго эпатуюць, дражняць, правакуюць. "Нічога не разумееце, вы — інфузорыі!" — прыдумаў зьмiевiш абразьлівую дражнілку пра тых, хто, хоць рэж, не жадаў прызнаваць у гэтай графаманскай лухце пачаткаў нацыянальнай экскрэмэнтальнай скаталёгіі альбо капралягічнай філязофіі.

А такія, з дазволу сказаць, "бунтары" і былі патрэбныя Саюзу пісьменьнікаў канца XX — пачатку XXI стагодзьдзяў роўна настолькі, наколькі быў патрэбны сам Саюз, надобны на тую *"ёмiслпасьць, поўную ганарэйнага гною, у сярэдзіне якой — вырваная кіста яечніка, фалікулярны шанкр і запахенае нагнаеньне... пухліна парафімозу і тры чырвоных слімака",* як казаў Лётрэамон. Вішнёўскі "верш" пра лабковага паразыта, які называўся "Ён", альбо апавяданьне "Скунс" могуць з поўным правам называцца "Гэта *я* — Дзімачка Вішнёў". Сам Вішнёў вінаваты ў гэтым роўна. настолькі, наколькі бывае вінаватая ганарэйная пухліна ў венэрычнай хваробе, на якую даўно хварэла беларуская літаратура. Сродак выратаваньня толькі адзін — ізаляцыя літаратуры й літаратараў у адным вялікім лепразорыі, каб не заразіць іншых, хто пакуль яшчэ мае здаровы смак да прыгожага нісьменства.

**№ 3: Нэкралёг для хера Карлсана**

Шаноўны хер Карлсан! Зь вялікім жалем паведамляю вам аб заўчасным сконе знакамітага беларускага літаратара і мастака, чыноўнага паэта Зьміцера Вішнёва, вядомага вам па акцыях міжнароднага гей-клюбу *Lusbla Maad och Karhon* ("Блакітны Маладзік і Карлсан"), якая адбывалася на даху аднаго з стакгольмскіх хмарачосаў не далей як летась, напярэдадні пачатку сэзону адстрэлу суркоў. Тады маладыя беларускія літаратары выскачылі на імправізаваную сцэну, каб шакаваць публіку сваім выглядам — з вопраткі на целах *diktarer* (паэтаў) былі толькі вялізныя саламяныя капелюшы. Схаітіўшы адзін аднаго за геніталіі, яны сталі раўсьці дурнымі галасамі вядомую швэдзкую народную песьню *"Money, money "*. Гэткім чынам выяўляўся пратэст супраць ініцыяванага палітыкай Швэдзкай Акадэміі павышэньня хабараў за Нобэлеўскія прэміі.

Публіку, аднак, цяжка было чымсьці такім зьдзівіць, некаторых з прысутных проста ванітавала, бо Вішнёў пасьля пачаў чытаць свае ўласныя *diksa* (вершы), пратэстуючы супраць недакладнага перакладу на швэдзкую мову свайго "Фтыруса". Некаторыя з журналістаў і гісторыкаў мастацтва ўзгадвалі на нейкі падобны эпізод у дзеях беларускай літаратуры ў 1913 годзе, але тады пратэст клясыкаў беларускай літаратуры быў цалкам аб~ грунтаваны, а ў гэты момант ужо не было абсалютна ніякае патрэбы паўтарэньня даўно мінулага, чытаньня розных левых тэкстаў і беспадстаўнага стрыптызэрства з мэтай выяўленьня быццам паражнечасьці й "крызыснага стану" сучаснай беларускай культуры.

А потым у часопісе *"New Ass News"* зьявіўся артыкул, дзе пісалася, што А. Туровіч і Вішнёў — гэта *zlops* (слупы) *vitrysska avangarda* (беларускага авангарду).

А Зьміцер Вішнёў чапляўся да гасцей з дурным пытаньнем, ці чытаў хто Лётрэамона. Ён увогуле дастаў усіх прысутных, падыходзіў да кожнага століка, адстаўлена гледзячы ўбок, і распачыпаў свае нарацыі гэткім чынам : *"Чытаю я неяк Лётрэамона... Дарэчы, бы не чыталі Астрэамона?"*

Спалоханая публіка перапыняла нюхаць какаін, калоць гераін і ЛСД, распальваць опіумныя люлькі і жахліва азіралася па баках : " *vitrysska avangarda.."* (беларускі авангард...)

Акцыя, як вы памятаеце, шаноўны хер Карлсан, скончылася зьяўленьнем німфаманкі Фрэкен Бок у скураной садысцкай бялізьне вярхом на пыласосе з хітом уласнага сачыненьня:

Palabila Avangardista i leak voditsa dala

Tcherez tridsat tri nedeli Bely Arlcush radila.

Можна сабе ўявіць, хэрр Карлсан, які пэрформанс учыніў слуп тутэйшага авангарду са сваёй сьмерці, калі пры жыцьці ён амаль што жыў у труне, як вы на даху. Верагодней за ўсё, пасьля скону ён будзе як звычайна, хадзіць па вуліцах, чытаць свае эпатажныя вершы ды маляваць ня менш эпатажныя карціны, на якія заўсёды будзе попыт у нашым далека не дасканалым сьвеце.

**№ 4: Нэкралёг для Сусьлікаў**

Сусьлікі спрадвеку насяляюць неабсяжныя абшары нашай радзімы. Косткі Сусьліка Вялікага (Citellus magnus) былі выяўленыя падчас раскопаў верхнепалеалітычнай стаянкі Бердыж у Чачэрскім раёне. Сёньня ж рабы сусьлік (Citellus suslicus) — звычайны тубылец у Верхнім Панямоньні, на Случчыне, Наваградчыне... Вялікае шкоды ад яго няма, бо селіцца ён на непрыдатных і абложных землях, там, дзе ёсьць які паторак ці насып. Сілкуецца травой, дзікімі злакамі, а часам і казюркамі. Каб пад'есці, сусьлік вылазіць падвечар ці на світаньні. Гэта вельмі палахлівы зьвярок. Калі-нікалі можна ўбачыць, як ён сьмешна. стаіць пухнатым слупком, бы вартавы, ля сваёй норкі ды чытае свае эпатажныя вершы. Пабачыўшы вас, першы дазорца сьвішча астатнім, і ўся калонія вокамгненна зьнікае ў густым дзірване, хаваецца ў норкі. Так яны й жывуць да верасьня, гойсаючы па сваім пагорку, назапашваюць тлушчу, каб пасьля спаць да вясны. Нягледзячы на прыплод (ад трох да дзесяці сусьлянятаў) іх колькасьць ня надта павялічваецца, — з-за атруты, якую лье на свае палі чалавек, з-за ласых дранежнікаў (каты, лісы, крыгыкі, каршуны...). Гэты невялікі грызун (да 26 см з хвастом і каля 300 грамаў вагі) мае жоўта-белую ноўсьць на трыбушку і рудую ў шэра-бурыя плямкі на сьпіне, за што й быў празваны стракатым. Але насамрэч губіць сусьлікаў сьверб паказваць кукіш у кішэні альбо седзячы ў сваёй норцы, што значна падрывае іх здароўе, хаця шкоды нікому ў навакольлі ад гэтага таксама няма.

Наяўнасьць іх у Беларусі — парадокс для закрытыкаў, бо сусьлікі — клясычныя прадстаўнікі сьцёбавай фаўны. У нас яны жывуць далека за межамі асноўнага арэалу свайго віду, стварыўшы сваю, аўтаномную, беларускую папуляцыю. Праўда, ёсьць паданьне, што сусьлікі трапілі ў Беларусь па прыхамаці Сяргея Харэўскага, які разьвёў іх на старонках кнігі "Зьвяры — суайчыньнікі", пафарбаваўшы поўсьць у бел-руда-белы колер і прымацаваўшы да хваста падшыўку "Нашай Нівы". Але гэта толькі паданьне. На дзіўныя слуцкія глушэчы

сусьлік 3Bbi4aÜHbi(suslikus vulgaris) патрапляе дзякуючы свайму бацьку (Suslikus magnus). А паколькі ўся каштоўнасьць гэтага гораду складаецца з цукра-рафінаднага заводу й мясакамбінату і, безумоўна, сусьлікаў, то й лётаюць сусьліказабойчыя камбайны па тамтэйшых ву~ ліцах! Так сусьлікі й гінуць...

**№ 5: Нэкралёг для нэкрафілаў**

Што такое Вішнёў, як не апошні па часе й буйнейшы, я к бура ў шклянцы дыстыляванае вады, скандал у беларускай літаратуры? У айчыннай літаратуры настала нудная пара "рэпрэсіўнай (паводле тэрміналёгіі "новых левых") талерантнасьці". Калі ўсё дазволена, пра скандалы можна толькі мроіць. Вішнёў — недасягальны ідэал літаратурнага славалюбства. Фігура амаль што мітычная.

"Хто не захапляецца Вішнёвым? — піша гісторык найноўшае беларускае літаратуры Валяпцін Акудовіч. — Ні ў кога зь беларускіх пісьменьнікаў у цянерашні час няма больш трывалай і заганнай літаратурнай рэпутацыі, чым у яго".

У чым жа ўсё ж такі загадка Вішнёва? Ён, без сумневу, паказальнік крытычнае сытуацыі, калі слава павязаная зь няславай і ганьбай, і пэўная частка беларускіх чытачоў, як піша аўтар дасьледаваньня "Новая літаратурная сытуацыя на Беларусі пасьля 1994 году", адчувае "трывожнае памкненьне хутчэй да нікчэмнасьцяў, чым да герояў".

Літаратурны шлях Зьміцера Вішнёва (1974-2001) стаў яркай парадыгмай небясьпечнага шляху індывідуалістычнае сьвядомасьці ў XX стагодзьдзі, апалітычнага, глухога да ўсяго, што ляжыць па-за сфэрай ягоных жыцьцёвых інтарэсаў, жаданьняў і задавальненьняў. Вішнёў са зьдзіўляльнай яснасьцю, бадай і сам не здагадваючыся пра тое, што робіць, высьветліў сацыяльнае зло знутры, паказаў пачварную мэтамарфозу такой сьвядомасьці ў момант гістарычнага выбару, калі мітусьлівае анархізуючае "я" ў страху перад зьнішчэньнем кідаецца ў бок расавай нянавісьці, мізантропіі, фашыстоўскага мілітарызму. Сваім жыцьцём і сваёй прозай Вішнёў пасягнуў на саюз маралі й эстэтыкі, на прынцып, які выявіўся ў пушкінскай апазыцыі геніяльнасьці й зладзейсгва.

Разам з тым Вішнёў зьдзейсьніў стылістычную рэвалюцыю, якая аказала й працягвае аказваць вялізарнш ўплыў на беларускую літаратуру. Ён пісаў так, што словы вокамгненна, бы які сьпірт, пранікалі ў кроў чытача, гарачылі, разрывалі вантробы, выварочвалі ўсё нутро ў страшэнных ванітаваньнях ад непераадольнай агіды й

абурэньня, шкадаваньня страчанага часу. Безь Вішнёва сучасная беларуская літаратура была б іншай.

*Есьць крытыкі, гатовыя сьцьвярджаць, што Вішнёў наўмысна адстойваў непапулярныя погляды, што выклікаюць справядлівае абурэньне, выключна дзеля таго, каб трапіць у прыніжаныя й пакрыўджаныя і такім чынам адбыцца як пісьменьнік. Сам пісьменьнік не адмаўляе такой інтэрпрэтацыі: "На Дзень пісьменнасьці і друку я быў страшэнна раззлаваны. Адзін мудак-чыноўнік "скунсавай зьнешнасьці" абазваў мяне казлом. Я даў яму ў адказ па галаве хакейнай клюшкой. Паразыт закалаціўся ад болю. Сволач! Але потым мне далі па галаве цаглінай. Прачнуўся я :на сцэне каля мікра.фона. Сусьлікі ўжо выпрасталі вушкі й насьцярожана прыслухоўваліся. Чакалі майго царскага слова. Я павіншаваў усіх са сьвятам і выцягнуў з кішэні пісталет. Хто першы? Але падыхаць ніхто не хацеў. Тады я пачаў адстрэльваць тых, што сядзелі ў першых радах ды імкнуліся быць па жыцьці тоўстымі бурундукамі. Усё роўна вы Сусьлікі! На-а-а! Заглыні кулю, вушасты! Пасьля дзесяціхвіліннага адстрэлу ў залі засталася палова слухачоў, якая калацілася ад страху і ляпала ў экстазе вушамі...".*

У гэтай заяве ёсьць, безумоўна, заднім розумам пераасэнсаванае ды лжыва прадстаўленае мінулае. Але Вішнёў насамрэч апынуўся якраз тым, супраць каго былі скіраваныя ягоныя інвэктывы.

Што гэта яму дало як пісьменьніку?

*"Калі я ляжу ў балеі сярод трубных канатаў і пазіраю на адзінокую лямпачку, я прыгадваю мора. Салёныя цёплыя хвалі кладуцца на мой лоб далонямі маці. Я сьмяюся і падстаўляю нагу пад струменьчык вады з крана. Каменьчыкі адпаліраваныя да сонечных зайчыкаў. Таксама тут я прыгадваю маеты — яны накшталт маіх валасатых ног, якія я выцягваю з вады і стаўлю на паверхню балеі палямі. Мост каля Інстытуту культуры падобны на маю чыгунную балею — гэткі ж масіўны. Ня ведаю чаму, але я ўяўляю, як пад гэтым мастам праходзяць не цягнякі, а ледоколы. Сінімі шнарамі яны перасякаюць рэйкі й зьнікаюць сярод гарадзкіх крыгаў. А я стаю й махаю рукой! Каб вы здохлі, марскія дэбілы!"*

Кожная эпоха мае свой стыль, дакладней, некалькі сваіх стыляў. Яны парахнеюць з часам, новае пакаленьне пісьменьнікаў прыходзіць са сваімі стылямі, высьмейваючы недарэчныя стылістычныя грымасы старых. Вішнёў — злы кракадзіл генюсь беларускага літаратурнага балота, які стварыў адмысловы стыль і вызваліў мову ад зачаткаў

рыторыкі і драбінак думкі. Вішнёў — разарваная фігура, а значыць, брыдкая. Няма патрэбы прыніжаць ягоны літаратурны талент спасылкамі на няўдалыя вершы і адыёзныя пэрформансы. Няма патрэбы прымікаць супярэчнасьці Вішнёва. Для гісторыі літаратуры Вішнёў якраз і цікавы сваёй грымучай мешанінай ваяўнічай нікчэмнасьці й нарцысічнага самалюбаваньня. Для нашых нашчадкаў ідэйны аспэкт нэкрафілічных дасьледаваньняў Зьміцера Вішнёва — гэта, магчыма, найбольш павучальны прыклад таго, што ня трэба рабіць.

*Зьміцер СЕРАБРАКОЎ*

**ВІШНЕЎ І ЯГОНЫЯ СУСЬЛІКІ**

1.

У прынцыпе, пра гэтых сусьлікаў анічога асабліва і ня скажаш. Яны існуюць у абсалютна гермэтычнай, "аўтарскай", знакавай прасторы, дзе зам ест канцэптаў і паняцьцяў фігуруюць адное струпехлыя косткі гэтых самых канцэптаў, а таксама, яшчэ ў большай прапорцыі, іх муляжы[1].

Зьміцер — як гэтага, зрэшты, ад яго і належала чакаць — не паруліўся аб сыстэматызацыі сваіх хімэраў ды стварэньні вакол іх нейкай рацыянальна асягальнай абалонкі. І слушна, відаць, зрабіў. Бо навошта рацыяналізаваць ірацыянальнае?

Таму сусьлікі засталіся непалоханыя.

...І наагул: мае ўласныя хімэры ня дужа ляяльна ставяцца да хімэраў вішнёўскіх, прышлых. Я патрыёт сваіх хімэраў.

2.

Аўтабіяграфічныя творы цяпер пісаць модна, таму вішнёўскі тэкст ёсьць з чым параўноўваць. Пагатоў у беларускай літаратуры, дзе прыклады рознай мэмуарыстыкі даўно перавысілі па сваёй частотнасьці ўсе арыгінальныя сюжэты.

Але ёсьць і тое, "што вылучае Зьміцера сярод "усіх іншых". Калі коратка, гэта акурат ягоныя сусьлікі (чытай — хімэры).

Пры ўсёй прывязьнасьці да самых што ні ёсьць канкрэтных рэаліяў, раман Вішнёва ўсё ж захоўвае сваю мастацкую "сушчнасьць". Т яна, хто б там што ні казаў, абсалютова арыгінальная.

Аўтара "Трапа для сусьлікаў" ужо неаднаразова спрабавалі з кімсьці параўнаць. Але ўсе гэтыя спробы, калі й не нараджалі такіх ужо бадай хрэстаматыйных недарэчнасьцяў, як спалучэньне ў адным сказе прозьвішчаў Вішнёва і Ніка. Кэйва (той, хто ведае, o co chodzi, ужо сьмяецца, а прыўлашчаныя пасьля гэтага лаўры пачынальніка беларускай панк-паэзіі Зьміцеру ўсё ж варта было вярнуць на радзіму — свайму паплечніку Бахарэвічу. Навошта яму чужое, калі свайго хапае?), дык таксама не выглядалі ўдалымі. Вішнёў — гэта Вішнёў, і нічога ўжо з гэтым не паробіш. Як у тым анэкдоце, дзе ў "прадлёнцы" апроч габінэтаў-інкубарыяў з добрымі дзецьмі і кепскімі ёсьць і яшчэ адзін, да якога прымацаваная шыльда з адным словам: "Вовачка".

---

[1] Нехта задужа правільны, мусіць, параіў бы зьвярнуцца да псыхааналітыка, але гэта ўжо, блін, рэдукцыя.

Аб'ектыўна існыя героі "Трапа для сусьлікаў" трапляюць у нашым кантэксьце ва ўсё тую ж аўтарскую прастору Вішнёва. Пры гэтым яны, натуральна, губляюць свае дадзеныя Богам асобасныя ўласьцівасьці, набываючы новыя, функцыянальныя. Па вялікім рахунку, ня будзе памылкай сьцьвярджаць, што дзеяньне тэксту адбываецца ня ў зьнешнім эмпірычным сьвеце, я ў чыёйсьці асобна ўзятай галаве. І я нават ведаю, у чыёй.

Таму Зьміцер пасьпяхова здолеў пазьбегнуць таго, што бадай нязьменна суправаджае аўтабіяграфічныя творы — апісальніцкай бэлетрыстыкі[2]. Добра гэта ці не, я вырашаць не наважуся.

Вішнёў бадай вырачаны на агрэсіўную суб'ектыўнасьць — бо быць іншым у яго кроў з носу не атрымліваецца. Колькі б ён ні спрабаваў.

3.

Ня ведаю чаму, але апошнія пару дзён на языку ажно круціцца адна фраза, вымаўленая ці то нейкім экспрэсіяністам, ці то нейкім ягоным пэрсанажам:

"Пры слове "культура" я хапаюся за рэвальвэр".

Шчыра кажучы, прыблізна падобную рэакцыю ў мяне выклікаюць разнастайныя вішнёўскія выказваньні пра "сувязь часоў", Леніна. ды сучасную культуру, а таксама цытаты з Ластоўскага, сустрэтыя на некалі невымоўна белай паперы, саисаванай аўтарам "сусьлікаў".

Справа ня ў тым, што я маю нешта супраць гэтых даўно "набалелых" ісьцінаў. Проста выглядаюць яны... як піянэрская прысяга. ў грамадзкім нужніку. Вішнёў (пра гэта сьведчыць ну хаця б ужо назва рамана, ня кажучы пра ягоны зьмест) рэвальвэр, безумоўна, выхоплівае — нават не пачуўшы слова "культура", а проста так. Ці каб паказаць пацанам[3], хто тут самы круты на раёне[4].

Але выцягвае (як можа падацца) ня толькі дзеля таго, каб выявіць сваё ўменьне ім карыстацца, а яшчэ й каб агучыць пару-тройку не зусім сьвежых сэнтэнцыяў.

---

[2] Яна, дарэчы, прысутнічае ня толькі ў нашых родных эсэістаў, але таксама і ў як быццам радыкальных бітнікаў ды нейкім бокам прыналежнага да іх Пінчана.

[3] Некаторыя зь іх ужо лысыя, але для сур'ёзных пісьменьнікаў гэта нават гонар. Разам з пэрманэнтна чырвоным выразам твару.

[4] У сэнсе — у беларускамоўнай культурнай сытуацыі.

Зрэшты, парушэньне ўласнавынайдзеных правілаў гульні (маюцца на ўвазе кароткачасовыя выпраўкі аўтара з родненькага шызоіднага сьвету, адлюстраваньню якога, уласна, і прысьвечаны сам тэкст, у прасякнутую ліхтарамі грамадзкае ўвагі "аб'ектыўную" рэчаіснасьць), пры ўсім пры гэтым, прыводзіць да выніку ў пэўнай меры пажаданага. У тым сэнсе, што шызоіднасьці ад гэтага адно дадаецца.

4.

Хаця, канечне, ня сьлед сцьвярджаць, што аўтар зьвярнуўся да будзённых падзеяў адно дзеля таго каб "пераджыць" іх у тэксьце па-мастацку. Ёсьць, відаць, і іншая прычына, трохі больш практычная.

Сымптаматычна, што галоўнымі сваімі настаўнікамі ў пляне гэтага раману Вішнёў неаднаразова называў

Далі, Мілера і Брэнера. Гэта толькі напаверку апошні сусьветнавядомы мастак, прызнаны аўтарытэт у галіневоблаосьці скаталёгіі ды расейскі эпатажнік зь неверагодным! для спэцыфікі ягоных дзеяньняў прэтэнзіямі падающца фігурамі рознага палёту. Нешта іх усё ж аб~ 'ядноўвае (трохі, праўда выпадае з гэтай тройцы постаць Мілера, у якога, зрэшты, Вішнёў, відаць, натхняўся перадусім брутальнай стылістыкай, а не чым-кольвечы іншым).

Шчыра кажучы, я вельмі сумняюся, што можна безь вялікіх намаганьняў раскапаць нейкі біяграфічны матэрыял пра такога мастака, як, скажам, Рэнэ Маргрыт — апроч, вядома, трывіяльных "радзіўся-жаніўся". Пра Далі такога дабра больш чым дастаткова. І вось чаму.

Далі займаўся стварэньнем уласнай міталёгіі сам — давяраючы ў гэтай справе адно свайму "мэнэджэру ў спадніцы", дый тое не на ўсе сто. Ён цудоўна разумеў, што міты пры пэўнай аказіі могуць стацца таварам куды болып ходкім, ніж найлепшыя па якасьці карціны. Апошнія, дарэчы, можна праштурхнуць усьлед за першымі.

Далі ляпіў міталёгію з падручнага матэрыялу — уласных слабасьцяў, якіх у яго было што амапаўцаў на мітынгу. Вішнёў, па сутнасьці, займаецца тым самым. Ягоныя міты вырастаюць з будзённасьці, і гэтым, дарэчы, ён робіць адную вельмі добрую справу. А менавіта — дэманструе, што нашая як быццам бы шэрая беларуская рэчаіснасьць-таксама можа стацца глебай для мітатворчасьці.

5.

На мой погляд, асыміляцыя жывой чалавечышы гісторыяй[5] (якая ўсё сыстэматызуе і не па-добраму інтэрпрэтуе) была б справай вельмі сумнай, каб не адзін нюанс. Самая гэтая гісторыя выглядае ў пэўным ракурсе... не зусім неяк сур'ёзна. А часам нават і трагікамічна.

Сёньня любы вясковы школьнік, які не адвучыўся ад літараў з-за празьмернага ўжываньня няякаснага алькаголю і не забыў іншых словаў апроч мацюкоў, ведае, што Дастаеўскі — гэта такі параноік, які кніжкі нісаў, Ясенін — п'яніца і г. д. Міталёгія, створаная (і, як падаецца мне, не без уласных намаганьняў) вакол прозьвішчаў самых розных людзей — ад Рэмбо і Джойса да Морысана і Вішэса, — не заўсёды працуе ім на карысьць[6].

Тут ёсьць і яшчэ адзін аспэкт. На вялікі жаль, сучаснае грамадзтва ня мае іншых роляў для нетрадыцыйнага мастака, ніж роля блазна (прыкладаў, лепшых за постаці ўсё тых жа Далі і Брэнера, нават і не знайсьці). Роля, канечне, ня дужа каб ганаровая, але затое актуальная — блазны былі запатрабаваныя заўжды.

Таму тут могуць быць розныя варыянты паводзінаў: альбо ізаляваўцца ад усялякага непасрэднага ідэйнага ўплыву з боку грамадзтва, засяродзіўшыся ўласна на сваёй творчай практыцы, якой бы незапатрабаванай яна ні была, альбо "ісьці ў народ", прапіхваючы на "ўсесаюзны рынак" уласныя міталягемы замест чужых. Як пісалася на дзьвярах Асвэнцыму, кожнаму свой шлях.

*Ільля СІН,* пэрсанаж гэтай кнігі

[5] Мне здаецца, што яна зьяўляецца свайго кшталту фантомам, несьвядома спрадукаваным пазбаўленай ласкі Духа Сьвятога чалавечай дзейнасьцю. Несумненна тое, што ўяўленьні пра несьмяротнасьць разнастайных гуманісгаў і інтэлектуалаў (гл. Кундэру) шмат у чым садраныя з адпаведных рэлігійных канцэпцыяў. Чалавеку вельмі цяжка зьнікаць бясьсьледна, а ідэі апошніх анічога іншага яму і не прапануюць. Адсюль і жаданьне "застацца ў памяці нашчадкаў", увайсьці ў гісторыю.

[6] Большымі дурнямі, аднак, выглядаюць ейныя зацятыя і не зьняверанныя спажыўцы, уводзячы звычайныя чалавечыя слабасьці вышэйадзначаных пэрсонаў у ранг артэфакту.

**А СУДЗЬДЗІ ХТО?**
*(Пасьляслоўе да пасьляслоўяў)*

1.

Серабрыстыя і сінія сусьлікі, сабраўшы пасьля здачы тары на пляшку чарнілаў, агучваюць колькі мудрагелістых словаў, прыдбаных у вышэйшых навучальных установах. Гэта як у показцы, у якой даўн хваліўся сваімі трыма асьпірантурамі. Нігілістычнасьць некаторых сусьлікаў апошнім часам яскрава ўпісваецца ў лайно, што сьмярдзіць на прыбіральыііцкай паперы бамжатніка. Што паробіш, вельмі спакушальна утварыць свой літаратурны прытон на месцы грамадзкага клязэту... Але тым ня менш я рады, што два *"разумнікі"* занялі пачэсную ролю ў "статку крытыкаў" — гэта Ільля Сін і Зьміуер Серабракоў. Суцяшае і тое, што побач зь імі, усяго на крок ззаду, узвышаюцца постаці Сярожы Патаранскага, Яўгена Хвалея і Алеся Масарэнкі. Значыць, нашая беларуская літаратура не загіне. Не дадуць. Тут мне прыгадваецца філёзаф Зянон, які па адной з вэрсіяў адкусіў вуха ў тырана, а па-другой — нос, а патрэцяй плюнуў сваім языком. Гэтак і крытык бывае, што зьдзяйсьняе акт творчага вычварэнства, калі пе~ ратвараеуца ў брыдкае сусьляня, назяхае бяззубым ды бязносым паяльнікам й дэманструе сваю прыгажосьць сьмярдзючых пранцаў.

2.

Напісаўшы для Глёбуса пару дзясяткаў кніжак, Сін адчуў сябе крытыкам (дый можа дарэмна? бо, вуха прэч, імідж пэрформэра яму больш да твару). А стварыўшы раман пра Далі, ён адчуў сябе дасьледчыкам (хоуь у тутэйшай прасторы цесна і такім снадарам, як Ю. Барысевіч, С. Мінскевіч), не бывае тэксту, каб гэты вундэркінд (прыгажун, аўтар нобэлеўскай лекцыі, стваральнік унутраных кактусаў) ня ўжыў бы слова пра вялікага гішпанца. Магчыма, Серабракоў зайздросьціць Сіну, бо акрамя фаліянту "Апошні салдат прэзыдэнта" ён амаль ыічога ня выдаў і таму пастаянна марыць патрапіць у адну з апошніх хваляў суполкі бум-бам-літ, якую Юрась Барысевіч ужо пазначыў як бумбамцьвет. "Не хадзіце, дзеці, у Афрыку гуляць", — напісаў Карней Чукоўскі. І меў рацыю, бо тамтэйшых сусьлікаў паелі квадратныя алігатары.

Выдавец і філёзаф Ігар Логвінаў неяк восеньню мне прызнаўся: "Мой сябра ведае самыя грыбныя месцы. Бярэш кошык і — на Камароўку". Не, безумоўна, выпады апанэнтаў у свой бок я прымаю з павагай. Я бяру гэтыя кастаедныя слоўныя спалучэньні за хобат ды

падвязваю да ног нябожчыкаў. Аакладней, да муміяў, якіх панавезьлі ў Беларусь вагонамі. На жаль, гэта не спрыяе нараджэньню мясцовых фараонаў. Усё неяк драбнавата вакол — ні пірамідаў, ні цыклёпаў...

Напісаўшы некалькі абзацаў лаянкавых словаў у бок апанэнтаў, я пачуў за спіной шоргат. Зграі шэрых пацукоў акупавалі выхад з кватэры. Мэталёвыя вочы й зубы былі паўсюль. Лапкі рыпелі ды нацягвалі мае нэрвы да гуку струны, да бляску нэрпы. Я зразумеў, што мой адказ учыніў у літарацкіх колах паніку. "Перад намі суцэльныя акрываўленыя трупы, дзеці, выдзертыя з рук сваіх матак, маладыя жанчыны, якіх душаць напрыкапцы оргіі, кубкі, поўныя крыві й віна, нечуваныя допыты. Кіпяць катлы, зь людзей здымаюць скуру, штэ дыміцца, чуюцца крыкі, лаянка, блюзьнерства, людзі выдзіраюць адзін у аднаго з грудзей сэрца — і ўсё гэта на кожнай старонцы, у кожным радку, паўсюль", — так выказваўся Жуль Жанэн пра творчасьць маркіза дэ Сада. Жорсткасьць не як сродак апраўданьня, а як сродак барацьбы з глупствам. Глупота — гэта тая лысіна, што спачывае на галаве чыноўніка, які толькі што зьеў талерачку манкі, выпіў кубачак кавы, выпаліў цыгарэтку і загадаў сакратарцы: "Я ад'ехаў у камандзіроўку". Прычым ад'ехаў і падпісаў загад "не пушчаць" сьмярдзючых інтэлігентаў у свае чыстыя мармуровыя апартамэнты.

3.

Калі Сін сьцьвярджае, што хоча схапіць пісталет — ня верце. Гэты літаратурны грызун ня мае нават ржавай дзедавай дубальтоўкі, ня кажучы ўжо пра зброю сучаснага вырабу. Ды, як паказвае практыка, за нерэгістраваную зб]юю садзяць у кутузку. Таму ў лепшым выпадку Сін можа схапіцца за сасіску альбо цьвік (што ён і прадэманстраваў у 2002 годзе ў бібліятэцы імя Янкі Купалы на прэзэнтацыі свайго жалезнага шэдэўра). У блаякадным Ленінградзе людзі марылі пра кавалак хлеба, а Серабракоў марыць пра кіеўскую катлету (нрыклад гэтаму ягоныя даволі гучныя артыкулы, што перыядычна зьмяшчае газэта "Навінкі"). Замест таго, каб пісаць вершы, ён піша геніяльныя пасквілі на сучасных літаратараў і прыгадвае смак мінулагодняй тэфтэліны (таму кожнага з графаманаў ён тэрарызуе сваімі пырскамі сьліны наількавыя бутэрброды, маўляў, не набудзеш паесьці — буду пляваццa не горш за серную кіслату). Бо ганарары выплачнаюць дробныя, і ўчынкі суськікаў зьдзіўляюць сваім зьверствам — плавяцца кампутары дый гараць ад літаратурнай непатрэбшчыны старонкі бульварных выданьняў. Але тым ня менш, eгатак турбавала бадай адна праблема:

"Калі існаваў Чалавек, верагодна, існавалі і Мутанты. Усю разгорнутую вакол цыклю палеміку можна зьвесьці да аднаго пытаньня: ці існаваў Чалавек насамрэч? Калі чытач азнаёміцца з паданьнямі і трапіць у тупік, ён апынецца ў цудоўнай кампаніі: вучоиыя й спэцыялісты, усё жыцьцё прысьвяціўшыя дасьледаваньню цыклю, няхай нават у іх больш інфармацыі, знаходзяцца ў гэткім жа тупіку".

*Кліфард Саймак.*
*Амаль як людзі.*

4

Суські любяць поры. Серабракоў і Сін жывуць у тунэлях. Серабракоў у чорных акулярах прыкідваецца найноўшым дыджэем і заікастым шэптам апавядае казкі пра Карлсана. Неўраўнаважаныя суські шпацыруюць вакол мэтра "кіслага крупніку" і прыкідваюцца маленькімі дэмуміфікацыйнымі кардсанамі. Праўду сказаў Сін: "Роля, канечне, ня дужа каб ганаровая, але затое актуальная — блазны былі запатрабаваныя заўжды". Тут мне прыгадваецца сэрыя пэрформансаў Тэатру псыхічнае неўраўнаважанасьці, дзе Сін сьцізорыкам рэзаў пузы мужыкоў, а потым у кулюарах агучваў, што насамрэч гэты вычварэнскі акт з'яўляецца абсалютна стэрыльным абортам. Пад напластаваньнем бінтоў было цяжка даведацца, хто ж пагадзіўся на гэткую дужа адказную ролю — быць разрэзаным мужчынам. Магчыма, спадар Серабракоў?.. Хочауua верыць, што ён. Бо дзеля мастацтва не пашкадуйма "своего живота" — прыблізна гэтак крычалі расейскія жаўнеры за цара-бацьку.

"Дагматызм, дактрынёрства, акасьцяненьне партыі — непазьбежнае пакараньне за гвалтоўнае зашнуроўваньне думкі", — вось тыя ворагі, супраць якіх па-рыцарску апалчаюцца змагары "свабоды крытыкі ў "Раб. Справе" — Мы вельмі радыя пастаноўцы на чаргу гэтага пытаньня і прапанавалі б толькі дапоўніць яго другім пытаньнем:

"А судзьдзі хто?"

Так пісаў Ленін у матэрыяле "Што рабіць?".

І не кажыце мне, што гэта банальна. Хопіць зь мяне бананаў. Прычым я разумею, што ў Сіна й Серабракова амаль няма догмаў, толькі некалькі плаўленых сыркоў. І ня варта на мяне крыўдаваць за маю шчырую падзяку — ня будзем пераходзіць на асобы. Нездарма ж Астап Бэндэр некалі сказаў: "Як я вас усіх люблю".

5

Мне сьмешна, калі некаторыя крытыкі кідаюцца абараняць мёртвае цела літаратуры, не ўсьведамляючы, што ўжо існуе жывое. Юрась Барысевіч выказвае падобную мне думку: "Бунтаваць трэба не супраць учарашніх аўтарытэтаў, а супраць абмежаванасьці чалавечага розуму". У суседняй Расеі шмат недарэчнасьцяў, як і ў нас, але калі закранаць літаратурны аспэкт, можна нешта і пераняць. У прынцыпе, многія гэтак званыя "сучасныя" беларускія пісьменьнікі гэта ўспрымаюць па-свойму. Мяне ўжо ванітуе ад вершаў "пад Ясеніна", "пад Маякоўскага", "пад Пушкіна" і г.д. Асаблівай ваяўнічасьцю вылучаюцца дзяўчыны, што пішуць "пад Ахматаву" і "пад Цвятаеву". Зрэшты Мікалай Гумілёў некалі ўвёў адпаведны тэрмін для гэткіх "геніяў" — "ахматаўка". *Я* зрэдку вышэй названыя "экспэрымэнты са словам" называю — "шханкамі". Прыемна, што ў расейцаў і цяпер не баяцца крытычна падыходзіць да літаратараў, узьведзеных у ранг клясыкаў. Пётр Каліцін крытыкуе Фёдара Дастаеўскага, Аляксандр Зіноўеў — Аляксандра Салжаніцына. А я вось пабачыў кніжную "Залатую сэрыю" і ледзь не папярхнуўся ад сьмеху. ("Маўчы-маўчы! — закрычыць бабулыса-настаўніца. — Мы іх вывучаем у школе!") Калі "беларускім крытыкам" страшна сунуцца да тых, хто выйшаў пад дзяржаўным грыфам "залатая сэрыя", дык што казаць пра Купалу і Коласа? Для савецкага электарату гэтыя ўжо на "пастамэнце вечнасьці". Меў рацыю Юрась Барысевіч, калі казаў, што наўрад ці можна спадзявацца на падтрымку нейкіх эстэтычных пошукаў, пакуль "сучасная беларуская літаратура асацыюеуца з творчасьцю Алеся Адамовіча і Уладзіміра Караткевіча, якія ўжо даўно пішуць на нябёсах для зусім іншай аўдыторыі".

Ужо даўно вядома, што любы тэкст можна інтэрпрэтаваць па-свойму (інакш — пад сябе). Павыдзіраў з кантэксту патрэбныя цытаткі і ляп — гатова! І незаўважна на небастыку мастацтва нараджаецца "прафэсарская постаць" — сапраўдны монстар навукі. Зразумела, што нашыя апанэнты — людзі "адукаваныя" і без падобнай практыкі існаваць ня могуць. Спасылаюцца на Тыматы Бінклі, Барыса Гройса і Зігмунда Фройда. Пераймаючы тактыку апанэнтаў, працытую чарговым разам Юрася Барысевіча: "Бумбамлітаўцаў часам папікаюць, што яны не прыдумалі нічога новага ў параўнаньні зь сюррэалізмам, але гэта відавочна ня так — відавочна для таго, хто знаёмы з гісторыяй таго руху: сюррэалізм грунтаваўся на клясычным псыхааналізе, нас жа казкі Фройда ўжо не захаплялі".

Але ж тактыка ў сусьлікаў такая — хавацца па норках і не заўважаць дажджу. У сваім склепіку ўтульна. і дах не працякае: "Няма

дажджу! Няма! Ілюзія руху! На двары сонца!" Між іншым, расейскі крытык Аляксандар Гальдштэйн верыць, што "цяпер штосьці кажа толькі мастацтва, прыдатнае для турмы і лякарні, каб, калі гэта магчыма, падбадзёрваць тых, каму дрэнна".

Складаецца ўражаньне, што такія пісьменьнікі, як Серабракоў, Кісьліцына, Астраўцоў спрабуюуь цяпер выконваць ролю беларускіх б(Б)орхесаў. Прыгадайма, што спадар Борхес даволі шчыльна ў сваіх творах дасьледаваў сьмерць — яго цікавілі ўсе аспэкты гэтай зьявы. У нечым падобныя намаганьні беларускіх літаратараў, бсзумоўна, вартыя ўхваленьня. Але... але (бяру слухаўку і кажу "алё") прэцэдэнту яўна ня быць. Бо відавочна (не патрэбныя ані біноісль, ані лупа), што камфортнае купэ дасьледчыкаў ужо запатрабаванае іншымі. Бо беларускі філёзаф Валянцін Акудовіч даўно сьцьвярджае: "немагчымасьць інакш пазьбегнуць сьмерці, як толькі памерці". Дарэчы, як гэта і ня дзіўна, у купэ дасьледчыкаў запоўз і спадар Ільля Сін. Нічога не паробіш — нелегал. Парушэньне традыцыйных межаў робіць творчае жыцьцё больп разнастайным, каляровым, цьвярозым, таму застаецца прыгадаць, што з бадуна лепш лячыцца півам альбо кефірам...

*Зьміцер ВІШНЁЎ*

© OCR: Камунікат.org, 2011 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год

**ЗЬМЕСТ**

*Серж МІНСКЕВІЧ* ЛЕСЬВІЦА Ў НІКУДЫ

ТРАП ДЛЯ СУСЬЛІКА, АЛЬБО НЭКРАФІЛІЧНАЕ ДАСЬЛЕДАВАНЬНЕ АДНАГО ВІДУ ГРЫЗУНОЎ

*Зьміцер СЕРАБРАКОЎ*
Эпілёг у 5 нэкралёгах

*Ільля СІН*
ВІШНЁЎ І ягоныя сусьлікі

*Зьміцер ВІШНЁЎ*
А судзьдзі ХТО?
(Пасьяслоўе да пасьяслоўяў)

У "Навінках"
зазвычай табарыліся
самыя адыёзныя постаці —
гэтак званыя
песьняры анархізму.
Штодня яны палілі гашыш
і катавалі сусьлікаў
з асалодай садыстаў.
На газэтных старонках
дыміліся серабрыстыя вантробы.
Была-была друкарская вясна!’